II. 610. 664

# СЬВЯШЧЭННАЯ ГІСТОРЫЯ НОВАГА ЗАВЕТУ



З 24 малюнкамі ў тэксьце.

## Падручнік для беларускіх школаў і самаадукацыі.

УЛАЖЫЎ СЯРГЕЙ ПАЎЛОВІЧ,
кандыдат багаслоўя.

Прагледжана Віленскай Камісіяй для разгляду беларускіх падручнікаў Закону Божага.

ВАРШАВА. ДРУКАРНЯ СЫНАДАЛЬНАЯ. 1936.

KOMISARJAT RZĄDU
na m. st. WARSZAWĘ
Egzemplarz obowiązkowy
Nakład 3000 egz.
dnia 15/7 1936

# СЬВЯШЧЭННАЯ ГІСТОРЫЯ
# НОВАГА ЗАВЕТУ



З 24 малюнкамі ў тэксьце.

**Падручнік для беларускіх школаў і самаадукацыі.**

---

Улажыў СЯРГЕЙ ПАЎЛОВІЧ, кандыдат багаслоўя.

Прагледжана Віленскай Камісіяй для разгляду беларускіх падручнікаў Закону Божага.

ВАРШАВА.
Друкарня Сынадальная.
1 9 3 6.

II 610.614

З багаслаўленьня ЯГО БЛАЖЭНСТВА,
Блажэньнейшага ДЗІАНІСІЯ, Мітрапаліта
Варшаўскага і ўсяе Польшчы.

BIBLIOTEKA NARODOWA

# Сьвяшчэнная Гісторыя Новага Завету.

## 1. Ражаство Найсьвяцейшае Дзевы Марыі
**(8-21 верасьня).**

У горадзе Назарэце жылі набожныя і знатныя людзі Якім і Ганна. Якім паходзіў з роду цара Давіда, Ганна — з роду першасьвяшчэньніка Аарона. Яны былі багатыя, і ў дабрадзействах і малітвах пражылі да глыбокае старасьці. Адно толькі смуціла іх — яны ня мелі дзяцей. У жыдоў гэта лічылася бясчэсьцем і пакараньнем Божым за грахі (Лук. I, 25). Якім і Ганна горача маліліся Богу аб дараваньні ім дзяцей. „Калі ў мяне народзіцца дачка, дык аддам яе на служэньне Богу“, дала такі зарок Ганна. Бог прыхіліўся да малітваў Якіма і Ганны, і за сьвятое жыцьцё і цярпеньне паслаў ім уцеху — дачку, якую яны назвалі Марыяй.

Шчыра дзякавалі Богу старыя бацькі за такую да іх міласьць.

### Трапар сьвята.

Р҇жтвò твоè, бцⷣе дв҇о, рáдость возвѣстѝ всéй вселéннѣй, и҆з тебè бо возсїѧ̀ сл҇нце прáвды хр҇тóсъ бг҇ъ нáшъ, и҆ разрꙋши́въ клѧ́твꙋ, дадè благословéнїе, и҆ оу҆праздни́въ смéрть, даровà нáмъ живóтъ вѣ́чный.

**Ражаство Тваё, Багародзіца Дзева, прынясло радасьць усяму сьвету, бо з Цябе зазьяла Сонца праўды — Хрыстос Бог наш; скасаваўшы праклянцьце, Ен даў багаславеньне, а зьніштожыўшы сьмерць, падараваў нам жыцьцё вечнае.**

## 2. Уводзіны ў храм і ўзгадаваньне Найсьвяцейшае Дзевы Марыі
**(21 лістапада — 4 сьнежня).**

Калі Дзеве Марыі споўнілася тры гады, Якім і Ганна, памятаючы аб дадзеным зароку, павялі яе ў храм Ерусалімскі, каб пасьвяціць Богу. Сваякі і на-

род праважалі іх, пяючы духоўныя песьні. На сустрэчу ім выйшаў з дзьвярэй храму першасьвяшчэньнік Захарыя. Марыя сама падыйшла да яго па сходах. Першасьвяшчэньнік, па наданьню Духа Сьвятога, павёў Яе не ў сьвяцілішча, куды звычайна ўводзілі



Ражаство Найсьвяцейшае Дзевы Марыі.

дзяўчат, якія пасьвячаліся Богу, а ў самае Сьвятое сьвятых, куды мог уваходзіць адзін толькі першасьвяшчэньнік, і то ня больш як адзін раз у год. Дзева Марыя засталася жыць пры храме, а бацькі вярнуліся да хаты.

## Трапар сьвята.

Дне́сь благоволе́нїѧ бж҃ї́ѧ предѡбраже́нїе и҆ человѣ́кѡвъ спасе́нїѧ проповѣ́данїе, въ хра́мѣ бж҃їи ꙗ҆́снѡ дв҃а ꙗ҆влѧ́етсѧ, и҆ хр҃та̀ всѣ́мъ предвозвѣща́етъ. То́й и҆ мы̀ велегла́снѡ возопі́имъ: ра́дꙋйсѧ, смотре́нїѧ зижди́телева и҆сполне́нїе!



Уводзіны ў храм Найсьвяцейшае Дзевы Марыі.

Сяньня першае выяўленьне міласьці Божай і прадказаньне збаўленьня людзей, бо ў храме Божым адкрыта зьяўляецца Дзева і ўсім прадвяшчае Хрыста. Таму і мы Ёй усклікнем голасна: радуйся, спаўненьне Божага аб нас прамышленьня!

Калі Дзева Марыя падрасла, яна разам з іншымі дзяўчынамі пачала вучыцца граматы і рукадзельля. Малітва і чытаньне сьв. Пісаньня былі самымі любымі Яе заняткамі. Пры храме Дзева Марыя жыла да 14 гадоў. Пасьля таго Ёй, па закону, трэба было або вярнуцца да бацькоў, або выйсьці замуж, Але бацькі былі ўжо памёршы, а замуж яна дала абяцаньне Богу не выходзіць. З гэтае прычыны сьвяшчэньнікі заручылі сірату, як бы нявесту, з яе сваяком, — таксама з царскага роду Давіда, — старым 80-гадовым Іосіфам (Язепам), чалавекам бедным, па рамяству цесьлем, які ўсім ведамы быў з свайго набожнага жыцьця. Ен быў удаўцом і меў дарослых дзяцей. Жыў у Назарэце. Там з ім засталася жыць па заручынах і Дзева Марыя. Яна ўзяла на сябе дагляд ўбогае гаспадаркі Язэпавае. Язэп апекаваўся аб Дзеве Марыі, як аб сваёй роднай дачцы, Марыя-ж у сваю чаргу даглядала яго, як роднага бацьку.

## 3. Зьяўленьне ангела сьвяшчэньніку Захарыі і прадказаньне аб нараджэньні Іоанна Прадцечы.

Лук. I, 5—25.

У той час жыў у зямлі юдэйскай набожны сьвяшчэньнік Захарыя з жонкаю сваёю Елізаветаю, сваячкаю Дзевы Марыі. У іх, як і ў Якіма і Ганны, да старасьці ня было дзяцей. Аднаго разу, калі Захарыя, спаўняючы сваю чаргу ў храме Ерусалімскім, рабіў падчас службы Божай каджэньне ў сьвяцілішчы, а ўся маса народу малілася ў прытворы, зьявіўся Захарыі Ангел Гасподні. Захарыя вельмі спалохаўся (у жыдоў зьяўленьне ангела прадказвала блізкую сьмерць). Ангел сказаў яму: „Ня бойся, Захарыя, бо выслухана малітва Твая перад Богам, і жонка твая Елізавета народзіць табе сына і дасі яму імя—Іоанн. Ён будзе вялікі перад Господам і многіх з сыноў Ізраіля наверне да Яго. Іоанн будзе тым чалавекам, з духам і сілаю Ільлі, які прыгатовіць людзей да су-

стречы Збавіцеля“. —„Па чым пазнаю я гэта?“—пытаецца Захарыя, ня хочучы паверыць радаснай вестцы. Ангел адказаў яму: „Я — Гаўрыіл, што стаю перад Богам, і пасланы гаварыць з табой і абвясьціць табе гэтае. І за тое, што ты не паверыў словам маім, ты будзеш нямым да таго дня, калі гэтае прадказаньне споўніцца“.

Калі Захарыя пасьля таго выйшаў да народу, які чакаў яго, ён ня мог ужо сказаць аніводнага слова, і толькі знакамі паказваў, што было яму зьяўленьне ангела.

## 4. Дабравешчаньне Божай Маці. Адведзіны Праведнае Елізаветы

(25 сакавіка—7 красавіка).

Лук. I, 26—56.

Аднойчы — кажа паданьне — Дзева Марыя, чытаючы кнігу прарока Ісайі, застанавілася над прароцтвам аб нараджэньні Збавіцеля ад дзяўчыны. Марыя падумала: „Як-жа шчасьліва будзе тая дзяўчына, якой выпадзе быць маткаю Госпада! Я хацела-б быць у яе хаця-б апошняю служанкаю“. Пры гэтых словах зьявіўся Ёй архангел Гаўрыіл і сказаў: „Радуйся, дабрадатная, Гасподзь з Табою! Багаслаўлёна Ты паміж жанчын.“ Марыя, убачыўшы Ангела, спалохалася ад слоў яго і пачала разважаць, што-б значыла прывітаньне такое. Архангел між гэтым казаў далей: „Ня бойся, Марыя, бо Ты знайшла ласку ў Бога; Ты народзіш Сына і дасі Яму імя: Ісус. Ён будзе Вялікі і Сынам Найвышэйшага будзе звацца“. Марыя зразумела, што Архангел кажа Ёй аб нараджэньні даўно чаканага яўрэямі Мэсіі, Збавіцеля людзей. — „Як-жа гэта будзе, калі я ня знаю мужа?“ спыталася яна. Тады Архангел выясьніў Ёй, што дадзенае Ёю абяцаньне дзявоцтва ня будзе нарушана і што Яна народзіць бяз мужа, надпрыродна: „Дух Сьвяты — кажа Архангел — найдзе на Цябе, і сіла Найвышэйшага ахіне Цябе: вось чаму і тое, што народзіцца ад Цябе Сьвятое, Сынам Божым назавецца. Вось — кажа — і Елізавета, сваячка Твая, і яна за-

чала сына ў старасьці сваёй, і гэта ўжо шосты месяц у яе, хоць і завецца яна няплоднаю. Бо-ж у Бога ніводнае слова ня будзе немагчымым“. Дзева Марыя з пакораю прыняла волю Божую і сказала: „Я — слуга Госпада, хай станецца Мне паводле слова твайго“.

Калі Архангел адыйшоў, Марыя зараз-жа пайшла



Дабравешчаньне Божай Маці.

да Елізаветы — падзяліцца з ёю сваёю радасьцю.

На прывітаньне Марыі, Елізавета, надыхнёная Духам Сьвятым, прачулым голасам сказала: „Багаслаўлёна Ты паміж жанчын, і багаслаўлёны плод лона Твайго! Скуль мне такое шчасьце, што прыйшла

Мацi Господа майго да мяне?“ Дзева Марыя была вельмi зьдзiўлена, што тайна Яе ўжо адкрыта Елiзавеце, i, узварушаная, праславiла Бога чудоўнаю натхнёнаю песьняй: ,,Вялiчае душа мая Господа i ўзрадаваўся дух мой у Богу, Збавiцелю Маiм, што глянуў Ён на пакорнасьць рабы Сваей, бо адгэтуль шчасьлiваю называцiмуць Мяне ўсе народы“.

Прабыўшы ў сваячкi каля трох месяцаў, Дзева Марыя — ,,Мацi Божая“ — (так першая назвала Яе Елiзавета) вярнулася да Сваей хаты.

## Трапар Дабравешчаньню.

Дне́сь спасе́нїѧ на́шегѡ главизна, и҆ е҆́же ѿ ве́ка та́инства ꙗ҆вле́нїе, сн҃ъ бж҃їй, сн҃ъ дв҃ы быва́етъ, и҆ гаврїи́лъ благода́ть благовѣству́етъ. тѣ́мже и҆ мы̀ съ ни́мъ бцⷣѣ вопїи́мъ: ра́дꙋйсѧ, благода́тнаѧ, гдⷭ҇ь съ тобо́ю.

**Сяньня пачатак нашага спасеньня i выяўленьне тайны, прызначанае ад вечнасьцi: Сын Божы становiцца Сынам Дзевы i Гаўрыiл прыносiць добрую вестку аб мiласьцi Божай. Таму i мы з iм выклiкнем да Багародзiцы: радуйся, Дабрадатная, Гасподзь з Табою!**

## 5. Ражаство Iоанна Прадцечы.

Лук. I, 57—80.

Прадказаньне Ангела сьвяшчэньнiку Захарыi споўнiлася: у жонкi яго Елiзаветы нарадзiўся сын. Даведаўшыся аб гэтым, сваякi i суседзi прыйшлi прывiтаць бацькоў з вялiкай мiласьцю, якую паслаў iм Бог. У восьмы дзень iзноў сабралiся ўсе, каб абрэзаць дзiцятка i даць яму iмя. Спачатку хацелi назваць яго iмем бацькi яго — Захарыяй, але мацi не згадзiлася: ,,Я хачу — кажа — каб назвалi яго Iоаннам“. Тады пайшлi да Захарыi i на мiгi спыталiся, як ён хацеў-бы назваць свайго сына. Нямы Захарыя папрасiў дошчачку i на ёй напiсаў: ,,Iоанн iмя яму“. Адразу пасьля таго расшчамiлiся вусны яго i язык яго,

і ён, на вялікае зьдзіўленьне, пачаў гаварыць, багаслаўляючы Бога. Зварочваючыся да нованароджанага сына, Захарыя, надыхнёны Духам Сьвятым, сказаў: «Ты, дзіцятка, будзеш названы прарокам Ўсявышняго, бо пройдзеш наперад прад абліччам Госпада, каб прыгатовіць дарогу Яму». Вестка аб усіх гэтых чудоўных здарэньнях разыйшлася далёка па зямлі юдейскай. Усе дзівіліся, праслаўлялі і дзякавалі Богу і пыталіся адзін у аднаго: «што-ж гэта будзе за дзіця?»

Аб далейшым жыцьці Іоанна ў Евангельлі гаворыцца толькі, што ён, «узрастаў і ўзмацоўваўся духам» і што «рука Госпадава была з ім». Паданьне-ж дабаўляе, што Іоанн рана страціў сваіх бацькоў. Вырасшы, ён пайшоў у пустыню, дзе заставаўся «да дня зьяўленьня свайго Ізраілю».

**Ражаство Іоанна Прадцечы Праваслаўная Царква сьвяткуе 24 чэрвеня — 7 ліпня.**

## 6. Ражаство Ісуса Хрыста. Пакланеньне Яму пастухоў

**(25 сьнежня — 7 студня).**

Мат. I, 18—25; Лук. II, 1—21.

Тры месяцы пражыла Дзева Марыя ў праведнай Елізаветы. Вярнуўшыся ў Назарэт, Яна нічога не сказала Юсіфу аб зьяўленьні Ей Ангела Гасподняга і аб яго прадказаньні. Вось чаму, калі Іосіф праз нейкі час заўважыў, што заручаная з ім Марыя хутка стане маткаю, ён надумаў тайна адпусьціць Яе, даўшы Ей разводнае пісьмо. Але зьявіўся яму ўва сьне Ангел Гасподні, які сказаў: «ня бойся прыняць Марыю, жонку тваю, бо зарадзіўшаеся ў ёй ёсьць ад Духа Сьвятога, — вось-жа народзіць Сына, Якога Ты назавеш Ісусам, г. зн. Збавіцелем, бо Ён збавіць людзей ад грахоў». Іосіф, устаўшы ад сну, зрабіў, як загадаў яму Ангел, г. зн. прыняў Марыю, з якою наагул жыў, як бацька з дачкою, ці як брат з сястрою.

У тыя дні выйшаў загад уладаў зрабіць усенародны перапіс. Кожын юдей павінен быў запісацца ў

тым горадзе, скуль паходзілі яго дзяды. Язэп і Марыя, якія паходзілі з роду Давідавага, пайшлі ў горад Давідаў — Віфлеем, блізкі да Ерусаліму. У самым горадзе яны не маглі знайсьці сабе прыпынішча, бо было шмат народу, — таму, як людзі бедныя,



Ражаство Ісуса Хрыста.

прыпыніліся за горадам, у пячоры, куды пастухі заганялі на нач і ў непагоду свае стады. І вось тут, апоўначы, Найсьвяцейшая Дзева Марыя нарадзіла Сына Свайго Первенца, спавіла Яго і палажыла ў яслі з сенам.

У той час недалёка ад пячоры, у полі, былі пастухі ля стадаў сваіх. Раптам асьвяціла іх нязвычайнае сьвятло і зьявіўся ім Ангел Гасподні. Яны вельмі перепалохаліся. Ангел сказаў ім: «Ня бойцеся! я



Зьяўленьне Ангела пастухам.

абвяшчаю вам вялікую радасьць: нарадзіўся ў гэтую ноч у месьце Давідавым Збавіцель, Каторы ёсьць Хрыстос Господзь. І вось вам знак: вы знойдзеце Дзіця ў пялёнках, лежачы ў ясьлях». Раптам зьявіла-

ся на небе вялікае мноства Ангелаў, якія праслаўлялі Бога і пяялі: «Слава на вышынах Богу і на зямлі мір сярод людзей добрае волі».

Калі Ангелы адыйшлі ад пастухоў, яны сказалі адзін аднаму: «Пойдзем у Віфлеем і паглядзімо, што абвясьціў нам Гасподзь». І пасьпешна выйшлі, і знайшлі ў пячоры Марыю і Іосіфа, і Дзіцятка, лежачы ў ясьлях. Пастухі пакланіліся Дзіцятку і расказалі Марыі і Іосіфу, што бачылі і чулі ад Ангелаў.

У восьмы дзень па нараджэньні, у часе вымаганага законам абраду абрэзаньня, народжанаму Дзіцятку далі імя Ісус, г. зн. Збавіцель.

### Трапар сьвята.

Рождество̀ Твоѐ, Христѐ Бо́же на́шъ, возсїя̀ мі́рови свѣ́тъ ра́зума: въ не́мъ бо ѕвѣзда́мъ служа́щїи ѕвѣздо́ю оуча́хуся, Тебѣ̀ кла́нятися Со́лнцу пра́вды: и Тебѣ̀ вѣ́дѣти съ высоты̀ восто́ка: Го́споди, сла́ва Тебѣ̀.

**Ражаство Тваё, Хрысьце Божа наш, зазьяла перад усім сьветам, як сьвятло розуму, бо праз яго служачыя зоркам (валхвы) зоркаю-ж навучаны былі пакланяцца Табе, Сонцу праўды, і пазнаць у Табе Усход з вышыні. Госпадзі, слава Табе!**

### 7. Сустрэча Госпада Ісуса Хрыста ў храме Ерусалімскім
(2 — 15 лютага).

Лук. II, 22 39.

У саракавы дзень па нараджэньні Ісуса Іосіф і Марыя прынясьлі Яго ў храм, каб прадставіць перад Госпадам: гэтага вымагаў закон адносна ўсіх дзяцей-первенцаў мужчынскага роду. На сустрэчу Сьвятой Сям'і выйшаў адзін набожны і стары - стары чалавек, на імя Сымон (жыў у Ерусаліме), якому было прадказана Богам, што датуль ня ўгледзіць сьмерці, пакуль ня ўбачыць Хрыста Гасподняга. Гэты доўга

BIBLIOTEKA NARODOWA

чаканы ім момант настаў. Па надыхненьню ад Бога, Сымон, убачыўшы прынесенае Дзіця, адчуў у сваёй душы, што гэта і ёсьць абяцаны Мэсія. Сымон узяў Ісуса на свае старэчыя рукі і ўславіў Бога такімі словамі:




Сустрэча Госпада Ісуса Хрыста.

Ны́нѣ ѿпуща́еши раба̀ Твоего̀, Вл҃ко, по глаго́лу Твоему съ ми́ромъ: ꙗ҆́кѡ ви́дѣста ѻ҆́чи моѝ спасе́ніе Твоѐ, е҆́же е҆сѝ ѹ҆гото́валъ пред лице́мъ всѣ́хъ людей, свѣ́тъ во ѿкрове́ніе ꙗ҆зы́кѡвъ, и҆ сла́ву людей Твои́хъ І҆зр҃ила.

**Ты, Уладыка, па слову Твайму, адпускаеш ужо з мірам (з гэтага сьвету) слугу Твайго, бо вочы мае ўбачылі Збавіцеля, Якога Ты паслаў перад абліччам усіх людзей — сьвятло для асьветы паганцаў і ўслаўленьне народу Твайго Ізраіля.**

Іосіф і Марыя вельмі дзівіліся сказанаму аб Ім, і багаславілі Бога. Зварочваючы Дзіцятка Найсьвяцейшай Маці, Сымон сказаў Ей, што Хрыстос будзе «на ўпадак і паўстаньне многіх у Ізраілю», г. ё. нясучы мір і любоў, выкліча сярод людзей і вялікую варожасьць і спрэчкі; адныя павераць у Яго і будуць збаўлены, іншыя-ж ня прызнаюць Яго і згінуць, — і што гэныя спрэчкі і варожасьць будуць асабліва цяжкімі і балючымі для Яе матчынага сэрца: «Табе Самой — кажа Сымон — меч пранікне ў душу, каб выявіліся памышленьні многіх сэрцаў» (Сымон прадбачыць хрэсныя мукі І. Хрыста, падчас якіх найцяжэйшыя мукі выпадуць і на долю Божае Маці).

Чула гэтыя прарочыя словы і старая набожная ўдава Ганна (84 гадоў), якая жыла пры храме, «пастом і малітваю служачы Богу дзень і ноч». Яна падыйшла да Дзевы Марыі і ўслаўляла Бога, а пасьля расказвала ўсім у Ерусаліме, хто чакаў абяцанага Мэсіі, што «паслаў ужо Гасподзь збаўленьне людзям Сваім».

Споўніўшы ўсё па закону, Іосіф і Марыя вярнуліся ў Назарэт.

## Трапар сьвята.

Ра́дꙋйсѧ, Бл҃года́тнаѧ Бц҃е Дв҃о, и҆з Тебѐ бо возсїѧ̀ Со́лнце пра́вды, Хрⷭ҇то́съ Бг҃ъ на́шъ, просвѣща́ѧй сꙋ́щыѧ во тьмѣ̀: весели́сѧ и҆ ты̀, ста́рче пра́ведный, прїе́мый во ѡ҆бꙗ̑тїѧ Свободи́телѧ дꙋ́шъ на́шихъ, да́рꙋющаго на́мъ воскресе́нїе.

**Радуйся, Дабрадатная Багародзіца Дзева, бо з Цябе зазьяла Сонца праўды — Хрыстос Бог наш, Які асьвячае ўсіх, хто ёсьць у цемры Весяліся і ты, старча праведны, прыймаючы ў абняцьці Збавіцеля душ нашых, што падае нам уваскрасеньне.**

## 8. Пакланеньне І. Хрысту ўсходніх мудрацоў. Іосіф і Марыя з Іісусам уцякаюць у Эгіпэт. Паварот іх з Эгіпту.

Мат. II, 1—23.

Апрача пастухоў Віфлеемскіх, на пакланеньне народжанаму Збавіцелю прыходзілі з далёкага ўсходу валхвы або мудрацы, якія вывучалі рух сьвяцілаў нябесных. Аднаго разу яны ўбачылі на небе нейкую нязвычайную зорку[1]). Ці не нарадзіўся Вялікі Цар Юдейскі? — падумалі яны. Ім ведама было, што юдэі, якіх шмат расьсеялася на ўсходзе пасьля разбурэньня Ізраільскага і юдэйскага царства, чакаюць Вялікага Мэсіі. Кіруючыся зоркаю, мудрацы прыйшлі ў Ерусалім і пачалі распытваць, дзе нарадзіўся Цар Юдэйскі. «Мы — кажуць — бачылі Яго зорку на ўсходзе і прыйшлі пакланіцца Яму». Пачуўшы гэта, Цар Ірад вельмі занепакоіўся: ён баяўся, каб нованароджаны Цар ня скінуў яго з пасаду. Паклікаўшы першасьвяшчэньнікаў і кніжнікаў, Ірад спытаўся ў іх, дзе, згодна з пісаньнем, павінен быў нарадзіцца Хрыстос? Яны адказалі, што ў Віфлееме, як было прадказана Прарокам Міхеем. Тады Ірад тайна паклікаў да сябе мудрацоў і, даведаўшыся ад іх аб часе зьяўленьня зоркі, даручыў ім пайсьці ў Віфлеем, распытацца аб народжаным Дзіцятку і «калі Яго — кажа — знойдзеце, скажыце і мне, каб я таксама мог пайсьці пакланіцца Яму» (у думцы Ірада было загубіць Дзіця). Мудрацы пайшлі з Ерусаліму; пайшла перад імі і нязвычайная зорка, якая затрымалася над хатаю, дзе быў Хрыстос. Яны ўвайшлі ў хату, пакланіліся Дзіцятку да зямлі і падалі свае дары: золата, ладан і сьмірну: золата, як Цару (золатам плацілі падаткі царом), ладан, як Богу (ладан курылі ў храме падчас багаслужэньня) і сьмірну, як сьмяротнаму Чалавеку (сьмірна — пахнючая смала з аднаго арабскага дзерава; сьмірнаю намазвалі целы памёршых, каб ня так

---

[1]) На ўсходзе была вера, што кожнаму чалавеку на зямлі адпавядае ў небе свая зорка, адсюль зьяўленьне надзвычайнае зоркі прадказвала і нараджэньне Надзвычайнага Чалавека.

хутка раскладаліся). Дамоў мудрацы хацелі вярнуцца праз Ерусалім, памятаючы загад Ірада, але ва сьне зьявіўся ім Ангел Гасподні, які сказаў, каб ішлі ў сваю краіну іншаю дарогаю. Між гэтым жорсткі Ірад, не дачакаўшыся мудрацоў і баючыся, каб нованароджаны Цар з працягам часу не адабраў ад яго цар-



Пакланеньне валхоў (магаў).

ства, выдаў загад забіць у Віфлееме і яго аколіцах усіх хлопчыкаў да двох гадоў: Ірад лічыў, што між іншымі будзе забіты і Хрыстос. Ваякі споўнілі загад Ірада і, як кажа паданьне, перабілі до 14.000 дзяцей мужчынскага роду.

Вялікае гора і плач агарнуў жыхароў тых ме-

сцаў. Аднак Хрыста паміж забітымі ня было. Ангел Гасподні зьявіўся на сьне Іосіфу і загадаў яму ўцячы а Марыя і Дзіцяткам у Эгіпэт. Там Сявятая Ся'мя прабыла да самае сьмерці Ірада, пасьля чаго, па за-



Уцячка Св. Сям'і у Эгіпет.

гаду Ангела, вярнулася ў Назарэт, дзе і засталася жыць. Тут І. Хрыстос узрастаў і ўзмацоўваўся Духам, напаўняючыся прамудрасьці, і міласьць Божая была на Ім.

## 9. Дванаццацьгадовы Ісус у храме.

Лук. II, 41—52.

Набожныя Іосіф і Марыя кожын год хадзілі ў Ерусалім на сьвята Пасхі; там у гэтыя дні заўсёды зьбіралася шмат людзей. Калі Ісусу было дванаццаць



Дванаццацьгадовы Ісус у храме.

гадоў, Іосіф і Марыя таксама пайшлі ў Ерусалім на сьвята, і ўзялі з сабой Ісуса. Па сканчэньні дзён сьвята, яны пайшлі дамоў, але Ісус, не папярэдзіўшы бацькоў, застаўся адзін у Ерусаліме. Іосіф і Марыя спачатку думалі, што Ён ідзе з сваякамі або знаёмы-

мі, і таму мала непакоіліся. Але калі Яго ня было доўга — прайшоў ужо дзень дарогі — тады пачалі трывожыцца і рашылі вярнуцца ў Ерусалім. Тры дні шукалі яны Яго па горадзе, і вось знайшлі ў храме. Ісус сядзеў сярод вучыцялёў, слухаў іх і Сам пытаўся ў іх. Усе слухаўшыя дзівіліся з розуму Яго і з адказаў — такую нязвычайную выяўляў Ён мудрасьць.

«Дзіцятка! што Ты зрабіў з намі? Вось бацька Твой і Я з вялікаю тугою шукалі Цябе», сказала Марыя.

Ён адказаў на гэта: «Нашто Вам было шукаць Мяне? Ці-ж вы ня ведалі, што Мне трэба быць у тым, што належыць Айцу Майму?» Бацькі не зразумелі гэтых слоў, хаця Марыя і захавала іх ў сэрцы Сваім.

Узяўшы Ісуса, Іосіф і Марыя пайшлі ў свой родны Назарэт. Тут Ісус рос розумам ды ў ласцы ў Бога і людзей. І быў паслухмяны Маці Сваей і бацьку Свайму.

## 10. Іоанн Прадцеча і ягоная пропаведзь.

Мат. III, 1—12; Мр. I, 1—8; Лук. III, 1—18; Іоан. I, 6—8.

Жывучы адзін у пустыні, Іоанн праводзіў свой час у малітве і посьце. Ён насіў жорсткую вопратку з вярблюдовага валосься, падперазаўшыся скураным паясом, і еў толькі дзікі мёд ды акрыды (род саранчы,— казулькі, якія і цяпер ядуць бедныя арабы ў Палестыне). Калі Іоанну было 30 гадоў, ён, па загад, Божаму, выйшоў з пустыні і пачаў навучаць людзей як трэба жыць, каб годна спаткаць Хрыста Збавіцеля, і заклікаў, каб пакаяліся ў сваіх грахох. «Пакайцеся, — казаў Іоанн, — бо надыходзіць царства Божае». Шмат людзей з усяе Юдеі і Ерусаліму прыходзіла паслухаць Іоанна. Усе спавядалі перад ім грахі свае. Тых, якія каяліся, ён хрысьціў у рацэ Іардане, чаму і празвалі яго Хрысьціцелем.

Бачачы, што за Іоаннам ідзе шмат народу, пайшлі паглядзець і паслухаць новага Прарока і начальнікі юдэйскія. Іоанн сустрэў іх грозным абвінаваль-

ным словам: «Паражджэньні эхідны (ядавітае зьмяі)! Вы не ўцячэце ад будучага гневу, — казаў ім Іоанн.— Зрабеце годныя пакаяньня плады: у каго дзьве адзежыны, дай таму, хто ня мае; у каго ёсьць ежа, рабі тое-ж; нікога ня крыўдзьце, не абмаўляйце, не бярэце больш, чым належыць, і здавальняйцеся сваёю платаю. Сьпяшайцеся пакаяцца, пакуль ня позна, бо ўжо і сякера ля караня дрэваў ляжыць, а ўсякае дрэва, што плоду добрага ня прыносіць, зрубаецца і кідаецца ў вагонь.“ Чуючы гэткія словы, кожын у сэрцы сваім падумаў аб Іоанне, ці ня Хрыстос толькі ён? Тады Іоанн адказаў: «Я хрышчу вас вадою, але наперадзе мяне йдзе Дужэйшы за мяне, у Каторага я ня варты нагнуўшыся разьвязаць нават рамень абуцьця Яго: Ён будзе хрысьціць вас Духам Сьвятым і агнём» [1]). Гэтымі словамі Іоанн паказваў на ідучага за ім Хрыста. І яшчэ шмат чаго гаварыў Іоанн народу, навучаючы яго.

Некаторыя з тых, што прыходзілі да Іоанна, засталіся яго вучнямі.

## 11. Вадохрышча

(6—19 студзеня).

Мат. III, 13—17; Мрк. I, 9—11; Лук. III, 21—23; Іоан. I, 29—34.

Разам з іншымі юдэямі прыйшоў хрысьціцца да Іоанна і Ісус Хрыстос, Якому тады споўнілася 30 гадоў. Ён быў маладзейшы за Іоанна на шесьць месяцаў. Хаця Іоанн быў сваяком па мацеры Ісусу, аднак ня знаў Яго. Іоанн адразу пазнаў у Ім Мэсію, таму і сказаў, калі ўбачыў Яго: „Вось Ягня Божае, што бярэ на Сябе грахі ўсяго сьвету. Гэта Той, аб Якім я сказаў: ідзе за мною Муж, Які стаў наперадзе мяне, бо раней за мяне быў; я ня знаў Яго, але каб Ён зьявіўся Ізраілю, прыйшоў я, хрысьцячы вадой». Калі

---

[1]) Хрышчэньне Іоанна не давала ачышчэньня ад грахоў, у хрышчэньні-жа Хрыстовым даецца міласьць Духа Сьвятога, якая ачышчае ад грахоў.

Ісус сказаў, што хоча хрысьціцца ў яго, Іоанн выклікнуў: «Мне трэба хрысьціцца ад Цябе і ці Ты прыходзіш да мяне»? Ісус адказаў: «Пакінь гэта цяпер, бо так належыць нам споўніць усялякую праўду».



Хрычэньне І. Хрыста ў Іардане.

Іоанн больш не спрачаўся. Тады Ісус увайшоў у ваду, і Іоанн хрысьціў Яго. Калі Ісус выходзіў з вады і маліўся, раптам раскрылася над Ім неба, і Іоанн убачыў Духа Божага, Які зыходзіў на Хрыста ў відзе галуба; у той-жа час быў голас з неба, гаворачы: «Ты Сын Мой Найлюбшы, і Цябе ўпадабаў Я».

### Трапар сьвята.

Во Ї҆орда́нѣ креща́ющꙋсѧ Тебѣ̀ Гдⷭ҇и, тро́ическое ꙗ҆ви́сѧ поклоне́нїе: роди́телевъ бо гла́съ свидѣ́тельствоваше Тебѣ̀, возлю́бленнаго Тѧ̀ Сы́на и҆менꙋ́ѧ: и҆ Дꙋ́хъ, въ ви́дѣ голꙋби́нѣ, и҆звѣ́ствоваше словесѐ ᲂу҆твержде́нїе: ꙗ҆вле́йсѧ Хрⷭ҇тѐ Бж҃е, и҆ мі́ръ просвѣще́й, сла́ва Тебѣ̀.

**Калі Ты, Госпадзі, хрысьціўся ў Іардане, выявілася сьведчаньне Тройцы, бо голас Айца сьведчыў аб Табе, называючы Цябе Найлюбшым Сынам, а Дух, у відзе галуба, сьцвярдзіў праўдзівасьць гэтага слова. Слава Табе, Хрысьце Божа, Які зьявіўся і асьвяціў сьвет.**

### 12. Спакушэньне Ісуса Хрыста д'яблам у пустыні.

Мат. IV, 1—11; Мрк. I, 12—13; Лук. IV, 1—13.

Пасьля вадохрышча Ісус Хрыстос паведзены быў Духам у пустыню. 40 дзён і ночаў прабыў Хрыстос там «з зьвярамі»,— падрыхтоўваючыся малітвамі і пастом да Свайго вялікага служэньня. Д'ябал спакушаў Яго, але Ангелы Божыя служылі Яму там. Калі Ісус Хрыстос пад канец посту пачуў голад, д'ябал кажа Яму: «Калі Ты Сын Божы, дык скажы каменю гэтаму зрабіцца хлебам». Д'ябал падбіваў Ісуса Хрыста зрабіць Сваёю Божаю сілаю чуда, каб заспакоіць голад. Ісус Хрыстос адказаў: «Ня хлебам адным будзе жыць чалавек, але ўсякім словам, якое выходзіць з вуснаў Божых».

Пасьля першага спакушэньня Ісус Хрыстос пайшоў у Ерусалім. Тут д'ябал, паказаўшы Яму з даху храму Ерусалімскага натоўп народу, які так прагавіта чакаў зьяўленьня Мэсіі, запрапанаваў кінуцца ўніз і зьявіцца як-бы з неба, як Бог. «Ангелы Божыя — кажа—на руках панясуць Цябе, каб нават нага Твая не зачапілася аб камень". Ісус Хрыстос адбівае і гэтае спакушэньне і кажа: «Не спакушай Госпада Бога Твайго».

У трэці раз д'ябал паставіў Ісуса Хрыста на высокай гары, у адзін момант паказаў Яму ўсе царствы зямныя і сказаў: «Калі Ты паклонішся мне, дык гэта ўсё будзе Тваё». Ісус Хрыстос адказаў: «Адыйдзі ад

Мяне, злы дух, бо напісана: Госпаду Богу пакланяйся і Яму Аднаму служы».

Злы дух адыйшоў, і тады абкружылі Госпада Ангелы і служылі Яму. Хутка Ісус вярнуўся «ў сіле Духа» ў Галілею, і разыйшлася чутка пра Яго па ўсёй ваколічнай старане.

## 13. Сьведчаньне Іоанна Хрысьціцеля аб Ісусе Хрысьце. Першыя вучні Яго.

Мат. IV, 18—25; Іоан. I, 29—51.

Хутка пасьля Свайго хрышчэньня Ісус Хрыстос пайшоў на Іардан да Іоанна. Іоанн, убачыўшы Ісуса,



Сьведчаньне Іоанна Хрысьціцеля аб Ісусе Хрысьце.

паказаў на Яго народу і сказаў: «Вось Ягня Божае, што бярэ на Сябе грахі ўсяго сьвету. Я бачыў Духа, зыходзячага з неба, як голуб, і стаў Ён над Ім. Я ня знаў Яго, але Той, што паслаў Мяне хрысьціць вадой, сказаў мне: на каго ўгледзіш зыходзячага Духа, гэты і ёсьць Той, што Духам Сьвятым хрысьціць. І я бачыў і засьведчыў, што гэты ёсьць Сын Божы». Такім чынам, Іоанн адкрыта перад усім народам прызнаў, што Ісус ёсьць Мэсія, Сын Божы.

Гэтае сьведчаньне чулі вучні Іоанна. Двое з іх, Андрэй і Іоанн, бедныя рыбакі, уверавалі ў Ісуса і пайшлі за Ім. Гэта былі **першыя** вучні Хрыстовы, — вось чаму Андрэй празваўся «Першазваным» (другі вучань, як думаюць, быў евангелісты Іоанн Багаслоў). Андрэй прывёў свайго брата Сімана, таксама рыбака. Ісус, прадбачачы яго моцную веру, сказаў: «Цябе завуць Сіманам, але адсюль будзеш звацца Пятром». «Пётр» значыць «камень».

На другі дзень Гасподзь з трыма вучнямі пайшоў у Галілею. Па дарозе спаткалі яны Піліпа. Гасподзь сказаў яму: «Хадзі за Мною». Піліп пайшоў і хутка прывёў да Яго Нафанаіла. Гэты таксама ўвераваў у Хрыста і стаў Ягоным вучнем.

З таго часу Ісус Хрыстос пачаў абходзіць з вучнямі Сваімі гарады і вёскі, навучаючы народ і творачы чуды.

## 14. Першае чуда ў Кане Галілейскай.

Іоан. II, 1—11.

На трэці дзень пасьля сустрэчы з Нафанаілам Ісус і вучні былі па запросінах на вясельлі ў Кане Галілейскай, недалёка ад Назарэту. Была там і Маці Яго. Падчас вясельля не хапіла віна. Даведалася аб гэтым Маці Ісусава і кажа Сыну: «Віна ня маюць». Ісус адказаў: «Яшчэ ня прышла гадзіна Мая», гэта знач. не настаў час тварыць чуды. Аднак Маці Ісусава загадала слугам рабіць усё, што Ён скажа. А стаяла ў хаце шэсьць каменных судзін з вадою для абмываньня ног, як таго вымагаў усходні звычай. Вось Ісус і кажа слугам: «Налеце вады ў глякі». Калі яны напоўнілі іх да верху, Ісус сказаў слугам: «Нясеце глякі да загадчыка». Яны панясьлі. У глякох, замест вады, было добрае віно. Толькі слугі ведалі, скуль яно ўзялося. Загадчык-жа ня ведаў, таму і пачаў выгаварваць маладому, нашто ён добрае віно захаваў пад канец вясельля.

Гэта было першае чуда Ісуса Хрыста, і выявіў Ён славу Сваю, і ўверавалі ў Яго вучні Яго.

# Першы год служэньня Ісуса Хрыста.

## 15. Падарожа Ісуса Хрыста ў Ерусалім на сьвята Пасхі. Выгнаньне гандляроў з храму.

Іоан. II, 12—25.

Пасьля чуда ў Кане Галілейскай Ісус Хрыстос з Маткаю, братамі[1]) і вучнямі праз Капэрнаум пайшоў у Ерусалім на сьвята Пасхі. На гэтае сьвята ў Ерусаліме зьбіралася з розных краінаў шмат юдэяў. Каля самага храму, на яго плошчах і дварох, звычайна адбываўся вялікі торг, бо кожын багамолец ці паломнік павінен быў прынясьці ў храме ахвяру Богу—цяля, ягня, галубоў і інш. Сярод купляўшых і прадаваўшых сядзелі за сталамі мянялы, у якіх разьменьваліся чужаземныя грошы для ахвяраў на храм і раздаваньня міласьціны. Падчас торгу каля храму стаяў нязвычайны гоман, крыкі і спрэчкі гандляроў, перамешаныя з мэканьнем авечак і рыканьнем кароў і цялят. Усё гэта абражала сьвятасьць месца. Ісус Хрыстос, прыйшоўшы сюды, зрабіў з вяровак біч і пачаў адганяць ад храму ўсіх людзей, такжа і авец і валоў, а грошы мянялаў рассыпаў і сталы іх перавярнуў. Прадаўцом-жа галубоў сказаў: «Забярэце гэнае адгэтуль: не рабеце дому Айца Майго домам торгу». Ніхто з натоўпу ці гандляроў не супраціўўся Ісусу Хрысту. Толькі начальнікі храму спыталіся ў Яго: «Які дасі нам знак, чаму гэтак робіш?» Ісус Хрыстос адказаў ім: «Зруйнуйце дом гэты, і Я ў тры дні адбудую яго». Гэтымі словамі Ісус Хрыстос прадуказваў на будучае Сваё, — па трох днёх сьмерці — слаўнае ўваскрасеньне, як найлепшы доказ Сва-

[1]) Братамі названы тут ня родныя браты, якіх у Ісуса Хрыста ня было, а блізкія сваякі — сыны Марыі Клеопавае: Якаў, Сымон, Іосія і Юда.

ей Божай сілы і ўлады, але яны не зразумелі гэтых слоў і сказалі: «Гэты дом будаваўся сорак шэсьць гадоў, а Ты ў тры дні збудуеш яго». Ісус нічога не адказаў на гэта.

Падчас гэтых сьвятаў Ісус Хрыстос стварыў шмат чудаў, і многія ўверавалі ў імя Яго.

## 16. Гутарка Ісуса Хрыста з Нікодымам.

Іоан. III, 1—21.

Чуды Ісуса Хрыста зацікавілі ўвесь Ерусалім З вуснаў у вусны передавалася імя Ісуса, нязвычайнага Вучыцеля з Галілеі. Узварушыліся і фарысэі — начальнікі і вучыцялі жыдоўскія. Адзін з іх, на імя Нікодым, захацеў бліжэй дазнацца, які гэта новы зьявіўся вучыцель. І вось тайна, уночы, прыходзіць да Ісуса, каб пагутарыць з Ім. „Мы ведаем — кажа Нікодым—што Ты Вучыцель, Які прыйшоў ад Бога, бо ніхто, калі-б ня быў з ім Бог, ня можа тварыць такіх чудаў, якія творыш Ты“. Рабіна Нікодыма перш за ўсё цікавіць пытаньне, як чалавеку апраўдацца перад Богам. Нікодым, як і ўсе фарысэі, лічыў, што каб увайсьці ў царства Мэсіі, даволі аднаго паходжаньня ад Аўраама, даволі спаўненьня абрадавага закону Майсеевага. Ісус Хрыстос адказвае, што для апраўданьня чалавека патрэбна духоўнае адраджэньне: «Калі хто не народзіцца нанова, кажа Ісус Хрыстос,—ня можа ўвайсьці ў Царства Божае». Зьдзіўлены Нікодым кажа: „Ня можа чалавек нарадзіцца другі раз». На гэта Ісус Хрыстос адказвае, што Ён гаворыць не аб цялесным нараджэньні, але аб духоўным адраджэньні чалавека ці аб ачышчэньні ад грахоў, якое дасягаецца праз хрышчэньне вадою і Духам, і дадаў: «Народжанае з цела ёсьць цела, а народжанае з Духа ёсьць дух».

У далейшай гутарцы Ісус Хрыстос адкрыў Нікодыму яшчэ больш вялікія і нязвычайныя тайны: гаварыў аб збаўленьні людзей праз Сына Чалавечага, паднятага на храсьце, падобна да таго, як Майсей падняў зьмея ў пустыні, «каб усякі, хто веруе ў Яго,

ня згінуў, але меў жыцьцё вечнае»;—гаварыў аб нязьмернай любові Бога да людзей, якая выявілася праз пасланьне Ім у сьвет Сына Свайго Адзінароднага — не дзеля таго, каб «судзіць сьвет, а каб сьвет быў збаўлены праз Яго»; — гаварыў аб дараваньні ўсім праз веру ў Яго і аб засуджаньні тых, хто ня веруе, хто «палюбіў цемру больш за сьвятло». Закончыў Сваю гутарку Ісус Хрыстос як бы лёгкаю дакораю, што Нікодым прыйшоў да Яго ўночы, хаваючыся ад людзей:—„Хто чыніць праўду—сказаў Ісус Хрыстос — той ідзе да сьвятла, каб відавочнымі былі ўчынкі Яго, бо яны ў Богу ўчынены».

Словы Ісуса Хрыста глыбака запалі ў душу рабіна Нікодыма. Ён зрабіўся пасьледавальнікам і прыхільнікам Ісуса аж да самае Яго сьмерці.

## 17. Узяцьце Іоанна Хрысьціцеля ў вастрог. Падарожа Ісуса Хрыста ў Галілею. Гутарка Яго з Самаранкаю.

(Мат. IV, 12; XIV, 3—5; Мрк. VI, 17—19; Іоан. IV, 1—3; Іоан. IV, 4—43).

Грозныя вінавачаньні Іоанна Хрысьціцеля не абміналі нікога. Ён нават не пабаяўся выкрыць грэх начальніка Галілеі Ірада Анціпы, які пры жывым брацe сваім Піліпе ўзяў сабе ягоную жонку Ірадзіаду і жыў з ёю. Ірадзіада прасіла Ірада, каб засудзіў Іоанна на сьмерць. Гэтага-ж дабіваліся і фарысэі, якія ненавідзелі Іоанна за яго вінавачаньні. Але Ірад не хацеў засудзіць Іоанна, бо вельмі шанаваў яго, лічачы яго за сьвятога, і толькі згадзіўся пасадзіць Іоанна ў вастрог. Гэтак і было зроблена.

Пачуўшы аб узяцьці Іоанна, Ісус Хрыстос не захацеў заставацца ў Юдэі, і пайшоў з вучнямі ў Галілею. Была і яшчэ адна прычына, якая прымусіла Ісуса Хрыста пакінуць Юдэю: фарысэі, пачуўшы, што Ісус больш і больш — чым Іоанн — хрысьціць людзей і здабывае вучняў (Сам Ісус Хрыстос ня хрысьціў, але вучні Яго), маглі ў злосьці ўчыніць над Ім які гвалт, а як ня прысьпеў яшчэ час, дык Ісус Хрыстос палічыў за лепшае пакінуць да пары Юдэю.

Калі Іісус Хрыстос праходзіў праз Самарыю, здарылася Яму затрымацца для адпачынку недалёка ад места Сіхар, ля студні Якава. Было каля шостае, панашаму дванаццатае гадзіны дня. Стомлены падаро-



**Гутарка Іісуса Хрыста з Самаранкаю.**

жай, Іісус сеў адпачыць, а вучні Яго пайшлі ў места купіць ежы. У гэты самы час прыходзіць да студні зачарпнуць вады адна самаранка. Іісус просіць яе даць піць. Яна кажа: «Як гэта Ты, Юдэй, просіш піць у мяне, самаранкі. То-ж юдэі ня маюць зносін з самаранамі» [1]). Гасподзь кажа ёй: „Калі-б ты ведала

[1]) Самарыя калісьці была часткаю царства Ізраільска-

дар Божы і Хто кажа табе: „дай Мне піць“ — то ты сама прасіла-б у Яго, і Ён даў-бы табе жывое вады“. Жанчына пытаецца: „Адкуль-жа ў Цябе вада жывая?“ Ісус Хрыстос, паказваючы на студню, кажа: „Кожын, хто п'е гэтую ваду, зноў піць захоча; хто-ж вып'е вады, якой Я дам яму, не запрагне ніколі, і вада, што дам яму, станецца ў ім крыніцаю вады, што цячэ ў жыцьцё вечнае“. Тады жанчына кажа Яму: „Госпадзі! дай мне гэтай вады, каб мне ня прагнуць і ня прыходзіць сюды чэрпаць“. Відаць, самаранка не зразумела, якая гэта „жывая вада“. На просьбу даць ёй „жывое вады“, Ісус Хрыстос сказаў, каб паклікала сюды свайго мужа.—„У мяне няма мужа“,—кажа жанчына. — „Праўду ты сказала, што ў цябе няма мужа, бо ў цябе было пяць, а той, якога цяпер маеш, ня муж табе,“ — адказаў Хрыстос. — „Госпадзі! бачу, што Ты — Прарок“! — выклікнула жанчына, і адразу перайшла на самае балючае пытаньне, якое дзяліла юдэяў і самаранаў: дзе трэба пакланяцца Богу? на гары Гарызім ці ў Ерусаліме? — Ісус Хрыстос адказаў так: „**Прыйшоў час, калі праўдзівыя пакланьнікі будуць пакланяцца Айцу ў духу і праўдзе**“ значыць, на ўсякім месцы). „**Бог ёсьць Дух, і тыя, што пакланяюцца Яму, павінны пакланяцца ў духу і праўдзе**“. Жанчына кажа Яму: „Ведаю, што прыйдзе Мэсія, і калі Ён прыйдзе, абвесьціць нам усё.“ Ісус кажа ёй: „Гэта Я, што гавару з табою“. Здзі-

---

га, але па зруйнаваньні гэтага царства Асырыйскім царом, жыхары былі забраны ў палон, а на іх месца пераселены каляністыя—паганцы з Асырыі. Ад зьмяшаньня гэтых каляністых з тымі яўрэямі, якія яшчэ заставаліся ў Самарыі, і пайшлі самаране. Хаця яны пакланяліся Праўдзіваму Богу, але не пакідалі служыць і паганскім багом. Калі юдэі вярнуліся з палону, дык самаране хацелі злучыцца з імі, але павадыры народу не дапусьцілі да гэтага, баючыся паганскае распусты і няверыя. З таго часу ня было між імі ніякіх зносін. Юдэі лічылі грахом увайцьці ў хату самараніна, сядзець з ім за адным сталом, піць ваду з яго пасудзіны і г. д. Самаране мелі некалі і свой храм на гары Гарызім. Цяпер ён быў зруйнованы.

уленая словамі Госпада, самаранка пабегла ў места, пакінуўшы нават вядро сваё, і там казала ўсім: „Пайдзеце, паглядзеце Чалавека, які рассказаў мне ўсё, што я рабіла. Ці ня Хрыстос гэта?“ Жыхары Сіхару пайшлі да Ісуса і прасілі Яго пабыць у іх. Ён прабыў там два дні, навучаючы іх словам Сваім. Многія ўверавалі ў Яго, кажучы жанчыне: „Верым ужо не дзеля тваіх расказваньняў, а дзеля таго, што самі чулі і даведаліся, што гэта ёсьць праўдзівы Збавіцель сьвету — Хрыстос“.

## 18. Чудоўны лоў рыбы.

Лук. V, 1—11.

Стаяў Ісус Хрыстос на беразе Галілейскага возера і вучыў народ. Народ ціснуўся да Яго, каб чуць слова Божае. Каб было зручней, Ісус Хрыстос увайшоў у адзін човен на возеры, які быў Сіманаў, і прасіў яго крыху адплыць ад берагу. Сеўшы Ісус Хрыстос пачаў вучыць народ з чаўна.

Калі перастаў вучыць, кажа Ісус Хрыстос Сіману: „Адплыві на глыбіню і закінь сеці твае дзеля лову“. Сіман (з ім былі яшчэ Якаў і Іоанн, сыны Завядзеевы) адказаў: „Настаўнік! Мы лавілі ўсю ноч і нічога не злавілі; але па слову Твайму закіну яшчэ сеці“. Закінулі, і злавілі такое мноства рыбы, што нават прарывалася сетка. Дзеля таго, што рыба ўся не зьмяшчалася, яны далі знак сябром, што былі на другім чаўне, і прасілі памагчы ім; сябры пад'ехалі і разам напоўнілі абодва чаўны, так што сраы пачалі заліваццa вадой. Гэта ўзапраўды было чуда. Вялікі страх апанаваў Сімана і ўсіх быўшых з ім. Сіман у вялікім узварушэньні прыпаў да кален Ісусавых і сказаў Яму: „Выйдзі ад мяне, Госпадзі, бо я чалавек грэшны“. Гасподзь заспакоіў Сімана і сказаў яму: „Ня бойся, ад сяньня будзеш лаўцом чалавекаў“. Пасьля гэтага Сіман, Якаў і Іоанн, выцягнуўшы абодва чаўны на бераг, пакінулі ўсё і пайшлі за Ім, каб ужо больш не пакідаць Яго.

## 19. Чудоўнае аздараўленьне аслабленага.

Лук. V, 17—26; Мат. IX, 1—8; Мрк. II, 1—12.

Прыйшоў Ісус Хрыстос у Капэрнаум і стаў вучыць у адным доме. Народу сабралася гэтулькі, што нават ля дзьвярэй ня было месца. У гэты час чацьвёра людзей прынясьлі на пасьцелі аслабленага (жыламі) чалавека, каб палажыць яго перад Ісусам, бо чулі пра „сілу Госпадаву дзеля аздараўленьня людзей“. Але прынёсшыя ніяк не маглі праціснуцца праз натоўп. Тады яны ўзьлезлі на верх дому і праз страху[1]) спусьцілі хворага з пасьцельлю на сярэдзіну перад Ісусам. Толькі глыбокая вера ва ўсемагутнасьць Ісуса магла ўдыхнуць ім гэтую думку. Гасподзь, бачачы веру іх, сказаў чалавеку гэнаму: „Адпускаюцца табе грахі твае“. Гэтыя словы чулі некаторыя з фарысэяў і кніжнікаў, якія прыйшлі з Галілеі, Юдэі і нават з Ерусаліму паслухаць Ісуса. Яны пачалі між сабою разважаць: „Хто можа адпускаць грахі, апрача аднаго Бога?“ Ісус, ведаючы думкі іхныя, сказаў ім: „Што лягчэй сказаць: адпускаюцца табе грахі твае ці сказаць: „Устань, вазьмі пасьцель тваю і хадзі? Але каб вы ведалі, што Сын Чалавечы мае ўладу на зямлі адпускаць грахі—сказаў Ён аслабленаму: табе кажу: устань, вазьмі пасьцель тваю і ідзі ў хату тваю“. Хворы адразу ўстаў, узяў усё, на чым ляжаў, і пайшоў да хаты, славячы Бога. І страх апанаваў усіх, і славілі Бога, кажучы: „Дзіўныя падзеі бачылі мы сяньня“.

---

[1]) На ўсходзе дамы маюць плоскія стрэхі, на якіх можна гуляць ці адпачываць. Гэтыя стрэхі ў некаторых дамох рассоўваюцца, каб з хаты адразу можна было выйсьці на верх. Разумеецца, можна на страху ўлезьці і з панадворку, па сходах.

# Другі год служэньня Ісуса Хрыста.

## 20. Другая Пасха. Ісус Хрыстос у Ерусаліме. Чудоўнае аздараўленьне аслабленага каля авечай купальні.

Мат. IX, 9; Мрк. II, 14; Іоан. V, 1—18.

Першы год Свайго вялікага служэньня Ісус Хрыстос правёў у далёкай Галілеі. Абходзячы гарады і вёскі, Хрыстос прапаведваў людзям Евангельле збаўленьня і чудоўна аздараўляў хворых і нядужых, па іх веры. Усюды спадарожнічалі Яму вучні Яго. Да ліку іх незадаўга перад другой Пасхай далучыўся мытнік Левій або Матвей. Ён пайшоў за Хрыстом на адно Яго слова: ,,Ідзі за Мною“.

На сьвята Пасхі І. Хрыстос пайшоў у Ерусалім. Аднаго разу здарылася Яму тут праходзіць каля т. зв. авечае купальні. Гэта была сажалка, у якой купалі авечак, прызначаных для ахвяраў у храме. Вада ў ёй лічылася лячэбнаю, бо як гаварыцца ў Евангельлі — „Ангел Гасподні час ад часу зыходзіў у капальню і каламуціў ваду; і хто першы ўваходзіў у яе пасьля ўскаламучаньня вады, той здаравеў, на што-б ні хварэў“. Тут, пад наўмысьля пабудованымі паветкамі, знаходзілася заўсёды мноства нядужых, сьляпых, кульгавых, ссохшых, што чакалі руху вады. Між імі на гэты раз ляжаў адзін няшчасны, які пакутаваў ужо трыццать восем гадоў. Калі І. Хрыстос убачыў яго, Ён запытаўся: «Ці хочаш паздаравець?» Хворы адказаў Яму: «Так, Госпадзі, але я ня маю чалавека, які спусьціў-бы мяне ў купальню, калі ўскаламуціцца вада: калі-ж сам прыходжу, другі ўжо зыходзіць перада мною». Тады І. Хрыстос кажа: „Устань, вазьмі пасьцель тваю і хадзі“. І ў тую-ж часіну хворы стаўся здаровым, узяў пасьцель сваю і пайшоў. Па дарозе сустрэліся фарысэі. Яны зрабілі яму ўвагу:

«Сяньня — кажуць — субота, нягожа табе нясьці пасьцель». Аздароўлены адказаў, што ён толькі спаўняе волю Таго, Хто яго аздаравіў. На пытаньне, хто гэта такі, аздароўлены нічога не адказаў, бо і сам ня ведаў. Сустрэўшы Ісуса ў храме, ён паказаў на Яго начальнікам жыдоўскім. Тыя пачалі закідваць Хрысту, што Ён гэткае робіць у суботу. Ісус адказаў ім: «Айцец Мой дасюль робіць, і Я раблю.» Гэтыя словы яшчэ больш узбурылі жыдоў, і з таго часу пачалі яны шукаць, каб забіць Яго, гаворачы між сабою: «Ён ня толькі ломіць суботу, але і Айцом Сваім заве Бога, раўняючы Сябе да Бога».

Евангельская аповесьць аб чудоўным аздараўленьні аслабленага канчаецца зазначэньнем, што аздароўлены пайшоў у храм падзякаваць Бога за сваё вылячэньне. Там ад спатканага Госпада ён пачуў словы, якія глыбака запалі яму ў сэрца: «Вось ты цяпер здаровы — сказаў Гасподзь — не грашы-ж больш, каб ня здарылася табе нешта горшае». Пэўне, чалавек той нёс кару за свае цяжкія грахі, якія былі дараваны яму разам з вылячэньнем.

## 21. Вучэньне І. Хрыста аб субоце.

Лук. VI, 1—11; Мат. XII, 1—15.

Жыды заўсёды вельмі шанавалі і строга спаўнялі закон аб сьвяткаваньні суботы. Так было і пры жыцьці І. Хрыста. Фарысэі — вучыцялі і начальнікі жыдоўскія — не дапускалі ніякіх нарушэньняў суботняга спакою. Хто хацяў у малым чым адступіць ад буквы ці вымаганьняў закону, таго лічылі вялікім грэшнікам.

Калі аднаго разу фарысэі ўбачылі, як вучні І. Хрыста, праходзячы ў суботу засеянымі палямі, зрывалі калосьсе і елі, расьціраючы рукамі, дык пачалі закідваць Хрысту, што вучні Яго зьняважаюць суботу. І. Хрыстос адказаў на гэты закід прыкладам, як Давід, іхны вялікі цар і прарок, у дзень суботні ўвайшоў у храм Божы і, прымушаны голадам, еў разам з сваімі спадарожнікамі сьвяшчэнныя хлебы, якія

паводле закону маглі есьці адныя толькі сьвяшчэньнікі. Хаця Давід і нарушыў закон, аднак яго не абвінавачваюць; больш таго — яго лічаць праведным, сьвятым. Так сама і ў гэтым выпадку: няма граху ў тым, што вучні Хрыста елі ў суботу калосьсе, пры-



Вучэньне Ісуса Хрыста аб субоце.

мушаныя да таго голадам.

Што ў законе важна не сьляпое, знадворнае спаўненьне яго „буква ў букву“, а чалавек перш за ўсё павінен памятаць аб помачы сваім блізкім, хаця-б праз гэта нарушаўся закон аб субоце, гэта

І. Хрыстос у той-жа самы дзень паказаў і на другім прыкладзе—ужо ня словам толькі, а дзелам. Ён чудоўна аздаравіў аднаго сухарукага, які з глыбокаю верою прасіў у Хрыста помачы. Перад гэтым І. Хрыстос спытаўся ў фарысэяў: «Што трэба рабіць у суботу — дабро ці зло? збавіць душу ці загубіць?» Фарысэі маўчалі. І. Хрыстос казаў далей: «Хто з вас, маючы адну авечку, калі яна ў суботу ўпадзе ў яму, не вазьме яе і ня выцягне? Таму кажа — можна і ў суботу рабіць дабро». Пасьля гэтых слоў І. Хрыстос сказаў сухарукаму: «Выцягні руку тваю». Ён выцягнуў, і стала яна здаровая, як другая. Як наагул трэба разумець закон аб субоце, якую «Сын Чалавечы, як гаспадар суботы», можа і зусім скасаваць, гэта І. Хрыстос коратка высьвятліў у такіх глыбока паказальных і праўдзівых словах: «Субота для чалавека, а не чалавек для суботы» (Мрк. II, 27—28).

## 22. Абраньне дванаццацёх Апосталаў.

Мат. X, 1—4; Мрк. III, 13—19; Лук. VI, 12—16.

Господзь І. Хрыстос прыйшоў на землю дзеля збаўленьня ўсіх людзей. Між усімі народамі павінна было быць пашырана Слова Божае, Сьв. Евангельле. Дзеля гэтага Хрысту трэ'было выбраць гурток шчырых і адданых пасьледавальнікаў, якія бы, з вераю ў Яго Божае пасольства, распаўсюдзілі Евангельле па ўсім сьвеце. І. Хрыстос і зрабіў гэта, «каб былі з Ім, каб пасылаць іх на пропаведзь, каб мелі ўладу аздараўляць хворых, і выганяць злых духаў», — зрабіў аднак ня ў Юдэі, дзе ўсюды прасьледвала Яго злосьць фарысэяў, а ў далёкай, ціхай Галілеі, паблізу так любага Яму Гэнісарэцкага возера.

Раней абраньня Апосталаў Господзь узыйшоў на гару памаліцца; целую ноч правёў Ён у малітве. Калі настаў дзень, Хрыстос паклікаў на гару Сваіх вучняў і выбраў з іх дванаццаць, якіх назваў **Апосталамі** або пасламі. На Апосталаў І. Хрыстос абраў ня знатных, багатых ці адукаваных людзей, а самых про-

стых і бедных, якіх адзначала глыбокая вера, аддасьць Свайму Вучыцелю і чыстае, незласьлівае сэрца. Усе яны з паходжаньня былі яўрэі, пры тым не з аднаго толькі калена Левія, з якога абіраліся старазаветныя сьвяшчэньнікі, а з розных каленаў, бо І. Хрыстос меўся заснаваць новае ўсясьветнае сьвяшчэнства. Вось імёны 12 Апосталаў: Андрэй, ягоны брат Сіман, які зваўся Пятром, Якаў і Іоанн, Піліп і Баўтрамей (Нафанаіл), Матвей і Хама, Якаў Алфеяў і Сіман, празваны Зілот, Юда Якаўлеў і Юда Іскарыёт, які пасьля прадаў Хрыста.

Абраньне 12 Апосталаў было вельмі важным момантам у служэньні І. Хрыста. Дасюль Гасподзь не абвяшчаў адкрыта вучэньня Евангельля. З гэтага-ж часу, маючы адданых Сабе вучняў і Апосталаў, Хрыстос пачынае раскрываць перад імі і перад народам усе тайны заснаванага Ім Царства Божага. Перш за ўсё Хрыстос робіць гэта ў т. зв. **Нагорнай Пропаведзі**. Яна зьмяшчае ў сабе важнейшыя ісьціны Новазаветнага Закону, які йшоў на замену аджываўшага ўжо свой век закону Майсеевага.

## 23. Нагорная Пропаведзь.

Мат. разьдз. V, VI і VII; Лук. VI, 17—49.

Нагорную пропаведзь І. Хрыстос вымавіў з гары вучням Сваім і мноству народу, які папрыходзіў з усяе Юдэі і Ерусаліму і прыморскіх гарадоў, каб паслухаць Яго і пазбыцца хворасьцяў сваіх. Усе стараліся дакрануцца да Яго, бо ад Яго зыходзіла сіла і аздараўляла ўсіх. Напярэдадні Хрыстос цэлую ноч правёў Адзін у малітве на гары (Лук. VI, 12). Калі настаў дзень, Хрыстос спусьціўся ўніз да таго месца, дзе чакалі Яго вучні і народ, і, «падняўшы вочы Свае на вучняў Сваіх», пачаў гаварыць. Перш за ўсё Хрыстос гаварыў аб тым, як людзі павінны жыць, каб дасягнуць шчасьця, каб стварылася на зямлі запраўднае **Царства Божае**, каб і па сьмерці атрымаць чалавеку вечнае збаўленьне ў **Царстве Нябесным**.

**Вучэньне аб шляхох да духоўнага шчасьця.**

1. Бл҃же́ни ни́щїи д҃хомъ, ꙗ҆́кѡ тѣ́хъ є҆́сть цр҃твο нб҃ное.

**Шчасьлівыя убогія духом, бо іх ёсьць Царства Нябеснае.**



Нагорная Пропаведзь.

Чалавеку трэба усьведаміць сабе сваю грахоўнасьць, сваю духоўную ўбогасьць, трэба сьцішыць у сабе гордасьць — крыніцу ўсялякага граха. Толькі пакорнасьць і скромнасьць вядуць да запраўднага ўдасканаленьня чалавека і адчыняюць уваход у Царства Нябеснае.

2. Бл҃же́ни пла́чꙋщїи, ꙗ҆́кѡ тї́и ᲂу҆тѣ́шатсѧ.

**Шчасьлівыя што плачуць, бо яны усьцешацца.**

Хто бачыць свае слабасьці і грахі, той ужо каецца і плача аб іх і набіраецца волі больш не грашыць. У гэтай рашучасьці ён знайдзе для сябе праўдную ўцеху.

3. Бла҃же́ни кро́тцыи, ꙗ҆́кѡ тї́и наслѣ́дѧтъ землю.

**Шчасьлівыя ціхія, бо яны ўнасьледуюць землю.**

Чалавек павінен адкінуць з душы сваей усялякі гнеў і злосьць і заўсёды нясьці людзям шчырую ласку і любоў. Тыя, што створаць у душы сваёй такі настрой, будуць шчасьлівымі. І да іх, а ня гордых і злых, будзе належаць зямля, калі Царства Божае, г. зн. любоў і дабро, распашырацца ўсюды.

4. Бла҃же́ни а҆́лчꙋщїи и҆ жа́ждꙋщїи пра́вды, ꙗ҆́кѡ тї́и насы́тѧтсѧ.

**Шчасьлівыя, што шукаюць і прагнуць праўды (як галодны шукае хлеба), бо яны насыцяцца.**

Да прыходу І. Хрыста людзі ня ведалі праўды, г. зн. волі Божае. Цяпер адкрываецца яна для ўсіх і кожын у слове Божым можа задаволіць свой духоўны голад, сваю смагу.

5. Бл҃же́ни ми́лостивїи, ꙗ҆́кѡ тї́и поми́ловани бꙋ́дꙋтъ.

**Шчасьлівыя міласьцівыя, бо яны памілаваныя будуць.**

Хто міласьцівы да другіх, да таго і Бог будзе міласьцівы. Трэба спачуваць і памагаць людям у іх бядзе і пакуце. Трэба выбачаць людзям іхныя заганы і грахі і толькі да сабе быць строгімі судзьдзямі. За гэта Гасподзь даруе вам вашыя грахі і памілуе вас.

6. Бл҃же́ни чи́стїи се́рдцемъ, ꙗ҆́кѡ тї́и Бо́га ᲂу҆́зрѧтъ.

**Шчасьлівыя чыстыя сэрцам, бо яны Бога ўбачаць.**

Спаўненьне ўсіх папярэдніх запаведзяў стварае чыстату сэрца, г. зн. чыстату думак, намераў, пачуцьця, усіх дзеяньняў чалавека. Хто мае такі скарб, тым Гасподзь абяцае вялікую заплату: яны ўбачаць Бога.

7. Бл҃же́ни миротво́рцы, ꙗ҆́кѡ ті́и сы́нове Бж҃їи нарекꙋ́тсѧ.

**Шчасьлівыя міратворцы, бо яны сынамі Божымі назавуцца.**

Ня шукайце прычыны да гневу і сваркі. З усімі жывеце ў паразуменьні і згодзе. Стварайце праўдзівае брацтва між людзьмі. Такія людзі — кажа Гасподзь — сынамі Божымі будуць звацца, бо і Сам Сын Божы прыйшоў на зямлю, каб прымірыць людзей з Богам.

8. Бл҃же́ни ꙇ҆згна́ни пра́вды ра́ди, ꙗ҆́кѡ тѣ́хъ є҆́сть црⷭ҇тво нбⷭ҇ное.

**Шчасьлівыя прасьледваныя за праўду, бо іх ёсьць Царства Нябеснае.**

Тым, хто будзе будаваць сваё жыцьцё згодна з гэтаю навукаю, прыдзецца напаткнуцца на ўсялякую няпраўду і прасьледваньні, мо' нават на выгнаньне, але іх чакае шчасьце быць удзельнікамі Царства Нябеснага.

9. Бл҃же́ни є҆стѐ, є҆гда̀ поно́сѧтъ ва́мъ, и҆ ꙇ҆жденꙋ́тъ и҆ рекꙋ́тъ всѧ́къ ѕо́лъ глаго́лъ на вы̀ лжꙋ́ще, Менѐ ра́ди.

**Шчасьлівыя вы, калі за Мяне зьневажаюць вас, выганяюць і гавораць на вас усялякую няпраўду.**

Гэтыя словы І. Хрыстос датарнаваў ня толькі да Апосталаў, як пракрокаў Новага Завету, але і да ўсіх хрысьціян: шчасьлівыя будуць тыя, хто прыймае і пераносіць усялякую муку, прасьледваньні, пакуту, гнёт, выгнаньне і тым болей сьмерць за імя Хрыста і за адзіную праўдзівую Праваслаўную веру.

Ра́дꙋйтесѧ и҆ весели́тесѧ, ꙗ҆́кѡ мзда̀ ва́ша мно́га на небесѣ́хъ.

**Радуйцеся і весялецеся, бо ў нябёсах будзе вам вялікая заплата.**

## Старазаветны і новы закон. — Вучэньне Ісуса Хрыста аб дараваньні крыўдаў і любові да ворагаў.

Сваю навуку Ісус Хрыстос выкладаў перад жыдамі. Гэтая навука магла паказацца ім нязгоднаю з законам Майсеевым, які кіраваў усім іх жыцьцём. Вось Ісус Хрыстос і кажа Сваім слухачом: «Ня думайце, што Я прыйшоў скасаваць закон (Майсееў); прыйшоў не скасаваць, а споўніць". Па слову Госпада, закон Майсееў павінен захаваць сваю сілу, пакуль ня будзе споўнены ўвесь. Трэба толькі, каб іншы дух панаваў ў законе, — дух шчырага скрушэньня аб сваіх грахох і рашучасьці ўперад будаваць сваё жыцьцё паводле закону любві і праўды Божай. Кніжнікі і фарысэі спаўняюць закон, але «Калі праведнасьць ваша — кажа Гасподзь — ня будзе вышэй за праведнасьць кніжнікаў і фарысэяў, дык вы ня ўвойдзеце ў Царства Нябеснае» (Мат. V, 20).

Бяручы, далей, некаторыя пастановы закону Майсеевага, Ісус Хрыстос паказвае, што цяпер яны павінны быць прасякнуты іменна гэтым новым духам, што іх ужо не стае для сыноў новага Царства Божага на зямлі. Так

1) закон Майсееў аддаваў пад суд толькі забойцу: Ісус Хрыстос кажа, што суду падлягае нават той, хто толькі гневаецца дарэмна на брата свайго; яшчэ вышэйшаму суду падлягае той, хто скажа брату свайму якое крыўднае слова;

2) закон Майсееў дазваляў кляцьбу (імем Божым), — ня можна было толькі нарушаць яе: у новым Царстве Хрыстовым не павінна быць зусім кляцьбы. Пасьледавальнікі і вучні Хрыстовы заўсёды павінны быць да таго праўдзівыя і шчырыя, каб ніколі

ніхто не вымагаў сьцверджаньня сваіх слоў кляцьбою, здавальняючыся звычайным адказам: «так» ці «не»;

3) у законе Майсеевым дазвалялася мсьціцца за крыўды тым-жа спосабам, якім хто быў зьняважаны: „вока за вока, зуб за зуб"; Ісус Хрыстос наагул забараняе мсьціцца, кажучы: „Не праціўся злому. Але хто ўдэрыць цябе ў правую шчаку тваю, падстаў яму і другую, і хто захоча судзіцца з табою і ўзяць у цябе сарочку, аддай яму і верхнюю вопратку". Гэтыя прыклады гавораць, што усялякае зло трэба перамагаць дабром. „Усякаму, хто просіць у цябе, давай і ад узяўшага тваё не вымагай назад. **Ва усім, як хочаце, каб з вамі абыходзіліся людзі, так і вы абыходзьцеся з імі".**

4) яўрэйскі закон вымагаў любіць толькі блізкіх; што-ж да ворагаў, дык яўрэі думалі, што іх можна толькі ненавідзець. Ісус Хрыстос паднімае любоў на вышэйшую ступень дасканаласьці: Ён гаворыць аб любові нават да ворагаў: „Любеце ворагаў вашых, багаслаўляйце праклінаючых вас, рабеце дабро ненавідзячым вас і малецеся за крыўдзячых і прасьледуючых вас, і будзеце сынамі Ўсявышняга".

Гэтымі параўнаньнямі Ісус Хрыстос ня скончыў нагорнае пропаведзі. Далей Ён падрабязна навучае, як чалавек павінен жыць і дагаджаць Богу, каб быць годным Яго Царства.

**Аб міласьціне.** — Міласьціну бедным трэба даваць не дзеля таго, каб людзі бачылі гэта і хвалілі таго, хто дае. Міласьціну трэба даваць скромна, не выстаўляючыся на людзях, ад чыстага сэрца, з адным толькі жаданьнем памагчы няшчаснаму. „Калі даеш міласьціну, хай левая твая рука ня ведае, што робіць правая, і каб міласьціна твая была ўтоена. Айцец твой, бачачы ўтоенае, наградзіць цябе яўна".

**Аб малітве.** — „Калі молішся, не ўпадабляйся двудушнікам, якія моляцца ў сінагогах і на рагох вуліц, каб паказацца перад людзьмі. Ты, калі молішся, увайдзі ў камору тваю, і, зачыніўшы дзьверы, памаліся Айцу твайму тайна. А молячыся не гаварэце лішняга, як паганцы (г. зн. аб ежы, вопратцы і наагул

аб усім, што патрэбна нашаму целу): „Яны думаюць, што праз многаслоўе сваё будуць пачуты. Ня будзьце падобнымі да іх, бо Айцец ваш ведае, чаго вам трэба, раней чым папросіце ў Яго. Малецеся-ж так:

Ѻ҆́ч҃е на́шъ, и҆́же є҆сѝ на нб҃сѣ́хъ! Да свѧти́тсѧ И҆́мѧ Твоѐ: да прїи́детъ Ца́рствїе Твоѐ: да бꙋ́детъ во́лѧ Твоѧ̀, ꙗ҆́кѡ на нб҃сѝ и҆ на землѝ. Хлѣ́бъ на́шъ насꙋ́щный да́ждь на́мъ дне́сь: и҆ ѡ҆ста́ви на́мъ до́лги на́шѧ, ꙗ҆́коже и҆ мы̀ ѡ҆ставлѧ́емъ должникѡ́мъ на́шымъ: и҆ не введѝ на́съ во и҆скꙋше́нїе, но и҆зба́ви на́съ ѿ лꙋка́вагѡ.

**Отча наш, Каторы ёсьць у нябёсах! Няхай сьвяціцца Імя Тваё, няхай прыйдзе Царства Тваё, няхай будзе воля Твая, як у небе, так і на зямлі. Хлеб наш штодзенны дай нам сягоньня, і даруй нам даўгі нашыя, як і мы даруем даўжнікам нашым; і ня ўводзь нас у спакушэньне, дый збаў нас ад злога.**

**Аб Промысле Божым.** — „Не клапацецеся — кажа Господзь — аб душы вашай, што вам есьці ці піці, і ўвошта апрануцца. Паглядзеце на птушкі нябесныя: яны ня сеюць, ня жнуць, ня зьбіраюць у сьвірны, аднак-жа Айцец ваш Нябесны корміць іх. Ці вы ня лепшыя за іх? Паглядзеце і на палявыя лілеі, як яны растуць: не працуюць і не прадуць; але кажу вам, што і Саламон ва ўсёй славе сваёй не апранаўся так, як кожная з іх; калі-ж траву палявую, каторая сяньня ёсьць, а заўтра будзе кінута ў печ, Бог так апранае, дык колькі-ж больш апякуецца вамі, малаверы?“ (Чалавек у вачох Бога нязьмерна вышэй за ўсе гэтыя птушкі і лілеі). **„Шукайце наперад Царства Божага і праўды яго, а гэта ўсё** (зямное) **дадасца вам“.**

**Аб неасуджэньні блізкіх.** — „Ня судзеце, каб ня былі асуджаны. Бо якім судом вы судзіце, такім будуць судзіць і вас, і якою мераю вы мерыце, такою і вам будуць мерыць. Што ты глядзіш на сучок у воку брата твайго, а бервяна ў сваім воку ня чуеш? Двудушнік! выми раней бервяно з свайго вока і тады

ўбачыш, як выняць сучок з вока брата твайго". Гэтымі словамі Ісус Хрыстос навучае, каб мы не перабіралі чужых грахоў, а сьпяшаліся раней ачысьціцца ад сваіх.

,,Не давайце сьвятога сабакам і ня кідайце пэрлаў сваіх перад сьвіньнямі, каб не патапталі іх нагамі сваімі і, адвярнуўшыся, не разарвалі вас".

**,,Вось-жа ўсё, што хочаце, каб вам рабілі людзі, дык тое рабеце і вы ім; бо гэта закон і прарокі".**

**Аб сіле малітвы** Гасподзь гаварыў у такіх словах: ,,Прасеце і дадзена будзе вам, шукайце і знойдзеце, стукайцеся і адчыняць вам". Хрыстос вучыць быць настойлівымі ў шуканьні Царства Божага. Але пры гэтым трэба разьлічваць не на свае слабыя сілы, а на помач Божую, таму трэба маліцца і прасіць яе ў Бога, і ,,дадзена будзе вам". ,,Усякі, хто просіць, дастае і хто шукае, знаходзіць, а таму, хто стукае, адчыняюць. Ці ёсьць між вамі такі чалавек, які, калі-б сын яго папрасіў у яго хлеба, падаў-бы яму камень, і калі-б папрасіў рыбы, падаў-бы яму зьмяю? Бо калі вы — злыя — умееце аднак рабіць добрае дзецям вашым, дык тым хутчэй Айцец ваш Нябесны дасьць добрае тым, хто просіць ў Яго".

,,Уваходзьце праз цесныя вароты, бо шырокі вароты і вольны той шлях, што вядуць да загубы, і шмат хто йдзе імі; бо цесны вароты і вузкі той шлях, што вядуць у жыцьцё, і вельмі мала хто знаходзіць іх. Сьцеражэцеся ілжывых пракокаў, якія прыходзяць да вас у авечай скуры, а ў сярэдзіне яны ваўкі драпежныя. Па пладох іх пазнаеце іх. Ці-ж зьбіраюць з цярноўніка вінаград, або з асоту фігі? Гэтак усякае добрае дрэва дае і плады добрыя, а благое дрэва дае і плады благія. Ня можа дрэва добрае даваць благіх пладоў, ні благое дрэва даваць добрых пладоў. Усякае дрэва, што не дае добрага плада, сьсякаюць і кідаюць у вагонь. Дык па пладох іх пазнаеце іх".

,,Ня ўсякі, хто кажа Мне: Госпадзі! Госпадзі! ўвайдзе ў Царства Нябеснае, а той, хто выпаўняе волю Айца Майго, што ў нябёсах".

Уся гэтая вялікая па сваёй мудрасьці пропаведзь Ісуса Хрыста зрабіла глыбокае ўражаньне на слухачоў і вучняў Яго. Народ дзівіўся вучэньню Яго, бо Ён вучыў, як Той, што мае ўладу, а не як кніжнікі і фарысэі.

Калі Гасподзь зыйшоў з гары, за Ім пайшло шмат народу.

## 24. Прыповесьць аб сяўцу.

Мат. XIII, 1—23; Мрк. IV, 1—20; Лук. VIII, 4—15.

Ісус Хрыстос часта навучаў народ прыповесьцямі (прытчамі), бяручы прыклады з блізкага жыцьця.



**Прыповесьць Ісуса Хрыста аб сяўцу.**

Іншы раз Ён Сам і тлумачыў іх. Прыповесьць аб сяўцу Ісус Хрыстос прамовіў, стоячы ў чоўне пры беразе Галілейскага возера, абкружаны вялікім натоўпам людзей.

Выйшаў сявец сеяць. І калі ён сеяў, іншае зерня ўпала пры дарозе: наляцелі птушкі і паклявалі яго; іншае ўпала на камяністае месца і, ўзыйшоўшы, хутка засохла, бо ня мела вільгаці; іншае-ж упала між цярніною, і вырасла цярніна і заглушыла яго;

а іншае ўпала на добрую землю і, ўзыйшоўшы, прынясло добры плод: адно ў сто разоў, другое ў шэсьцьдзесят, іншае ў трыццаць разоў.

Выслухаўшы прыповесьць, вучні прасілі Ісуса Хрыста вытлумачыць яе значэньне, і Господзь вытлумачыў. Сявец — гэта Сам Ісус Хрыстос; зерня — абвешчанае Ім слова Божае; земля — вучні і народ, які Яго слухае. Пад дарогай, дзе зерня топчуць падарожныя і клююць птушкі, разумеюцца людзі нядбайныя і зьбянтэжаныя: слова Божае ў іх душах не пакідае ніякага сьледу. Камяністы грунт — гэта людзі, якія з радасьцю прыймаюць слова Божае, але яно ня глыбока ўкараняецца ў іх сэрцы, і, ў часе жыцьцёвых няўдачаў ці спакушэньня, яны легка адкідаюць яго. Цярніны азначаюць жыцьцёвыя клопаты і грахоўныя ўцехі, якія заглушаюць пасеянае ў душы слова Божае. Пад добрым грунтам разумеюцца людзі, якія ня толькі з верою прыймаюць слова Божае, але і жывуць паводле яго: іх добрыя дзелы ёсьць пладамі пасеянага ў іх душах слова Божага.

І яшчэ многімі прыповесьцямі навучаў Господзь, калі стаяў на беразе возера.

## 25. Уцішэньне буры.

Мат. VIII, 23—27; Мрк. IV, 35—41; Лук. VIII, 22—25.

Аднаго дня падыйшоў Ісус Хрыстос з Апосталамі да Галілейскага возера, сеў з імі ў човен і папрасіў ехаць на той бок возера. Былі тут і іншыя чаўны. Калі яны ехалі, Ісус Хрыстос, зморany доўгім навучаньнем і хадою, спаў у чоўне. Раптам паднялася страшная бура. Хвалі залівалі човен, і ён быў у вялікай нябесьпецы. Тады Апосталы разбудзілі Ісуса Хрыста і сказалі: „Настаўнік! мы гінем. Ратуй нас!“ Ісус Хрыстос ўстаў і ўладна закрычаў ветру: „Сцішні! перастань!“ Адразу спынілася хваляваньне вады і сталася ціша. Зварочваючыся пасьля таго да Апосталаў, Ісус Хрыстос кажа ім: „Чаго вы так перепалохаліся? дзе вера ваша?“ Яны нічога на гэта не адказалі, а

толькі — перастрашаныя і зьдзіўленыя — гаварылі адзін аднаму: „Хто-ж гэта, што і ветрам загадвае і вадзе, і слухаюць Яго?“ — І прыплылі ў старану Гадарынскую, што насупроць Галілеі.



Уцішэньне буры.

### 26. Чудоўнае вылячэньне Гадарынскага шалёнага.

Мрк. V, 1—20; Лук. VIII, 26—39.

Як толькі Ісус Хрыстос выйшаў на бераг, да Яго падбег шалёны, які з даўных часоў быў апанаваны нячыстымі духамі або д'яблам. Шалёны жыў ня ў хаце, але ў горах, хаваючыся ў магілах, хадзіў не апранаўшыся, дзень і ноч крычаў і біўся аб каменьні. Ён валадаў нечалавечай сілай; колькі разоў яго ні за-

коўвалі ў ланцугі, ён кожын раз разрываў іх. Ніхто ня меў сілы ўзяць яго. Ён трымаў у страху ўсю ваколіцу, кожын баяўся спаткацца з ім. — Угледзіўшы здалёк Ісуса, шалёны падбег да Яго, паваліўся перад Ім на зямлю і голасна выклікнуў: „Што Табе да



Чудоўнае вылячэньне Гадарынскага шалёнага.

мяне, Ісусе, Сыне Бога Ўсявышняга? Малю Цябе, ня муч мяне!“ Ісус Хрыстос, зварочваючыся да нячыстага духа, які апанаваў шалёнага, кажа:„ Выйдзі, духу нячысты, з гэтага чалавека!“ Пасьля спытаўся ў духа: „Як тваё імя?“ Ён сказаў: „Легіён[1]), бо нас

---

[1]) Легіёнам зваўся аддзел рымскага войска, у якім налічвалася да 6.000 ваякаў.

шмат“. І пачалі чэрці прасіць Яго, каб не загадваў ім ісьці ў бяздоньне, а пазволіў увайсьці ў гурт сьвіней, які пасьвіўся блізка (было іх каля дзьвёх тысячаў). Хрыстос пазволіў ім. Чэрці, выйшаўшы з чалавека, увайшлі ў сьвіньні, і тады ўвесь гурт кінуўся з кручы ў мора і ўтапіўся. Спалоханыя пастухі, бачачы, што сталася, пабеглі дый расказалі ўсё ў месьце і вёсках. Прыйшлі жыхары і бачаць — шалёны сядзіць ля ног Ісуса — апрануты, зусім здаровы і пры поўным розуме. Яны пачалі распытваць аб усіх гэтых падзеях і пастухоў і самога шалёнага, і вельмі перапалохаліся. І стаў увесь народ прасіць Ісуса Хрыста адыйсьці ад іх, бо іх апанаваў вялікі страх. Тады Ісус Хрыстос увайшоў у човен і ад'ехаў. Чалавек-жа той, удзячны за сваё чудоўнае аздараўленьне, хацеў ісьці за Ісусам, але Ён не пазволіў і толькі сказаў: „Ідзі дамоў да сваіх і раскажы ім, што ўчыніў табе Гасподзь і як ўратаваў цябе“. І пайшоў аздароўлены і пачаў па ўсёй той краіне расказваць пра быўшае з ім, і славіць свайго Збавіцеля.

## 27. Уваскрашэньне дачкі Яіра.

Мат. IX, 18—26; Мрк. V, 35—43; Лук. VIII, 40—56.

Адзін з начальнікаў жыдоўскае сынагогі, на імя Яір, прыйшоў да Ісуса і, ўпаўшы да Яго ног, сказаў: „Адзіная дачка мая паміраe; прыдзі ў мой дом і ўскладзі на яе рукі, каб паздаравела“. Бачачы веру Яіра, Ісус Хрыстос пайшоў за ім. Па дарозе сустракае іх нехта з дому Яіра і кажа яму: „Дачка твая памёрла; ня трэба непакоіць Вучыцеля“. Ісус, пачуўшы гэтае, сказаў Яіру: «Ня бойся, толькі веруй, і збаўлена будзе“. Калі прышлі ў дом, там усе плакалі і галасілі па памёршай. Але Ісус Хрыстос сказаў: «Ня плачце; яна не памёрла, але сьпіць». І пачалі ўсе сьмяяцца з Яго, ведаючы, што дзяўчына памёрла. Выслаўшы з дому ўсіх, хто там быў, і ўзяўшы з Сабой Пятра, Якава і Іоанна, Ісус Хрыстос увайшоў разам з бацькамі ў пакой, дзе ляжала памёршая, узяў яе за руку і сказаў: «Дзяўчына! табе кажу: устань!» І вярнуўся дух яе, і адразу ўстала і пачала хадзіць, — яна бы-

ла гадоў дванаццацёх. Бацькі яе вельмі зьдзівіліся, але Ісус Хрыстос спакойна сказаў ім, каб далі ёй есьці. І загадаў ім не казаць нікому аб тым, што сталася.

Гэта было першае васкрашэньне памёршага чалавека. Чуткі аб гэтым нябывалым васкрашэньні хутка разыйшліся па ўсёй зямлі, і яшчэ больш пачало зьбірацца каля Яго народу — пабачыць і паслухаць Вялікага Вучыцеля і Чудатворца.

## 28. Чудоўнае вылячэньне двох сьляпых. Васкрашэньне сына ўдавы з Наіну.

Мат. IX, 27—31; Лук. VII, 11—17.

Калі Ісус Хрыстос пайшоў з дому Яіра, за Ім ішлі два сьляпцы, якія — паўтараючы: «Памілуй нас, Ісусе, Сыне Давідаў!» неадступна прасілі вярнуць ім зрок. Хочучы дазнацца аб сіле іх веры, Хрыстос доўга не зварочваў на іх ніякае ўвагі. Напасьледак, калі ўжо прыйшлі ў хату, дзе Ён жыў, пытаецца ў іх: „Ці веруеце ў тое, што Я магу гэта зрабіць?“ Яны адказалі: „Так, Госпадзі!“ Тады Ён дакрануўся да вачей іх і сказаў: „Па веры вашай хай будзе вам“. І адкрыліся вочы іх. І пайшлі яны славіць Госпада па усёй зямлі той.

Пасьля таго пайшоў Ісус Хрыстос у горад Наін. За Ім ішлі многія з вучняў Яго і шмат народу. Калі падыходзілі да гарадзкое брамы, насустрэчу выносілі памёршага, які быў адзіным сынам у маткі (яна была ўдава). За насілкамі ішло шмат народу з места. Няшчасная матка бязуцешна плакала. Пабачыўшы яе, Гасподзь зьмілаваўся над ёю і сказаў: „Ня плач!“ Пры гэтых словах Ісус Хрыстос падыйшоў да насілак, дакрануўся да іх і сказаў памёршаму: „Хлопча, табе кажу: устань!“ Памёршы, падняўшыся, сеў і пачаў гаварыць. Усе прысутныя славілі Бога і гаварылі: „Вялікі Прарок паўстаў між намі, і Бог адведаў народ Свой.“

І разыйшлося слова гэтае аб Ім ня толькі ў Галілеі, дзе было створана чуда, але і па ўсёй Юдэі.

## 29. Заклік да спрацованых і гаротных.

Мат. XI, 25—30.

Ісус Хрыстос прыйшоў абвясьціць Евангельле праўды ўсім людзям — багатым і бедным, адукаваным



Заклік да спрацованых і гаротных.

і простым, шчасьлівым і бяздольным. Аднак неаднолькава сэрцы слухачоў адкрыты для слова Божага. Людзі простыя і ўбогія, абцяжаныя горам і працаю мо' хутчэй за мудрых і шчасьлівых нясуць, падобна да

дзяцей, адкрытае сэрца і веру, каб успрыняць слова Божае. Вось да такіх-то людзей і зьвярнуў аднаго разу свой заклік Ісус Хрыстос, кажучы: „Прыйдзеце да Мяне ўсе спрацованыя і гаротныя, і Я заспакою вас. Вазьмеце ярмо Маё на сябе і навучэцеся ад Мяне, бо Я ціхі і пакорны сэрцам, і знойдзеце спакой душам вашым, бо ярмо Маё добрае і цяжар Мой лёгкі".

Увесь цяжар запаведзяў Хрыстовых зьмяшчаецца ў гэткіх словах Яго: **„Ва усім, як хочаце, каб з вамі абыходзіліся людзі, так і вы абыходзьцеся з імі"**. Гэтае ярмо дасьць запраўдны спакой усім, хто нясе яго.

## 30. Ісус Хрыстос пасылае Апосталаў на пропаведзь.

Мат. X, 5—42; Мр. VI, 7—13; Лук. IX, 1—6.

Ісус Хрыстос ня мог абыйсьці Сам усе куты Свае краіны, таму паслаў Апосталаў абвясьціць, што „ўзапраўды паслаў Гасподзь збаўленьне людзям Сваім". Выпраўляючы Апосталаў, Ісус Хрыстос даў ім загад не хадзіць да паганцаў і самаранаў, а толькі „да гінучых авечак дому Ізраілевага", і ня браць з сабою нічога ў дарогу, бо той, „хто працуе, варты ёсьць жыўленьня" ці хлеба. „Хто прыймае вас — кажа — прыймае Мяне, а хто прыймае Мяне, той прыймае Паслаўшага Мяне". Каб людзі паверылі іх пасольству, Ісус Хрыстос даў Апосталам сілу чудоўна аздараўляць хворых, васкрашаць памёршых і выганяць бесаў; гэты дар — кажа — „вы дарма атрымалі, таму дарма і давайце". «Асьцерагайцеся — кажа — людзей, бо яны будуць аддаваць вас на суд і ў сынагогах сваіх будуць біць вас. І будзеце ненавіджаны за Імя Маё, але «Хто церпіць да канца, той спасёны». «Я пасылаю вас, як авечак сярод ваўкоў, але будзьце мудрымі, як зьмеі і простымі (лагоднымі), як галубы». «Тыя, хто хочуць быць Маімі пасьлядоўнікамі, павінны зрачыся ўсяго, узяць хрэст свой і йсьці за Мною: хто не бярэ храста Свайго і ня йдзе за Мною, той Мяне ня варты». «Усякага, хто вызнае Мяне перад людзьмі, Я вызнаю перад Айцом Маім нябесным».

Апосталы, атрымаўшы гэты наказ, пайшлі па двох і ўсюды прапаведвалі пакаяньне; выганялі бесаў; многіх хворых мазалі алеем і яны аздараўляліся.

## 31. Сьмерць Іоанна Хрысьціцеля.

Мат. XIV, 6—12; Мрк. VI, 21—29.

Аднаго разу Ірад Анціпа сьвяткаваў урачыста дзень свайго нараджэньня. У палацы было гучна і весела. Падчас банкету ў салю ўвайшла Саламія, дачка Ірадзіады (ад першага яе мужа), і пачала танцаваць. Танцы яе вельмі спадабаліся гасьцём і самому Іраду, і ён, у захопленьні, з кляцьбой сказаў Саламіі: „Прасі ў мяне, чаго хочаш, і я дам табе нават да палавіны майго царства". Дзяўчына выйшла і спыталася ў сваёй маці, чаго прасіць. Ірадзіада думала нядоўга: найбольшым падаркам была-б сьмерць яе няўмольнага высьвядчальніка Іоанна Хрысьціцеля. Вось яна і кажа Саламіі: „Прасі галаву Іоанна Хрысьціцеля", і пры гэтых словах дала дачцэ сваёй паўмісак. Саламія ўзяла паўмісак, увайшла з ім у салю і сказала цару: «Хачу, каб зараз-жа даў мне на гэтым паўміску галаву Іоанна Хрысьціцеля». Цар засмуціўся, бо вельмі паважаў Іоанна, але адмовіць дачцэ ня мог дзеля кляцьбы і каб не сароміцца перад гасьцямі. І загадаў Ірад свайму збраяносцу пайсьці ў вастрог і прынясьці галаву Іоанна Хрысьціцеля. Кат — зброяносец хутка споўніў загад цара — адсёк главу і — акрываўленую — прынёс яе на паўміску ў палац і падаў Саламіі. Тая ўзяла і аддала матцы сваёй. Так скончылася жыцьцё Іоанна Хрысьціцеля, аб якім Ісус Хрыстос сказаў, што спаміж народжаных жанчынамі няма ніводнага прарока, большага за яго.

Вучні Іоанна Хрысьціцеля, пачуўшы аб яго мучаніцкай сьмерці, прыйшлі, узялі яго цела і пахавалі. І пайшлі паведаміць аба ўсім Ісуса Хрыста.

Адсячэньне галавы Іоанна Хрысьціцеля Праваслаўнаю Царквою сьвяткуецца 29 жніўня ст. ст.—11 верасьня нов. ст.

## 32. Чудоўнае насычэньне Ісусам Хрыстом пяцёх тысячаў людзей.

Мат. XIV, 13—21; Лук. IX. 12—17; Іоан. VI, 1—14.

Аднаго разу пайшоў Ісус Хрыстос у нейкае пустыннае месца, каб там адпачыць. Але за Ім пайшло многа людзей: народ бачыў вялікія чуды, якія Ісус Хрыстос тварыў над хворымі, і жадаў паслухаць слова Яго. Надходзіў вечар, а там хутка і ноч. Ісус

Хрыстос ўсё яшчэ вучыў народ, які не хацеў расхадзіцца. Тады занепакоеныя вучні кажуць Ісусу: „Месца тут бязьлюднае, а час позны: адпусьці народ, каб ён мог пайсьці ў блізкія вёскі пераначаваць і купіць сабе хлеба“. На гэта Гасподзь адказаў вучням: „Вы дайце ім есьці“. Вучні сказалі: «У нас тут толькі пяць хлебаў і дзьве рыбы, але-ж што гэта для такога мноства людзей?». Тады Ісус Хрыстос загадаў вучням рассадзіць народ на траве радамі па 50 і 100 чалавек і падрахаваць усіх. І зрабілі так, і рассадзілі усіх. Аказалася каля пяцёх тысячаў чалавек, ня лічачы жанчын і дзяцей. Калі ўсе селі, Гасподзь узяў пяць хлебаў і дзьве рыбы, і паўзіраўшыся ў неба, багаславіў іх, паламаў і даў вучням, каб раздалі народу. І елі ўсе людзі і насыціліся, і яшчэ сабралі вучні недаедкаў 12 поўных кашоў.

Людзі, захопленныя чудам, якое стварыў Ісус Хрыстос, казалі: „Гэта ўзапраўды Той Прарок, Які павінен прыйсьці ў сьвет“.

Даведаўшыся, што хочуць прыйсьці, неўспадзеўкі ўзяць Яго і абвясьціць царом, Ісус Хрыстос адаслаў ад Сябе Апосталаў і адыйшоўся на гару Адзін, каб памаліцца.

## 33. Хаджэньне Ісуса Хрыста па вадзе.

Мат. XIV, 24—33; Мрк. VI, 47—52; Іоан. VI, 16—21.

Апосталы, па загаду Вучыцеля, паехалі чоўнам на другі бок возера. Рабілася цёмна. Дзьмуў моцны вецер. Возера было вельмі неспакойнае. Вялікія хвалі білі па баках чоўна і кожную мінуту пагражалі затапіць яго. Апосталы выбіліся з апошніх сілаў, бо цэлую ноч змагаліся з грознай навалай. Раптам—гэта было ўжо на сьвітаньні — яны ўбачылі Госпада, Які ішоў да іх па вадзе, як-бы па зямлі. Спачатку яны падумалі, што гэта — здань і ад страху пачалі крычаць. Але Ісус Хрыстос прамовіў да іх: „Ня бойцеся, гэта Я“. Апостол Пётр, пачуўшы голас свайго Вучыцеля, кажа Яму: „Калі гэта Ты, Госпадзі, дык пазволь мне прыйсьці да Цябе па вадзе“. Гасподзь адказаў: „Ідзі“! І выйшаўшы з чаўна, Пётр пайшоў па вадзе, каб падыйсьці да Ісуса, але збаяўшыся ветру, пачаў тануць і закрычаў: „Госпадзі, спасі мяне!“ Ісус пра-

цягнуў да яго руку, падтрымаў і сказаў: „Малаверны, навошта ты сумляваешся?“ Калі яны ўвайшлі ў човен, вецер адразу сьціх. Зьдзіўленыя і перапалоханыя вучні



Хаджэньне Ісуса Хрыста па вадзе.

пакланіліся Ісусу і выклікнулі: „Узапраўды Ты Сын Божы“.

Хутка човен прыстаў да берагу. Даведаўшыся вакалічныя жыхары пачалі на пасьцелях прынасіць да Ісуса Хрыста хворых і прасілі, каб пазволіў дакрануцца хоць-бы да краю Яго адзеньня: і каторыя дакраналіся, вылечваліся, — вылечваліся па веры сваёй.

## Трэці год служэньня Ісуса Хрыста.

### 34. Гутарка аб тым, што апаганьвае чалавека.

Мат. XV, 1—20; Мрк. VII, 1—23.

На трэцьцю Пасху Ісус Хрыстос не хадзіў у Ерусалім. Фарысэі самі прыйшлі да Яго, бо сачылі за Ім. Аднаго разу, убачыўшы, што вучні Ісуса Хрыста ядуць хлеб няўмытымі рукамі, фарысэі пачалі карыць Ісуса Хрыста, бо старадаўныя паданьні, якія былі законам для фарысэяў, вымагалі захоўваць знадворную чыстату, г. знач. чыстату рук падчас яды, чыстату кубкаў, місак, гаршкоў, лавак і т. д. Хрыстос на гэтыя закіды адказаў ім: „Вы пакінулі закон Божы, і трымаецеся паданьняў чалавечых. Добра прадказваў аб вас прарок Ісайя, кажучы ад імя Божага: „Людзі гэтыя шануюць Мяне толькі вуснамі сваімі, сэрца-ж іх далёка ад Мяне". І паклікаўшы ўвесь народ, які чакаў паслухаць слова Яго, навучаў так: „Слухайце Мяне і разумейце: апаганьвае чалавека ня тое, што ўваходзіць у вусны, а тое, што выходзіць з іх: бо-ж знутры, ад сэрца чалавечага выходзяць злыя помыслы, гордасьць, бязумства, злосьць, чужаложніцтва, забойства, кражы; вось усялякае такое і падобнае зло апаганьвае чалавека, а есьці няўмытымі рукамі—не апаганьвае".

### 35. Ап. Пётр спаведуе сваю веру ў Ісуса Хрыста, як Сына Божага. Прароцтва Госпада аб Сваіх хрэсных муках.

Мат. XVI, 13-28; Мрк. VIII, 27—38; Лук. IX, 18—27.

Аднаго разу Ісус Хрыстос спытаўся ў Сваіх вучняў: „За каго прыймае Мяне народ?" Яны адказалі: «Адныя за Іоанна Хрысьціцеля, іншыя за Ільлю; другія-ж кажуць, што ўваскрос адзін з старадаўных пра-

рокаў". Тады Ісус Хрыстос кажа: „А вы за каго лічыце Мяне?" Ад Імя ўсіх Апосталаў адказаў, як заўсёды першым — гарачы Сіман: „Ты — Хрыстос, Сын Бога Жывога". Гасподзь тады кажа Сіману: «Ты шчасьлівы, што ведаеш гэту вялікую тайну, якую аднак уявіў сабе не па сваім чалавечым розуме, а як адкрытую табе Айцом Нябесным Я кажу табе: ты — Пётр, і на гэтым камені Я збудую Царкву Маю, і вароты аду не перамогуць Яе".

Першая аснова, першы вуглавы камень ёсьць Сам Ісус Хрыстос, чаму і называе Царкву „Сваёю": „Збудую Царкву Маю". Бяз Ісуса Хрыста—Сына Бога Жывога — няма Царквы. Ап. Пётр першы з Апосталаў дазнаў гэту праўдзівую падставу і таму першы пачаў на ёй будаўніцтва Царквы, выявіўшы сваю цьвёрдую, як камень, веру. Бяз веры ў Ісуса Хрыста, Сына Бога Жывога, Які прынёс на зямлю збаўленьне людзям ад грахоў і адчыніў уваход у Царства Нябеснае, ніхто ня можа быць удзельнікам ці будаўнічым Царквы Хрыстовае. Закладзеная на жывой веры, падобнай да спаведаньня Пятра, Царква Хрыстова будзе непарушна да канца сьвету і ніякія варожыя сілы ня зьнішчаць яе.

Далей Гасподзь, зварочваючыся да Пятра — першага з Апосталаў, які ўрачыста ад іх і свайго Імя выспаведаў веру ў Божую годнасьць Ісуса Хрыста, сказаў: „І дам табе ключы Царства Нябеснага, і што ты зьвяжаш на зямлі, тое будзе зьвязана на небе, і што разьвяжаш на зямлі, тое будзе разьвязана на небе". Гэтымі словамі Ісус Хрыстос ня вызначыў ап. Пятру нейкага верхаводзтва ў Царкве або нейкай асаблівай улады яго над іншымі Апосталамі. Права даравацъ ці не даравацъ — Імем Божым—грахі людзям, — права дапускаць ці не дапускаць у Царства Нябеснае (гэта іменна разумеецца пад „ключамі" Царства) была дадзена Господам крыху пазьней усім Апосталам у такіх словах: „Узапраўды кажу вам: што вы зьвяжаце на зямлі, будзе зьвязана на небе, і што разьвяжаце на зямлі, будзе разьвязана на небе" (Мат. XVIII, 18), і таксама ўрачыста сьцверджана па ўваскрасеньні Хрыстовым, калі Гасподзь сказаў: „Прыйміце Духа Сьвято-

га: каму адпусьціце грахі, таму будуць адпушчаны, і на кім пакінеце, на тым застануцца" (Іоан. XX, 21—23). Ап. Пётр першы з Апосталаў атрымаў гэтае права. Пасьля Апосталаў гэтае права ва ўсёй паўнаце належыць сусьветнай Царкве Хрыстовай, у асобах Яе пастыраў.

Забараніўшы вучням Сваім распаўсюджваць, што Ён ёсьць Сын Божы, Ісус Хрыстос ужо ня прыповесьцямі, а адкрыта пачаў выясьняць ім, што Яму трэба йсьці ў Ерусалім, многа выцярпець мук ад начальнікаў і старэйшынаў народных, напасьледак быць павешаным на храсьце і на трэці дзень уваскрэснуць. Гаварыць аб гэтым было вельмі патрэбным, каб прыгатовіць вучняў. Яны не дапускалі і думкі, што Хрыстос, Сын Божы, мог пацярпець і памёрці. Толькі тым і тлумачыцца, чаму ап. Петр, выслухаўшы гэта, пачаў маліць Яго: «Барані, Божа! хай ня будзе гэтага з Табою, Госпадзі!» Пётр казаў гэта ціха, адклікаўшы Госпада ў бок, каб ніхто ня чуў, але Хрыстос, зьвярнуўшыся да ўсіх Апосталаў, голасна і строга сказаў Пятру: «Адыйдзі ад Мяне, шатан! Ты Мяне спакушаеш! бо ты думаешь не аб тым, што Божае, але што чалавечае». Рада ап. Пятра Ісусу Хрысту ўхіліцца ад хрэсных мукаў і сьмерці была ад неразуменьня таго дзела, дзеля якога Ісус Хрыстос, Сын Божы, прыйшоў у сьвет. Яна напомніла Ісусу Хрысту спакушэньне д'ябла ў пустыні, чаму Ён з такім дакорам і адкінуў угаворваньне Пятра.

Пасьля гэтага, паклікаўшы да Сябе вучняў, Господзь сказаў: «Калі хто хоча йсьці за Мною, няхай адрачэцца ад самога сябе, вазьме хрэст свой і йдзе за Мною. Бо хто хоча душу сваю ўратаваць, той загубіць яе, а хто загубіць душу сваю дзеля Мяне, той уратуе яе. Бо якая карысьць чалавеку, калі ён здабудзе увесь сьвет, а душы сваёй пашкодзіць? Або які выкуп дасьць чалавек за душу сваю? Бо прыйдзе Сын Чалавечы ў славе Айца Свайго з Ангеламі Сваімі, і тады адплаціць кожнаму паводле яго паступкаў».

## 36. Услаўленьне Ісуса Хрыста на гары Фавор.

Мат. XVII, 2—13; Мр. IX, 2—13; Лук. IX, 28—36.

Вучні Хрыстовы не маглі дапусьціць і думкі, што іх Вучыцель можа няслаўна памёрці на храсьце. Яны яшчэ не разумелі тайны збаўленьня роду чалавечага



Услаўленьне Ісуса Хрыста на гары Фавор.

праз Сына Божага, пасланага на зямлю. Яшчэ ня выяўлена была перад імі Божая годнасьць Ісуса Хрыста. Таму патрэбны быў асаблівы знак, каб паглыбіць і ўзмацаваць іх веру. Такі знак і быў дадзены Апосталам незадоўга перад хрэснымі мукамі Ісуса Хрыста.

Дзён праз восем пасьля спаведваньня Пятра Ісус Хрыстос узяў яго, Іоанна і Якава і ўзышоў з імі на гару Фавор памаліцца. Пакуль Ён маліўся, вучні, зморaныя, заснулі. «І сталася, як Ён маліўся, выгляд аблічча Яго зьмяніўся: твар Яго зіхацеў, як сонца, і вопратка Яго сталася белая, блішчастая, як сьнег». І было пры Ім двое людзей, у тым жа зьзяньні Славы Яго. Гэта былі Майсей і Ільля. Яны гаварылі з Госпадам аб сьмерці, якая чакала Яго ў Ерусаліме. Калі вучні прабудзіліся, яны былі вельмі зьдзіўлены ўсім відзеным. Але вось Майсей і Ільля пачалі адыходзіць ад Ісуса Хрыста. Пётр тады выкрыкнуў: «Настаўнік! добра нам быць тут: зробім тры палаткі: адну Табе, адну Майсею і адну Ільлі. Хрыстос не адказаў на гэта ні слова, бо Пётр ня ведаў, што гаварыў. Раптам зьявіўся вобалак і агарнуў Апосталаў; і перапалохаліся, як увайшлі ў вобалак. Але вобалак пакрыў іх так, што яны маглі бачыць Госпада. Ён заставаўся ўжо Адзін, — заставаўся вышэй воблака ў зьзяньні Славы Яго. І пачулі яны голас з неба гаворачы: „Гэта ёсьць Сын Мой ўлюблёны: Яго слухайце». Апосталы зразумелі, што гэта быў голас Бога, бо такія самыя словы чуў Іоанн Хрысьціцель падчас хрышчэньня Госпада. Перапалоханыя Апосталы ўпалі на зямлю, закрыўшы свой твар. Але вось праз хвіліну падходзіць да іх Ісус Хрыстос і кажа: «Ўстаньце і ня бойцеся!» Яны ўсталі. Воблака ужо ня было. Перад імі стаяў іх Вучыцель у тым самым выглядзе і ў той самай вопратцы, у якой яны заўсёды бачылі Яго. Калі ўсе яны сходзілі з гары, Ісус Хрыстос забараніў ім расказваць аба ўсім відзеным, пакуль не паўстане з мёртвых.

Праваслаўная Царква ўспамінае гэтае ўслаўленьне ў сьвята Спаса 6—19 жніўня.

### Трапар сьвята.

Преѡбразилсѧ єси на горѣ, Хрⷭ҇тѐ Бж҃е, показавый оучени́кѡмъ Твоимъ славꙋ Твою, ꙗкоже можахꙋ: да возсїѧетъ и намъ грѣшнымъ свѣтъ Твой присносꙋщ-

**ный, молитвами Бгородицы, Светодавче, слава Тебе.**

**Ты зьмяніў вобраз Свой на гары, Хрысьце Божа, паказаўшы вучням Тваім славу Тваю, колькі маглі яе ўспрыняць. Хай і нам, грэшным, па малітвах Багародзіцы, зазьзяе сьвятло Твaё вечнае. Святладаўча, слава Табе.**

## 37. Вучэньне Ісуса Хрыста аб пакорнасьці і дараваньні крыўдаў.

Мат. XVIII, 1—35; Мр. IX, 33—50; Лук. IX, 46—48.

Між Апосталамі аднаго разу ўзьнялася спрэчка, хто з іх найбольшы. Ісус Хрыстос, бачачы іх помыслы, сказаў ім: «Хто з вас хоча быць першым, хай будзе з усіх апошнім і ўсім слугою». І ўзяўшы малое дзіця, паставіў яго перад Сабою і сказаў ім: «Праўду кажу вам: калі не пераменіцеся і ня станеце, як дзеці, ня ўвойдзеце ў Царства нябеснае. Бо хто ўмаліцца, як гэтае дзіця, той будзе найбольшы ў Царстве нябесным. І хто прыйме гэтае дзіця ў Імя Маё, той Мяне прыйме, а хто прыйме Мяне, той прыйме Паслаўшага Мяне. А хто спакусіць аднаго з такіх малых, веруючых у Мяне, таму лепш было-б, каб павесілі яму на шыю камень мельнічны і ўтапілі ў бяздоньні мора. Глядзеце-ж, не пагарджайце ніводнага з такіх малых, бо Ангелы іх у нябёсах заўсёды бачаць Твар Айца Майго нябеснага".

Неяк Ап. Пётр спытаўся ў Ісуса Хрыста: „Колькі разоў дараваць брату майму, які грашыць супроць мяне?" Ісус Хрыстос адказаў яму: „Не да сямёх, а да семдзесят разоў па сем", і вытлумачыў гэта прыповесьцю, як адзін даўжнік, якому цар дараваў яго вялікі доўг, адмовіўся дараваць малы доўг свайму прыяцелю, праз што той быў укінуты ў вастрог. Цар, калі даведаўся аб гэтым, паклікаў да сябе жорсткага даўжніка і кажа яму: «Злы раб! я дараваў табе ўвесь доўг, бо ты прасіў мяне. Ці не павінен быў ты дараваць свайму прыяцелю? І раззлаваўся цар і загадаў перадаць яго мучыцелям, пакуль не заплаціць усяго доўгу».

Скончыўшы гэту прыповесьць, Ісус Хрыстос дадаў: „Так і Айцец Мой нябесны абыдзецца з вамі, калі ня выбачыць кожны з вас, ад сэрца свайго, брату свайму грахоў яго».

## 38. Аб судзе царкоўным і малітве грамадзкай.

Мат. XVIII, 15—20.

Ісус Хрыстос так навучаў Сваіх вучняў: „Калі саграшыць супроць цябе брат твой, пайдзі і дакары яго сам—на—сам: калі паслухае цябе, дык ты здабыў брата свайго. Калі ж не паслухае, дык вазьмі з сабою аднаго ці двох сьведкаў; калі-ж і іх не паслухае, скажы Царкве; а калі і царквы не паслухае, дык хай будзе для цябе, як паганін і мытнік. Узапраўды кажу вам: «што вы зьвяжаце на зямлі, тое будзе зьвязана на небе, а што разьвяжаце на зямлі, будзе разьвязана на небе".

„Таксама кажу вам, што калі двое з вас згодзяцца на зямлі прасіць аб якой—колечы патрэбе, дык усё, чаго-б яны ні папрасілі, будзе ім ад Айца Майго нябеснага. Бо дзе двое ці трое зыйшліся ў імя Маё, дык Я там сярод іх".

## 39. Грэшніца перад судом Ісуса Хрыста.

Іоан. VIII, 1—11.

Падчас сьвята „кушчаў",*) або палатак, Ісус Хрыстос быў у Ерусаліме і вучыў народ. І вось аднаго разу кніжнікі і фарысэі прыводзяць да Яго ў храм жанчыну, злоўленую на чужаложстве. Паставіўшы яе пасярэдзіне, яны сказалі Ісусу Хрысту: „Настаўнік! гэта жанчына злоўлена на чужаложстве. Закон Майсея загадвае пабіваць гэтакіх каменьнем. Ты што на гэта скажаш?" А казалі яны гэта спакушаючы Яго, каб знайсьці што-колечы дзеля абвінавачаньня Яго. Господзь, нічога не адказваючы, нагнуўся нізка і пачаў нешта пісаць пальцамі на зямлі. Але яны не пе-

---

*) На ўспамін 40-гадовага падарожнічаньня яўрэяў у пустыні Сінайскай.

раставалі настойліва дапытвацца Яго. Напасьледак Хрыстос, падняўшыся, сказаў ім: „Хто з вас бязгрэшны, хай першы кіне камень у яе“, і зноў нагнуўшыся



Грэшніца перад судом Ісуса Хрыста.

пісаў на зямлі. Яны ўсе, пачуўшы гэта і дакораныя сумленьнем, павыходзілі адзін за адным, пачынаючы ад старшых аж да апошніх. Застаўся адзін Ісус і жан-

чына, што стаяла пасярэдзіне. Тады Ісус Хрыстос, падняўшыся і ня бачачы нікога, апрача жанчыны, сказаў ёй: „Жанчына! дзе твае абвініцелі? Ніхто з іх не асудзіў цябе?“ — Яна адказала: „Ніхто, Госпадзі!“ Ісус тады сказаў ёй: „Я не асуждаю цябе: ідзі і больш не грашы“.

Гасподзь не даравäў грэшніцы яе грэх, бо калі-б даравäў, дык сказаў бы: «даруюцца табе грахі твае“, як казаў у іншых выпадках.

„Ідзі і больш не грашы“ значыць: калі ня будзеш больш грашыць, дык ня будзеш адказваць і за ранейшыя свае грахі; калі-ж йзноў пачнеш грашыць, дык будзеш пакарана і за грахі, за якія раней ня была асуджана.

## 40. Чудоўнае аздараўленьне сьляпога ад нараджэньня.

Іоан. IX, 1—41.

Неяк, выходзячы з храму, Гасподзь спаткаў сьляпога ад нараджэньня. Плюнуўшы на зямлю, Гасподзь зрабіў з сьліны балота, памазаў ім вочы сьляпому і сказаў: „Пайдзі, умыйся ў купальні Сілаам“. Той пайшоў, умыўся і стаў бачыць.

Гэта было ў суботу. Між фарысэямі пачалася спрэчка аб Ісусе Хрысьце: адны абураліся, чаму Ён не захоўвае сьвятасьці суботы, іншыя хацелі дайсьці, якою сілаю творыць чуды. Паклікалі бацькоў, каб даведацца, як сталася, што іх сын стаў відучым. Напасьледак спыталіся ў самога аздароўленага, кажучы: „Аддай славу Богу: мы ведаем, што Чалавек Той грэшнік“. — „Ці Ён грэшны, ня ведаю, — адказаў аздароўлены, — а ведаю толькі, што я быў сьляпы, а цяпер бачу. Калі-б Ён ня быў ад Бога, дык ня могбы нічога тварыць». Пачуўшы гэта, Гасподзь сказаў аздароўленаму: «Ці верыш ты ў Сына Божага?“ Той жа адказаў: «А хто Ён, Госпадзі, каб мне верыць у Яго?“ Ісус сказаў яму: «І ты бачыў Яго, і Той, што гаворыць з табою — гэта Ён“. — Тады аздароўлены сказаў: „Верую, Госпадзі“, і пакланіўся Яму.

## 41. Прыповесьць аб міласэрным Самараніне.

Лук. X, 25—37.

Адзін законьнік, спакушаючы Ісуса Хрыста, спытаўся: „Вучыцель! што мне рабіць, каб насьледаваць жыцьцё вечнае?“ Гасподзь, замест адказу, Сам запытаўся ў яго: „У законе што напісана? як чытаеш?“ Ён сказаў: «Узьлюбі Госпада Бога твайго ўсім сэрцам



Прыповесьць аб міласэрным Самараніне.

тваім, і ўсёю душою тваёю, і ўсёю сілаю, і ўсім разуменьнем тваім, і бліжняга твайго, як самога сябе“.— Ісус сказаў яму: „праўдзіва ты адказаў; так рабі надалей і будзеш жыць“. Тады законьнік, хочучы апраўдаць сябе, сказаў Ісусу: «А хто мой бліжні?» У ад-

каз на гэтае пытаньне Ісус Хрыстос сказаў такую прыповесьць.

„Нейкі чалавек ішоў з Ерусаліму ў Ерыхон і папаўся разбойнікам, каторыя зьнялі з яго вопратку, ранілі яго і пайшлі, пакінуўшы яго на дарозе ледзь жывым. Але вось—здарылася— ішоў тою дарогаю адзін сьвяшчэньнік. Ён бачыў няшчаснага, аднак прайшоў міма. Таксама і лявіт, быўшы на тым месцы: падыйшоў, паглядзеў і прайшоў міма. Самаранін-жа нейкі, ідучы, угледзіў яго і зьлітаваўся: перевязаў яму раны, памазаў алеем і віном, пасадзіў яго на свайго асла і прывёз ў заезд, і паклапаціўся аб ім. А на другі дзень, ад'яжджаючы, выняў два дынары, даў гаспадару заезду і сказаў яму: „Даглядай яго і, калі выдасі што балей, я, вярнуўшыся, аддам табе".

Пасьля гэтага Ісус Хрыстос спытаўся ў законьніка: „Як ты думаеш, хто з гэтых трох быў бліжні таму, што папаўся разбойнікам?" — Ён сказаў: „Той, што зьлітаваўся над ім". Тады Ісус Хрыстос сказаў яму: „Ідзі і ты рабі гэтак".

## 42. Ісус Хрыстос адведвае сям'ю Лазара.

Лук. X, 38—42.

Ведаючы, што ня прыйшоў яшчэ час і што было небясьпечна заставацца ў Ерусаліме, Ісус Хрыстос з вучнямі Сваімі пакінуў горад і пайшоў у Віфанію — вёску недалёка ад Ерусаліму, на працілежным схіле гары Элеонскае. У Віфаніі жыў з сваімі дзьвюма сёстрамі, Марфай і Марыяй, Лазар, якога Гасподзь называў Сваім другам. Да іх вось і зайшоў цяпер Ісус Хрыстос з Сваімі спадарожнікамі. Старшая сястра Марфа пачала клапаціцца, каб пачаставаць гасьцей, а малодшая Марыя села ля ног Ісусавых і слухала словы Яго. Заклапочаная, Марфа ўзбурылася на сястру і, зьвярнуўшыся да Госпада, сказала з дакорам: „Госпадзі! ці ж Цябе не ўзрушае, што сястра мая адну мяне пакінула прыслужваць?

Скажы ёй, каб памагла мне". Ісус-жа адказаў ёй: ,,Марфа! Марфа! ты шмат непакоішся і клапоцішся аб многім, а тым часам адно толькі ёсьць на патрэ-



Ісус Хрыстос адведвае сям'ю Лазара.

бу. Марыя-ж выбрала добрую часьць, якая не аднімецца ў яе".

З Віфаніі Гасподзь пайшоў у Галілею.

## 43. Прыповесьць аб хцівым гаспадару.

Лук. XII, 13—31.

Адзін з слухачоў зьвярнуўся да Хрыста з такою просьбай: „Вучыцель! скажы брату майму, каб падзяліўся са мною спадчынай“. Гасподзь, які заўсёды адхіляў ад Сябе ўсялякія справы дзяржаўныя ці грамадзкія і які пры кожным выпадку падкрэсьліваў, што „Царства Маё ўнутры вас ёсьць“, адказаў яму: „Хто паставіў Мяне судзіць ці дзяліць вас“? Пасьля гэтага, зьвярнуўшыся да народу, пачаў наагул гаварыць аб хціваcьці, на якую, відаць, хварэў той чалавек. „Сьцеражэцеся хцівасьці — кажа, — бо жыцьцё чалавека не залежыць ад дастаткаў, якія мае“. І сказаў ім такую прыповесьць.

„Адзін багаты чалавек меў добры ўраджай у полі, і ён разважаў сам з сабою: што мне рабіць? Няма куды злажыць дабро маё. Хіба вось што зраблю: разьбяру гумны мае і пабудую большія, і зьбяру туды ўвесь хлеб мой і ўсё дабро маё. І скажу душы маёй. душа! шмат дабра ляжыць у цябе на многія гады: еш, пі, весяліся“. Але Бог сказаў яму: „Неразумны! У гэтую ноч душу тваю возьмуць у цябе: каму-ж дастанецца тое, што ты прыдбаў?“ „Так бывае з тым, — дадаў Гасподзь на заканчэньне прыповесьці, — хто зьбірае скарбы для сябе, а ня ў Бога багацее“.

І сказаў вучням Сваім: „Не клапацецеся дзеля душы вашай, што вам есьці, ні дзеля цела, у што апрануцца: душа большая за ежу, і цела — за адзежу. Усяго гэтага шукаюць людзі гэтага сьвету: ваш жа Айцец ведае, што вам гэтае патрэбна. **Перш за ўсё шукайце Царства Божага, а тое ўсё прыдасца вам**“.

## 44. Прыповесьць аб знойдзенай авечцы і блудным сыне.

Лук. XV, 3—7, 11—32.

Фарысэі, якія хваліліся, што ведаюць Закон, хаця і не разумелі яго, — часта дакаралі Хрысту, што Ён прыймае грэшнікаў і есьць з імі. Гасподзь на гэ-

тыя закіды адказваў ім прыповесьцямі.

„Хто з вас — кажа — маючы сто авечак і згубіўшы адну з іх, не пакіне дзевяцьдзесят дзевяць у пустыні і не пайдзе шукаць прапаўшае, пакуль не знайдзе яе? А знайшоўшы, вазьме яе на плечы свае з радасьцю, прынясе до хаты, пакліча прыяцялёў і суседзяў сваіх і скажа ім: „Пацешцеся са мною: я знайшоў маю прапаўшую аўцу“. Так, — сказаў Гасподзь, — і на нябёсах больш будзе радасьці з аднаго грэшніка, які каецца, чымся з дзевяцьдзесятдзевяцёх праведнікаў, што ня маюць патрэбы ў пакаяньні.

І яшчэ сказаў прыповесьць аб тым-жа. „У аднаго чалавека былі два сыны. І сказаў малодшы з іх айцу: „Айцец! дай належную мне часьць маемасьці“. Айцец выдзяліў яму ягоную часьць. Праз нейкі час малодшы сын, сабраўшы ўсё, пайшоў у далёкую краіну і там прагуляў маемасьць сваю, жывучы распусна. І здарылася, што калі пражыў усё, настаў вялікі голад у той краіне, і ён пачаў галадаць. Тады прыстаў да аднаго з жыхароў гэнае краіны, а той паслаў яго на поле сваё пасьвіць сьвіньні. І ён рад быў-бы наесьціся ражкоў, што елі сьвіньні, але ніхто не даваў яму. І апамятаўшыся сказаў сабе: „Колькі наймітаў у айца майго маюць лішку хлеба, а я паміраю ад голаду. Устану, пайду до айца майго і скажу яму: айцец! я саграшыў перад небам і перад табою, і ўжо няварты называцца сынам тваім: прыймі мяне, як аднаго з наймітаў тваіх“. Сказаўшы гэта, пайшоў да бацькі свайго. І калі ён быў яшчэ далёка, угледзіў яго айцец яго і зьлітаваўся, і пабегшы кінуўся яму на шыю і цалаваў яго. І сказаў слугам сваім: „Прынясеце найлепшую адзежу і апранеце яго, і дайце персьцень на руку яго і абутак на ногі. І прывядзеце кормнае цяпё і закалеце: будзем есьці і весяліцца“. І пачалі весяліцца. Старшы-ж сын яго быў у полі. Калі ён даведаўся, з якое прычыны айцец выдаў банкет, вельмі ўзлаваўся і не хацеў ўвайсьці ў хату. „Вось я столькі гадоў служу табе, — кажа ён бацьку, — а ты ніколі ня даў мне і казьляняці, каб павесяліцца мне з прыяцелямі маімі“. Ён-жа сказаў яму:

„Сын мой! ты заўсёды са мною і ўсё маё — тваё, а з брата твайго трэба было цешыцца і весяліцца, бо ён быў памёршы і ажыў, прападаў і знайшоўся“.

Гэтыя дзьве прыповесьці паказваюць, што міла-



**Прыповесьць аб блудным сыне.**

сэрны Бог гатовы ў кожную хвіліну прыняць шчырае каяньне грэшніка і цешыцца з таго так, як цешыцца гаспадар, які знайшоў прапаўшую авечку, або айцец, да якога вярнуўся яго распусны сын.

## 45. Прыповесьць аб багатым і ўбогім.

Лук. XVI, 19—31.

Господзь навучаў, каб людзі добрымі дзеламі падрыхтоўвалі сябе да жыцьця вечнага. Пасьля сьмерці кожнаму чалавеку будзе адплата па ўчынках яго. Страшнае пакараньне можа спаткаць у пасьмертным жыцьці таго багача, які ўжываў сваё багацьце толькі для прыемнасьцяў зямных, і наадварот — вялікая нагарода чакае таго бедака, які цярпліва і пакорліва зносіў на гэтым сьвеце пакуту ад жорсткасьці багача. Ісус Хрыстос вытлумачыў гэта ў такой вось прыповесьці.

Адзін чалавек быў багаты, раскошна апранаўся і раскошна кожны дзень банкетаваў. Другі-ж — на імя Лазар — быў убогі, увесь у струпох, ляжаў ля варот багача, і рад быў насыціцца хаця-б крышкамі, што падалі з стала багача; сабакі прыходзячы лізалі струпы яго. Памёр убогі і быў аднесены Ангеламі на лона Аўраамава. Памёр і багаты; будучы ў муках, падняў з пекла вочы свае, убачыў здалёк Аўраама і Лазара на лоне яго і, загаласіўшы, сказаў: „Айцец Аўраам! зьлітуйся нада мною і пашлі Лазара, каб хаця абмачыў канец пальца свайго ў вадзе і асьвяжыў язык мой, бо я мучуся ў полымі гэтым“. Але Аўраам сказаў: „Прыпомні, што ў жыцьці тваім меў ты добрае, а Лазар благое: цяпер-жа ён тут пацяшаецца, а ты церпіш вялікія мукі, — да таго-ж між намі прорва вялікая так што адгэтуль да вас або адтуль да нас перайсьці ня можна“. Тады багаты сказаў: „Дык прашу цябе, айцец, пашлі Лазара ў дом айца майго, хай засьведчыць братом маім, як я тут пакутую, каб яны ня прыйшлі ў гэтае месца мучэньня“. Аўраам адказаў: „У іх ёсьць Майсей і прарокі, няхай слухаюць іх“. Ён-жа сказаў: „Не, отча Аўрааме! Калі хто з памёршых прыйдзе да іх, дык пакаюцца“. Тады Аўраам адказаў: „Калі Майсея і прарокаў ня слухаюць, дык хаця-б хто з мёртвых уваскрос, не павераць“.

## 46. Апошняя падарожа Іісуса Хрыста у Ерусалім. Аздараўленьне 10 пракажаных.

Лук. IX, 51—56; XVII, 11—21.

Надыходзіла сьвята Пасхі, чацьвёртае з часу хрышчэньня Іісуса Хрыста. Гасподзь скіраваўся ісьці ў Ерусалім праз Самарыю, але Яго там не прынялі, бо па абліччы прызналі за юдэя. Узбураныя гэтым апосталы Якаў і Іоанн хацелі паслаць на тую вёску агонь з неба і зьнішчыць яе, як і Ільля зрабіў. Але Іісус Хрыстос забараніў ім рабіць гэта і сказаў: „Ня ведаеце, якога вы духа, бо Сын Чалавечы прыйшоў ня губіць душы людзкія, але спасаць“. І пайшлі праз другое сяло.

Дарогаю Іісус Хрыстос спаткаў дзесяцёх пракажаных, з якіх дзевяцёх былі юдэі, а адзін самаранін. Затрымаўшыся здалёк, яны моцным голасам пачалі прасіць: „Іісус Настаўнік! памілуй нас!“ Іісус Хрыстос сказаў ім: „Ідзеце пакажэцеся сьвяшчэньнікам“. Яны пайшлі і яшчэ дарогаю ачысьціліся ад праказы. Адзін з іх, бачачы, што паздаравеў, вярнуўся да Хрыста, пакланіўся Яму ў ногі і моцным голасам дзякаваў і славіў Бога. Гэта быў самаранін. Тады Іісус Хрыстос сказаў: „Ці ня дзесяць ачысьціліся? дзе-ж дзевяць? Яны ня вярнуліся аддаць славу Богу, апрача гэтага чужынца. І сказаў яму: „Устань, ідзі; вера твая спасла цябе“.

Спытаны-ж фарысэямі, калі прыйдзе Царства Божае, адказаў ім: „Ня прыйдзе Царства Божае відавочна, і ня скажуць: вось яно тут, ці вось там. Бо Царства Божае ўнутры вас ёсьць“, г. зн. яно не падобнае да зямных царстваў, якія імкнуцца забясьпечыць надворны дабрабыт і шчасьце людзей. Царства Божае творыцца сталым узвышэньнем духа чалавечага да Бога, жыцьцём па праўдзе і любові, згодна з законам Божым.

## 47. Прыповесьць аб мытніку і фарысэю.

Лук. XVIII, 9—14.

Сказаў Іісус Хрыстос такую прыповесьць, навучаючы людзей, як трэба маліцца Богу.

Два чалавекі ўвайшлі ў царкву памаліцца: адзін

фарысэй, а другі мытнік. Фарысэй, стоячы наперадзе, каб усе яго бачылі, маліўся гэтак: „Божа! дзякую Табе, што я не такі, як іншыя людзі: зьдзірцы, крыўдзіцелі, чужаложцы, або як гэты мытнік. Пашчуся два разы ў тыдзень, даю дзесяціну з усяго, што прыдбаю“.



Прыповесьць аб мытніку і фарысэю.

Лічачы сябе праведным, фарысэй не адчувае патрэбы маліцца аб сваіх грахох, і толькі горда выхваляе сябе перад іншымі людзьмі.

Мытнік-жа захоўваўся зусім інакш: стаўшы здалёк, ён не адважыўся нават падняць вачэй на неба,

але б'ючы сябе ў грудзі, гаварыў: „Божа, будзь міласьцівы да мяне грэшнага!“ Канчаючы гэтую прыповесьць, Ісус Хрыстос дадаў: „Кажу вам, што гэты пайшоў апраўданы болей, чымся той: бо ўсякі, хто сябе вывышшае, будзе паніжаны, а паніжаючы сябе ўзвысіцца“.

Гэтаю прыповесьцю Ісус Хрыстос паказаў нам, што Бог прыймае толькі малітву шчырую, якая йдзе ад сэрца, пакорную, калі чалавек сьвядомы сваіх грахоў і разлічвае дзеля спасеньня толькі на помач Божую; такая малітва ўзапраўды ўзнаўляе і ўзвышае душу і прыбліжае яе да Бога. А ёсьць малітва вонкавая, на паказ, гордая, калі чалавек, падобна да фарысэя, пэўны сябе, што ён праведны перад Богам, моліцца толькі, каб людзі бачылі і ўслаўлялі яго відочную праведнасьць. Такая малітва ня ёсьць запраўдная малітва. Яна не даходзіць да Бога. Яна выклікае жорсткасьць у сэрцы чалавека і адхіляе яго ад Бога.

## 48. Багаславеньне дзяцей.

Мат. XIX, 13—15; Мрк. X, 13—16; Лук. XV, 15—17.

Аднаго разу, калі Ісус Хрыстос вучыў народ, да Яго праціскаліся праз натоўп жанчыны з дзяцьмі, каб Ён дакрануўся да іх і ўсклаў на іх рукі. Вучні Яго, бачачы гэта, забаранялі ім, каб дзеці ня трывожылі Госпада. Але Ісус Хрыстос абурыўся на вучняў і, паклікаўшы дзяцей, сказаў: «Пусьцеце дзяцей прыходзіць да Мяне, і не забараняйце ім, бо гэткіх ёсьць Царства Божае. Запраўды кажу вам: хто ня прыйме Царства Божага, як дзіця, той не ўвайдзе ў яго». І абняўшы іх, усклаў на іх рукі і багаславіў іх.

Чым дзеці заслужылі ласку Госпада і абяцаньне Царства Божага? Толькі за свае чыстыя, беззаганныя сэрцы. І ўсякі, хто шукае Царства Божага, павінен мець, падобна да дзяцей, чыстае, незласьлівае сэрца.



Багаславенье дзяцей.

## 49. Гутарка Ісуса Хрыста з багатым юнаком і вучнямі аб багацьці.

Мат. XIX, 16—30; Мр. X, 17—31; Лук. XVIII, 18—27.

Падчас далейшае падарожы Ісуса Хрыста ў Ерусалім неяк падбег да яго адзін багаты юнак, упаў перад Ім на калені і сказаў: «Вучыцель добры! што мне рабіць, каб унасьледаваць жыцьцё вечнае?» Ісус адказаў яму: «Чаму кажаш Мне «добры?» Ніхто ня добры, адзін толькі Бог», і далей сказаў: «Калі хочаш увайсьці ў жыцьцё вечнае, выпаўняй запаведзі: не забівай, не чужалож, не крадзі, ня сьведч лжыва, паважай айца твайго, як самога сябе, і любі бліжняга твайго, як самога сябе». Юнак тады гаворыць Хрысту: «Усяго гэтага пільнаваўся я ад маладых лет маіх; чаго яшчэ не стае мне?» Ісус Хрыстос адказаў яму: «Яшчэ аднаго не стае табе: калі хочаш быць дасканальным, ідзі і ўсё, што маеш, прадай і раздай убогім, і будзеш мець скарб на небе. Тады прыходзь і ідзі за Мною». Юнаку трэ' было выбіраць між шчасьцем будучага вечнага жыцьця і ўцехамі гэтага зямнога жыцьця, якія забясьпечвала яму багацьце. Адно выключае другое. Ён ня меў у сабе сілы адмовіцца ад багацьця і таму, калі пачуў адказ Ісуса Хрыста, «засумаваў, бо быў надта багаты». Ісус, бачачы гэта, сказаў Сваім вучням: «Як трудна багатаму ўвайсьці ў Царства Божае». Вучні напалохаліся ад слоў Яго, бо мала ў жыцьці такіх багацеяў, якія ня былі-б прывязаны да свайго багацьця. Калі багацьце стаіць на перашкодзе, каб атрымаць збаўленьне, «дык хто-ж можа збавіцца?» — мімаволі выклікнулі вучні. Але Ісус сказаў ім: «Як трудна ўвайсьці ў Царства Божае тым, хто ўскладае надзею сваю на багацьце. Лягчэй карабельному гужу прайсьці праз голачнае вуха, чымся багатаму ўвайсьці ў Царства Божае». Чуючы гэта вучні йзноў спыталіся: «Хто-ж можа збавіцца?» Ісус Хрыстос сказаў: „Немагчымае ў людзей магчыма для Бога“. Гэта значыць, што слабому чалавеку трудна, з уласнага высілку, зрачыся багацьця і ўсіх прыемнасьцяў жыцьця, якія дае багацьце і якія адхі-

ляюць ад Бога. Толькі пры помачы Божай багаты чалавек можа даць належны ўжытак свайму багацьцю, калі яно пайдзе на дапамогу ўсім, хто пакутуе і абцяжаны горам, і не пашкодзіць асабістаму збаўленьню і насьледаваньню Царства Нябеснага.

Зрачыся багацьця і ўсіх прыемнасьцяў жыцьця— гэтае вымаганьне ставіцца Іісусам Хрыстом ня ўсім Яго пасьлядоўнікам, бо ня ўсе „могуць умясьціць“, а толькі тым, якія хочуць быць «дасканальнымі», г. зн. хто шукае вышэйшых ступеняў прыбліжэньня да Бога, Які ёсьць Сама Найвышэйшая Сьвятасьць і Удасканаленьне.

## 50. Аздараўленьне сьляпога.

Лук. XVIII, 35—43.

Калі Гасподзь, абкружаны народам, падыходзіў да Ерыхону, адзін сьляпы жабрак, пачуўшы, што міма яго ідзе Іісус Назарэй, закрычаў: «Іісусе, Сыне Давідаў! зьмілуйся нада мною». Пярэднія з натоўпу закрычалі на яго, каб маўчаў. Але ён яшчэ мацней крычаў: „Сыне Давідаў! зьмілуйся нада мною!“ Іісус затрымаўся, загадаў прывясьці яго да Сябе, і калі той падыйшоў да Яго, спытаўся: „Чаго ты хочаш ад Мяне?“ Той сказаў: „Госпадзі! каб мне бачыць“. Іісус сказаў яму: „Бач-жа! вера твая спасла цябе“. І ён у той-жа час пачаў бачыць і пайшоў за Ім, славячы Бога. І ўвесь народ, бачачы гэтае, аддаў хвалу Богу.

## 51. Васкрашэньне Лазара.

Іоан. XI, 1—46.

Недаходзячы да Ерусаліму, Іісус Хрыстос атрымаў вестку, што Лазар, Ягоны друг з Віфаніі, цяжка хворы. Вестку паслалі Хрысту сёстры Лазаравы Марфа і Марыя. Гасподзь не адразу пайшоў у Віфанію. Ён наўмысьля затрымаўся яшчэ на два дні ў тым месцы, дзе знайшлі Яго пасланыя, і сказаў Апосталам: «Гэтая хворасьць не на сьмерць, але на славу

Божую, каб уславіўся праз яе Сын Божы». Калі мінула два дні, Ісус Хрыстос кажа вучням: „Пойдзем у Юдэю. Лазар памёр, і Я рад за вас, што ня быў там, каб вы паверылі; але пойдзем да яго“.

Мінула ўжо чатыры дні ад дня пахаваньня Лазара, калі Ісус Хрыстос прыйшоў у Віфанію. Тут было



Васкрашэньне Лазара.

ло шмат жыдоў, якія папрыходзілі з Ерусаліму да Мары і Марфы, каб усьцешыць іх па брату. Марфа, пачуўшы, што ідзе Ісус, пайшла насустрэчу Яму і сказала: «Госпадзі! каб Ты быў тут, не памёр-бы брат мой. Але і цяпер ведаю, што чаго Ты папросіш у Бога, дасьць Табе Бог». Гасподзь адказаў ёй: «Уваскрэсьне брат твой». Марфа сказала: «Ведаю, што

ўваскрэсьне ў дзень уваскрасеньня, у апошні дзень». Але Ісус Хрыстос сказаў ёй: «Я ёсьць уваскрасеньне і жыцьцё: хто веруе ў Мяне, хоць і памрэ, жыць будзе. І ўсякі, хто жыве і веруе ў Мяне, не памрэ да веку. Ці верыш гэтаму?» Марфа кажа Яму: «Так, Госпадзі! Я верую, што Ты — Хрыстос, Сын Божы, што йдзе ў сьвет». Сказаўшы гэта, Марфа пайшла і цішком паклікала сястру сваю. Марыя ўстала і борзда пайшла да Ісуса. За ёю з дому выйшлі і жыды, якія ўцешалі яе. Угледзіўшы Ісуса, Марыя ўпала да ног Яго і сказала: «Госпадзі! каб Ты быў тут, не памёр-бы брат мой». Ісус, бачачы, што плача яна і плачуць жыды, якія прыйшлі з ёю, Сам затужыў духам і ўзварушыўся. Пасьля гэтага спытаўся, дзе палажылі нябожчыка. І калі прышлі на магілу, Ісус заплакаў. Магіла была звычайная пячора, заваленая каменем. Хрыстос загадаў, каб адкінулі камень. Перад тым, як увайсьці ў пячору, Марфа кажа: «Госпадзі! ужо сьмярдзіць, бо ўжо чацьвёрты дзень». Ісус кажа ёй: «Ці не казаў Я табе, што калі будзеш верыць, угледзіш славу Божую». Пасьля гэтых слоў Ісус ўзьвёў вочы ўверх і голасна сказаў: «Отча, дзякую Табе, што пачуў Мяне». Прадоўжыў-жа Гасподзь гэтую малітву так, каб Ягоны голас мог быць чутны толькі Апосталам і сёстрам Лазара: «Я ведаю, што Ты заўсёды чуеш Мяне, але сказаў гэта дзеля народу, які тут стаіць, каб паверылі, што Ты Мяне паслаў». Сказаўшы гэта, Ісус Хрыстос моцным, валадарным голасам паклікаў: „Лазар! выйдзі!“ І выйшаў памёршы з магілы, абкручаны пахавальнымі тканінамі, з павязаным хусткаю тварам. «Развяжэце яго і дайце хадзіць», загадаў Ісус Хрыстос.

Чуда гэтае зрабіла вялікае ўражаньне на народ. Многія з жыдоў, якія прыйшлі за Марыяй, бачачы, што ўчыніў Ісус, уверавалі ў Яго. А іншыя з іх пайшлі да фарысэяў і расказалі ім, што зрабіў Ісус у Віфаніі.

## 52. Змова начальнікаў юдэйскіх.

Іоан. XI, 46 57.

Вестка аб васкрашэньні Лазара вельмі ўзбурыла і занепакоіла ворагоў Хрыста. Архірэі і фарысэі бе-

задкладна склікалі сынэдрыён, г. зн. вышэйшае судзілішча. «Што нам рабіць?» паставілі яны пытаньне. „Гэты Чалавек творыць шмат чудаў. Калі ня зьвернем на гэта ўвагі, дык усе ўверуюць у Яго“. Яны баяліся, што народ, увераваўшы ў Хрыста, абвесьціць Яго Царом Ізраіля і паднімець паўстаньне супроць сваіх валадароў. А тады прыдуць рымскія легіёны, вазьмуць Ерусалім, зруйнуюць храм і самы горад і мо’ зальюць кроў‘ю ўсю землю: тады будзе канец і іхнаму панаваньню. Узьнялася ў сынэдрыёне гарачая спрэчка. Спыніў яе сваёю радаю архірэй Кайяфа. Ён сказаў: «Вы нічога не разумееце: ці ня лепш нам, каб адзін чалавек памёр за ўсіх людзей, чым увесь народ загінуў?» Інакш кажучы: трэба хутчэй забіць Хрыста, каб больш не тварыў чудаў ! не спакушаў народ, і будзе усё спакойна. Усе згадзіліся з прапазыкаю Кайяфы і пастанавілі забіць Хрыста. Ведаючы гэта і ведаючы, што «ня прыйшоў яшчэ час Яго», Гасподзь ня стаў пакуль паказвацца між імі і пайшоў адтуль у краіну ля пустыні ў горад, званы Эфраім, і там заставаўся з вучнямі Сваімі.

Блізка-ж была Пасха жыдоўская, і з усяго краю папрыходзіла ў Ерусалім шмат людзей, каб ачысьціцца. Усе толькі і гаварылі, што аб Хрысьце і створаных Ім чудах, і чакалі, ці ня прыйдзе Ён на сьвята. Архірэі-ж і фарысэі выдалі загад, каб кожны, хто даведаецца, дзе Хрыстос, данёс, каб Яго ўзяць.

### 53. Праракаваньне Ісуса Хрыста аб Сваіх хрэсных муках і сьмерці. Адказ Ісуса Хрыста на просьбу Саламіі і яе сыноў Якава і Іоанна.

Мат. XX, 17—28; Мрк. X, 32—45; Лук. XVIII, 31—34.

Падчас апошняе Свае падарожы з Эфраіму ў Ерусалім Ісус Хрыстос адклікаў 12 Сваіх Апосталаў і сказаў ім: «Вось уваходзім мы ў Ерусалім і зьдзейсьніцца ўсё, што напісана праракамі аб Сыне Чалавечым, бо выдадуць Яго першасьвяшчэньнікам і кніжнікам, і зьняважаць Яго, і аплююць Яго, і будуць біць і заб’юць Яго насмерць, і на трэці дзень ува-

скрэсне». Але Апосталы нічога з гэтага не зразумелі, хаця сэрца і адчула, што іх Вучыцелю пагражае якаясь небясьпека.

Калі агорнутыя сумам, моўчкі, троху воддаль ішлі вучні за Хрыстом, да Яго падыйшла Саламія з сваімі сынамі-апосталамі Якавам і Іоаннам. Хрыстос спытаўся, чаго яны хочуць. Спачатку Саламія за дзяцей, а пасьля і самі яны пачалі прасіць Госпада, каб Ён у Сваім Царстве пасадзіў іх аднаго з правага боку ад Сябе, а другога з левага боку, у славе Сваёй. Яны не разумелі яшчэ ўсяе тайны Царства Божага і, прадстаўляючы яго сабе на ўзор зямных царстваў, лятуцелі аб царскіх прастолах, царскіх каронах. «Ня ведаеце, чаго просіце», адказаў ім Хрыстос. «Ці можаце вы піць чашу, якую Я п'ю, і хрысьціцца хрэшчэньнем, якім Я хрышчуся?» [1]). Яны адказалі: «Можам.» Тады Ісус Хрыстос, ведаючы, што ў будучыні яны ўзапраўды прымуць за Яго мукі і сьмерць, папароцку сказаў ім: «Чашу, якую Я п'ю, будзеце піць і вы, таксама будзеце хрысьціцца хрышчэньнем, якім Я хрышчуся, але-ж даць сесьці ў Мяне па правы і левы бок — не ад Мяне залежыць, але каму прызначана Айцом Маім».

Паклікаўшы потым усіх іншых Апосталаў, якія, паміж іншым, былі вельмі абураны на Якава і Іоанна, Ісус Хрыстос пачаў навучаць іх аб Царстве Божым на зямлі, каб паказаць, як яны памыляюцца ў сваіх паглядах на гэтае Царства. «Між вамі — кажа— хай ня будзе так, як у зямных валадароў», у якіх адныя пануюць, а другія служаць: «Хто хоча быць большым між вамі, хай будзе вам слугою, а хто хоча быць першым між вамі, хай будзе ўсім рабом, бо і Сын Чалавечы не дзеля таго прыйшоў, каб Яму служылі, але каб Самому паслужыць людзям і аддаць душу Сваю за збаўленьне многіх».

Прадаўжаючы Сваю падарожу, Ісус Хрыстос прыйшоў у Ерыхон.

---

[1]) Піць чашу — па тагачаснаму разуменьню значыла цярпець мукі і прыняць сьмерць.

## 54. Як мытнік Закхей увераваў у Ісуса Хрыста.

Лук. XIX, 1—10.

Ерыхон быў горадам сьвяшчэньнікаў. Апрача таго, у ім жылі мытнікі, якія зьбіралі падаткі. Мытнікі лічыліся на службе рымскага ўраду, таму былі ненавісны народу. Да таго-ж яны вельмі крыўдзілі народ, бо сьцягвалі падаткі ня толькі ў дзяржаўны скарб, але і на ўласную карысьць. Ня дзіва тады, што пашана, якую выказаў Ісус Хрыстос Сваімі адведзінамі начальніку мытнікаў, багатаму Закхею, выклікала ў народзе вялікае зьдзіўленьне і нават абурэньне.

Закхей быў у натоўпе, калі Ісус Хрыстос праходзіў праз места, і разам з усімі хацеў бачыць Вялікага Вучыцеля. Але Закхей быў малы ростам, таму, каб лепш разгледзіць Госпада, узьлез на прыдарожнае фігавае дзерава. Параўняўшыся з ім, Гасподзь сказаў Закхею: „Закхей! зыйдзі хутчэй, бо сяньня трэба Мне быць у цябе ў доме“. Закхей пасьпешна зыйшоў на зямлю і павёў Госпада ў дом свой, дзе прыняў Яго з радасьцю. Усе, бачачы гэта, пачалі наракаць: ведама, узгадаваныя фарысэямі, юдэі лічылі, што людзі праведныя не павінны мець ніякіх зносін з грэшнікамі. Да таго-ж, ці мала было ў горадзе сьвяшчэннікаў? Тымчасам Закхей праз адно міласьцівае слова Госпада адразу як-бы перарадзіўся: сумленьне яго прабудзілася, ён усьведаміў сабе грахі свае, пакаяўся ў іх і ў вялікім захопленьні, што Ісус Хрыстос адведаў яго дом, урачыста, стаўшы перад Госпадам, сказаў: «Палову маемасьці мае я аддам убогім і калі каго чым скрыўдзіў, аддам учацьвёра болей». Ісус сказаў яму: «Цяпер прыйшло збаўленьне гэтаму дому, бо і ты сын Аўраама». А ўсім тым, што спакусіліся, што вонкавую праведнасьць ставілі вышэй за ўсё, Гасподзь даў да зразуменьня: «Сын Чалавечы прыйшоў знайсьці і спасьці загінуўшых.“

Гэтае здарэньне дае добры прыклад для ўсіх, хто няправедна набыў сабе багацьце: хай, як Закхей, аддадуць бедным не драбніцу, а палавіну ці значную часьць свае маемасьці, не шкадуючы, і тады пачуюць

голас Хрыста: «Цяпер прыйшло збаўленьне твайму дому».

## 55. Вечар у Віфаніі.

Іоан. XII, 1—11.

За шесьць дзён да Пасхі Ісус Хрыстос прыйшоў з вучнямі ў Віфанію. Сям'я Лазара чакала Яго. Падчас вячэры Лазар быў за сталом сярод супачываўшых з Хрыстом. Марфа прыслужвала. Марыя-ж, узяўшы фунт дарагога пахнючага алею, або мvра, памазала ім ногі Ісусавы і пасьля выцерла іх валасамі сваімі. Уся хата напоўнілася пахам ад мvра.

Тады адзін з вучняў Яго, на імя Юда Іскарыёт, які праз некалькі дзён прадаў Яго, сказаў: «Лепш было-б прадаць гэты алей і грошы раздаць убогім». Сказаў-жа гэта ён не дзеля таго, што клапаціўся аб убогіх, але дзеля таго, што быў злодзеем: ён меў пры сабе скарбонку, у якую давалі ахвяры, і утойваў з яе часьць грошай у свой кішэнь. «Пакіньце яе — сказаў Ісус Хрыстос: — яна захавала гэта на дзень пахаваньня Майго. Убогіх заўсёды маеце з сабою, а Мяне не заўсёды».

Калі Ісус Хрыстос быў у Віфаніі, шмат жыдоў прыйшло пабачыць Лазара, бо аб васкрашэньні яго гаварыў увесь горад. Многія з прыйшоўшых уверавалі ў Ісуса. Гэта яшчэ больш пасіліла злосьць ворагаў Яго, асабліва першасьвяшчэньнікаў і фарысэяў. Яны пастанавілі забіць і Лазара, каб той ня мог сьведчыць аб чудзе, якое стварыў над ім Ісус Хрыстос.

## Апошнія дні Госпада Ісуса Хрыста на зямлі.

### 56. Урачысты ўваход Госпада ў Ерусалім.

Мат. XXI 1—11; Марк. XI, 1—11; Лук. XIX, 29—44; Іоан. XII, 12—19.

Прысьпеў час, і Ісус Хрыстос — на другі дзень пасьля вячэры ў Лазара—пайшоў з Віфаніі ў Ерусалім, каб урачыста выявіцца перад народам. Хрыстос хацеў увайсьці ў Ерусалім, як ня раз уваходзіў у яго цар Давід, іменна седзячы на асьле. Паклікаўшы да сябе двох вучняў Сваіх, Гасподзь загадаў ім пайсьці ў вёску, што была насупроць, і прывясьці адтуль прывязанае асьлятка, на якое ніхто з людзей ніколі не сядаў. «І калі хто спытаецца ў вас — сказаў Хрыстос— на што адвязваеце? дык скажэце яму так: «Яно патрэбна Госпаду». Пасланыя ўзапраўды знайшлі на паказаным месцы асьлятка і прывялі яго да Вучыцеля. Апосталы, накінуўшы на асьлятка свае ўбогія вопраткі, пасадзілі на яго Госпада. Калі Ён ехаў, усё мноства вучняў Хрыста падсьцілала вопраткі свае на дарозе і моцнымі галасамі славіла Бога за ўсе чуды, якія бачыла: «Багаслаўлёны, што йдзе ў імя Госпада, Цар Ізраіля! Мір на небе і слава ў вышыні!».

Тым часам да Ерусаліму дайшла ўжо вестка, што Хрыстос ідзе ў Сьвяты Горад, і шмат людзей выйшла на сустрэчу Госпаду, Цару Ізраіля, абяцанаму Мэсіі, Сыну слаўнага Цара Давіда. Усе хацелі так-жа пабачыць і Лазара, якога Хрыстос ваксрасіў. Як толькі Ісус Хрыстос паказаўся на версе Аліўнае (Элеонскае) гары, народ—у вялікім захопленьні, расьцілаючы перад Ім свае вопраткі — усыпаў дарогу Яго пальмавым гальлём і ўсклікаў: «Осанна (г. зн. спасеньне) Сыну Давідаваму! Осанна ў вышніх!»

Гэтае ўзьнясеньне бачылі, гэтыя крыкі чулі фарысэі, якіх ня мала было ў натоўпе. Яны былі вельмі ўзбураны і стрывожаны: «Глядзеце – гаварылі яны

між сабою—нічога не даб'ёмся. Увесь сьвет ідзе за Ім!» І зварочваючыся да Хрыста казалі Яму: «Вучыцель! забарані ім гэта рабіць». — Гасподзь на гэта адказаў: «Калі-б яны і замоўклі, дык каменьні загалосяць». Зыходзячы з гары, Ісус Хрыстос, гледзячы на Ерусалім, які чудоўна зьзяў на сонцы багацьцем і



Урачысты уваход Госпада у Ерусалім.

прыгожасьцю свайго храму і палацаў, прадбачачы ягоную блізкую гібель, з глыбокім сумам і сьлязьмі сказаў: «Прыдуць на цябе дні, калі ворагі твае абкладуць цябе акопамі і абкружаць цябе, і сьціснуць цябе зусюль, і зруйнуюць цябе, і пазабіваюць дзяцей

тваіх у табе, і не пакінуць у табе каменя на камені, бо не распазнаў часу адведзінаў тваіх».

Калі Ісус Хрыстос увайшоў у Ерусалім, усё места ўзварушылася і ўсе сьпяшаліся на спатканьне Яго. Зрываючы з дрэваў зялёнае гальлё і кідаючы яго пад ногі Хрысту, народ голасна вітаў свайго Вучыцеля: «Осанна, Сыне Давідаў!» Некаторыя з натоўпу, асабліва прыйшоўшыя здалёк, ня ведалі Хрыста. „Хто гэта?“ — пыталіся яны. Ім адказвалі: «Гэта Ісус, прарок з Назарэту Галілейскага». Падобна да дарослых, віталі Ісуса Хрыста і дзеці, на што зьвярнулі ўвагу Яго фарысэі, якія неадступна йшлі за Ім. Хрыстос адказаў ім: „Ці-ж вы ня чыталі, што вуснамі дзяцей і сысуноў Гасподзь тварыў хвалу?“

Шэсьце Ісуса Хрыста спынілася каля храму, куды Ён і ўвайшоў. Там абкружылі Яго хворыя, сьляпыя і кульгавыя, якіх з прычыны надыходу сьвята сабралося шмат у Ерусаліме, і Ён усіх аздараўляў. Пад вечар Гасподзь вярнуўся ў Віфанію. Гэта ўсё было ў першы дзень тыдня, які панашаму завецца цяпер „нядзеляю“.

**Трапар сьвята.**

Ѡ҆́бщее воскресе́нїе пре́жде Твоея̀ стра́сти оу҆вѣря́я, и҆з̾ ме́ртвыхъ воздви́глъ є҆сѝ Ла́заря, Хрⷭ҇тѐ Бж҃е. Тѣ́мже и҆ мы̀ ꙗ҆́кѡ ѻ҆́троцы, побѣ́ды зна́менїя нося́ще, Тебѣ̀ Побѣди́телю сме́рти вопїе́мъ: ѡ҆са́нна въ вы́шнихъ, бл҃гослове́нъ гряды́й во и҆́мя Гдⷭ҇не.

**Яшчэ перад Сваімі мукамі Ты, Хрысьце Божа, прарокаючы агульнае ўваскрасеньне, падняў Лазара з мёртвых. Таму і мы, як дзеці, нясучы азнакі перамогі (пальмавае гальлё), усклікаем Табе, Пераможцу сьмерці: Осанна ў вышніх! багаслаўлёны, што ідзе ў імя Госпада!**

**57. Пракляцьце Ісусам Хрыстом смакоўніцы. Выгнаньне з храму гандляроў.**

Мат. XXI, 18—23; Мрк. XI, 12—25.

На другі дзень Ісус Хрыстос пайшоў з вучнямі ў Ерусалім. Каля самае дарогі стаяла смакоўніца або

фігавае дзерава, пакрытае густым лісьцьцём. Звонку здавалася, што на ім будзе шмат пладоў. Аднак, калі Ісус Хрыстос падыйшоў да дзерава — Ён хацеў есьці — на ім ня было аніводнае фігі. Ісус Хрыстос тады пракляў дзерава, сказаўшы, каб на ім і надалей ніколі не расьлі плады. Смакоўніца адразу пачала засыхаць. Калі наступнага дня вучні зьдзівіліся, бачачы засохшае — па аднаму слову Госпада — дзерава, Ён сказаў: «Калі будзеце мець веру, дык зробіце ня толькі гэтае, а нат' калі гары гэтай загадаеце: падніміся і ўкінься ў мора, дык гэта будзе. Кажу вам: усё, аб чым-бы ні папрасілі падчас малітвы — верце, што атрымаеце і будзе вам".

Не смакоўніцу асудзіў Хрыстос (яна і так была бясплодная). Такім спосабам Хрыстос хацеў паказаць толькі бясплоднасьць веры жыдоўскага народу, асабліва яго павадыроў: як тая смакоўніца, яны толькі на вонкавы выгляд былі праведныя і добрыя, сэрца-ж іх было поўнае ўсялякае распусты, граха і няпраўды. Што гэта ўзапраўды было так, яны далі доказ таму праз некалькі дзён, калі галосячы: „Распні, распні Яго!" паслалі на хрэст Вучыцеля, Якога яшчэ ўчора ўрачыста сустрачалі з пальмавым гальлём ў руках. Увайшоўшы ў падворак храму, Ісус Хрыстос, як і ў першы год Свайго служэньня, убачыў шмат ахвярнае жывёлы, клеткі галубоў і сталы мянялаў з грашыма. Хрыстос не хацеў вучыць народ, заняты гандлярствам. Яшчэ раз, з пачуцьцём гневу і жалю, Ён пачаў выганяць адсюль усіх, кажучы: „Ці-ж не напісана: Дом Мой домам малітвы будзе для ўсіх народаў, а вы зрабілі яго гняздом разбойнікаў?"

Калі пасьля таго Ісус Хрыстос пачаў вучыць, у натоўпе можна было заўважыць нават паганцаў (грэкі), якія здалёк прыйшлі паслухаць Яго. Ісус Хрыстос, лічачы, што настаў час праслаўленьня Яго між народамі, маліўся Айцу Свайму: „Отча! праслаў Імя Твае, пакажы славу Тваю, каб усе пераканаліся, што Я пасланы Табою". Пры гэтых словах раптам пачуўся з неба голас: „І праславіў і яшчэ праслаўлю". Не для ўсіх гэты голас быў аднолькава чутны;

адныя прынялі яго за гром, другія казалі: ,,Ангел прамовіў да Яго.“ Толькі нямногія чулі яго разьдзельна.

Да самага вечара Ісус Хрыстос вучыў, што калі хто хоча дасягнуць збаўленьня, павінен вераваць у Яго. Пасьля таго вярнуўся у Віфанію.

## 58. Прыповесьць аб злых вінаградарах.

Мат. XXI, 33—46; Мрк. XII, 1—12; Лук. XX, 9—19.

Аўторак быў апошнім днём перад сьмерцю Госпада, калі Ён ад раніцы блізу да самага вечара вучыў народ у храме і выкрываў фарысэяў і садукеяў, якія сваімі пытаньнямі хацелі заблутаць Госпада і высьмеяць Яго перад народам. Каб быць больш зразумелым для народу, дый для бліжэйшых вучняў Сваіх, Хрыстос падчас навучаньня карыстаўся, як і раней часта, „прытчамі“ або прыповесьцямі. Аднэй з іх і была прыповесьць аб злых вінаградарах. Хрыстос паказвае ў ёй тыя згубныя ўплывы, якія нясьлі ў народ яго павадары кніжнікі і фарысэі.

Адзін гаспадар насадзіў вінаграднік і, даверыўшы яго вінаградарам, сам выехаў у далёкую краіну. Праз нейкі час, вярнуўшыся, пасылае аднаго за адным сваіх слуг, каб прынясьлі з вінаградніку пладоў, але вінаградары, убачаўшы, набіўшы і аблаяўшы пасланых, адаслалі іх ні з чым. Напасьледак, пасылае гаспадар свайго сына ўлюбёнага, кажучы сабе: «Можа, угледзіўшы яго, пасаромяцца». Але вінаградары, убачыўшы, што ён ідзе, пастанавілі забіць яго, каб мець сабе яго спадчыну. І ўзапраўды, вывёўшы яго вон з вінаградніка, забілі. Пры гэтых словах прыповесьці ўвесь народ, які слухаў гэта, выклікнуў: „Хай ня будзе гэтага!“ Што-ж зробіць з гэтымі вінаградарамі гаспадар, калі прыйдзе сам у свой вінаграднік? Фарысэі, якім Хрыстос паставіў гэтае пытаньне, адказалі: ,,Прыйдзе ды выгубіць вінаградараў гэных і аддасьць вінаграднік другім“.

Гаворачы гэтак, яны самі сабе вызначылі прысуд, бо-ж злыя вінаградары, якія гаспадарылі ў вінаградніку (абраны народ Божы), гэта-ж павадыры і

начальнікі жыдоўскія; аб іх Хрыстос гаварыў у прыповесьці; яны ня раз праганялі пасланых Гаспадаром, г. зн. Богам, Сваіх слуг (прарокаў), і вось цяпер зьбіраюцца забіць Самога Сына Божага, і толькі чакаюць для гэтага адпаведнага часу. Але скончыцца іхнае гаспадараваньне: вінаграднік будзе адданы іншым вінаградарам (з паганцаў), якія „будуць даваць Гаспадару плады (добрыя дзелы) ў свой час“.

І хацелі схапіць Хрыста, каб налажыць на Яго рукі, але пабаяліся народу, бо Яго — дадае Евангелісты—лічылі за прарока.

## 59. Фарысэі пытаюцца ў Ісуса Хрыста, ці трэба плаціць падаткі цару.

Мат. XXII, 15—22; Мрк. XII, 13—17; Лук. XX, 20—26.

Фарысэі ўмовіліся падлавіць Ісуса Хрыста падчас гутаркі на якім-колечы слове, каб пасьля можна было пацягнуць Яго да адказнасьці перад рымскаю ўладаю.

І вось падходзяць да Госпада, разам з падхлебнікамі цара Ірада, некалькі фарысэяў і кажуць: „Вучыцель! мы ведаем, што Ты справядліва гаворыш і не глядзіш на аблічча чалавека, каб каму дагадзіць, і запраўды шляху Божага навучаеш. Скажы, ці належыць плаціць падаткі цару?“ — Іншага адказу, як толькі „так“ або „не“, яны не чакалі, і вось думалася ім: калі Ён скажа „так“, дык тады ўвесь народ адступіцца ад Яго, бо народ толькі з-пад ярма церпіць рымскіх уладароў; калі-ж Ён адкажа адмоўна, г. зн. што ня трэба плаціць падаткаў на карысьць чужой улады, дык зараз-жа давядуць да ведама рымскага пракуратара, які і выдасьць загад схапіць Яго і пакараць, як бунтаўшчыка.

Ісус Хрыстос, зразумеўшы хітрасьць іх, сказаў: „Пашто вы спакушаеце Мяне? Пакажэце Мне — кажа — манэту, якою плацяцца падаткі“. Калі яны далі Яму дынарыя, Ісус Хрыстос спытаўся: „Чыё на ім аблічча і надпіс?“ Яны адказалі: „Кесара“, г. ё. цара. Тады Ісус Хрыстос і кажа: „Дык аддавайце

кесарава кесару, а Божае Богу“, або — іншымі словамі: калі народ юдэйскі, пакараны Богам за грахі, страціў сваю дзяржаўнасьць і з гэтае прычыны карыстаецца цяпер манэтай чужых уладароў, дык няма асновы і адмаўляцца плаціць падаткі кесару. Але выконваючы гэты абавязак, вы — кажа Гасподзь — павінны і Богу аддаваць тое, што Яму належыць, г. зн. нясьці Яму сваю бязьмежную веру і любоў і служыць Яму ў праўдзе і чыстаце сэрца. Адно другога не выключае, адно другому не перашкаджае.

„І не маглі — кажа Евангелісты — падлавіць Яго на слове перад народам“, і зьдзіўленыя і прысаромленыя Ягоным адказам, замоўкшы, адыйшлі ад Ісуса Хрыста.

## 60. Якая запаведзь найгалоўнейшая ў законе.

Мат. XXII, 34—40; Мрк. XII, 28—34.

Яшчэ падыйшлі да Ісуса Хрыста кніжнікі, і вось адзін з іх, найбольш дасьведчаны ў законе, пытаецца ў Госпада: „Якая самая галоўная запаведзь ў законе, праз спаўненьне каторай чалавек дасягнуў-бы праведнасьці?“ Па іх думцы, гэта было самае труднае пытаньне для развязаньня. Яны чакалі, што Хрыстос паклічацца на адну якую-колечы запаведзь: тады можна будзе падхапіць, што Ён рэшту запаведзяў лічыць няважнымі і за гэта асудзіць Яго. Што-ж адказаў Ісус Хрыстос хітраму законьніку? „Палюбі Госпада Твайго ўсім сэрцам тваім і ўсёю душою тваёю. Гэта — першая і самая галоўная запаведзь. Другая-ж падобная да яе: палюбі бліжняга твайго, як самога сябе. На гэтых двох запаведзях грунтуецца ўвесь закон і прарокі“, г. зн. іх навука.

Законьнік тады і кажа: „Вучыцель! Ты сказаў праўду: любіць Бога больш за ўсё на сьвеце і любіць бліжняга як самога сябе — гэта нават лепей, чым прыносіць ахвяры Богу“. Ісус Хрыстос кажа яму: „Недалёка ты ад Царства Божага“, г. зн., калі будзеш любіць Бога і бліжняга, дык будзеш у Царстве Божым.

## 61. Ісус Хрыстос у апошні раз выкрывае кніжнікаў і фарысэяў, усю няпраўду іх жыцьця і вучэньня.

Мат. XXIII, 1—39; Лук. XX, 45—46.

Апошнія размовы кніжнікаў і фарысэяў з Госпадам пераканалі, што між імі ляжыць прорва, якой не пераступіць. Госпаду было ведама, што яны пастанавілі забіць Яго. Ня можна было спадзявацца, каб яны апамятаваліся, пакаяліся і прынялі Яго навуку. Усё гэта разьвязвала рукі Госпаду, Які мог больш і не захоўваць ранейшай сваёй да іх спагадлівасьці і цярплівасьці. Вось чым выклікана было апошняе Яго і самае страшнае па сіле сваёй высьвядчэньне кніжнікаў і фарысэяў, „сеўшых — як кажа Хрыстос — на Майсеевым пасадзе“ (яны лічылі, што толькі да іх адных належыць права тлумачэньня закону Майсеевага і кіраўніцтва народам у жыцьці рэлігійным).

„Не паступайце паводле ўчынкаў іх,—казаў Хрыстос, бо яны толькі гавораць (аб спаўненьні запаведзяў Божых), а не робяць, — накладаюць на плечы людзям вялікі цяжар, а самі ня хочуць нат' пальцам крануць яго“. „Усе ўчынкі свае яны робяць так, каб толькі бачылі іх людзі; любяць вітаньні на рынку і першыя лавы ў школах і на банкетах, каб бачылі іх людзі і звалі: вучыцелы вучыцель! А вы — кажа Гасподь — не называйцеся вучыцялямі, бо адзін у вас Вучыцель - Хрыстос, а ўсе вы — браты; і айцом сабе не называйце нікога на зямлі, бо адзін у вас Айцец, Які ёсьць на нябёсах; і не называйцеся настаўнікамі, бо адзін у вас Настаўнік — Хрыстос. Большы з вас няхай будзе вам за слугу, бо хто ўзвышае сябе, той будзе паніжаны, а хто паніжае сябе, той будзе ўзвышаны“.

„Гора вам, кніжнікі і фарысэі-крывадушнікі, што зачыняеце Царства Нябеснае перад людзьмі, бо самі не ўваходзіце і тых, што хочуць увайсьці, ня пушчаеце“.

„Гора вам, кніжнікі і фарысэі-крывадушнікі, што няшчыра і толькі дзеля віду, хаця і доўга моліцеся і, ашукваючы сваёю прыкідною набожнасьцю, „зьядае-

це дамы (маемасьць) ўдоваў", быццам будзе гэта ахвярай Богу. Вы дастанеце за гэта цяжэйшы прысуд".

,,Гора вам, кніжнікі і фарысэі - крывадушнікі, што даецё дзесяціну з мяты, анісу і кміну, а пакінулі найважнейшае ў законе: суд і міласьць і веру; трэба рабіць гэтае, а і таго не пакідаць".

,,Павадыры сьляпыя, што камара адцэджваеце, а вярблюда глытаеце". Гэтымі словамі Хрыстос паказвае, што выконваючы драбязу, яны занядбалі галоўнае ў законе.

,,Гора вам, кніжнікі і фарысэі - крывадушнікі, што ачышчаеце чару і місу зьверху, а ўсярэдзіне поўны яны драпежнасьці і няпраўды. Фарысэй сьляпы! ачысьць перш сярэдзіну чары і місы, каб чыстыя былі і зьверху".

,,Гора вам, кніжнікі й фарысэі - крывадушнікі, што робіцеся падобнымі да памаляваных трунаў, якія звонку здаюцца прыгожымі, а ўсярэдзіне поўны касьцей трупаў і рознае нечысьці. Гэтак вы звонку здаецеся людзям сьвятымі, а ўсярэдзіне поўны крывадушнасьці і беззаконьня".

,,Зьмеі, плод эхідніны! як унікнеце вы асуджэньня ў геену? Вось дзеля гэтага Я пасылаю да вас пракаў і людзей мудрых і кніжнікаў; і вы іншых заб'еце і распнеце на храстох, а іншых будзеце біць у школах вашых і гнаць з места да места".

,,Няхай-жа спадзе на вас уся кроў сьвятая, пралітая на зямлі, ад крыві Авеля сьвятога да крыві Захара, сына Варахіінавага, каторага вы забілі між царквою і жэртвеньнікам. Запраўды кажу вам, што ўсё гэтае прыйдзе на род гэты".

Гасподзь выкрываў кніжнікаў і фарысэяў ня ў гневе, але з вялікім сумам. Гэта была Яго апошняя спроба, каб яны ўсьведамілі сабе ўсю няпраўду сваю і пакаяліся. Як-жа яны прынялі высьвядчэньне Хрыста? Гасподзь у іх вачох ня сьлёзы пакаяньня ўбачыў, а наадварот — яшчэ горшую злосьць і вялікую ненавісьць да Яго. Вось чаму прыгнечаны ўсклікнуў: ,,Ерусалім, Ерусалім! каменьнем пабіваючы прарокаў і пасланых да Цябе! Колькі разоў хацеў Я сабраць

дзяцей тваіх, як птушка зьбірае пад крыльлі птушанята свае, і вы не захацелі! Таму Я адыходжу ад вас, і вось застаецца дом ваш пусты, бо ўбачыце Мяне толькі тады, калі ўсе выклікнуць: „Багаслаўлёны той, што ідзе ў імя Госпада“, г. зн., шляхам Госпада.

Прароцтва Госпада аб Ерусаліме споўнілася хутка, калі ўзапраўды „дом юдэйскі“ застаўся„ пусты“, зрабіўся грудай руінаў і гніўшых трупаў.

## 62. Ахвяра беднае ўдавы.

Мрк. XII, 41—44; Лук. XXI, 1—4.

Выходзячы з храму, Гасподзь затрымаўся на мінуту каля скарбонкі, у якую багамолы апускалі свае ахвяры на храм, і стаў прыглядацца. Давалі кожны ад дастатку свайго: багацеі самадавольна клалі ў скарбонку золата і серабро, а адна бедная ўдава палажыла толькі дзьве лепты (дробныя мядзяныя манэты, панашаму — 2 грошы). Тады, паклікаўшы да Сябе Апосталаў, Хрыстос сказаў ім: „Запраўды кажу вам: гэтая бедная ўдава палажыла больш за ўсіх, бо ўсе тыя клалі ахвяру Богу ад лішкаў сваіх, яна ж з беднасьці сваей палажыла ўвесь пражытак свой, які мела“.

Гэтымі словамі Ісус Хрыстос навучае, што ў вачох Божых цана кожнае ахвяры залежыць ад шчырасьці, з якою хто дае яе.

## 63. Гутарка Ісуса Хрыста з Апосталамі аб гібелі Ерусаліму і канцы сьвету.

Мат. XXIV; Мрк. XIII; Лук. XXI, 5—36.

Выйшаўшы з храму Ерусалімскага (гэта ўжо ў апошні раз), Гасподзь праз гору Аліўную (Элеонскую) скіраваўся да Віфаніі.

Пад цяжкімі ўражаньнямі пакідалі храм Апосталы. Яны не маглі дапусьціць і думкі аб гібелі Ерусаліму, а з ім разам і храму, які быў асяродкам усяго

жыцьця яўрэяў. Як-бы хочучы праверыць толькі што чутае прароцтва Госпада, вучні зьвярнулі Яго ўвагу на вялізарнасьць і прыгожасьць храму, упрыгожанага такімі дарагімі матар'яламі. „Не, гэты храм — найбольшая сьвятыня і багацьце народу — ня можа быць зьнішчаны", як-бы так гаварылі яны сабе. Але Хрыстос коратка паўтарыў: «Прыдуць дні, калі з таго, што тут бачыце, не астанецца каменя на камені, і ўсё будзе зьнішчана.

Падняўшыся на гару Аліўную, Ісус Хрыстос сеў адпачыць. Каля Яго селі найбольш блізкія Яму апосталы: Іоанн, Пётр, Андрэй, Якаў і інш. Перад імі, унізе, раскінуўся абкружаны высокімі сьценамі горад, у асяродзьдзі якога блішчаў сваімі мармуровымі калёнадамі і пазалочанымі стрэхамі храм. Думаючы, што гібель Ерусаліму і храму прыйдзе разам з канцом сьвету, Апосталы спыталіся ў Госпада: „Калі-ж гэта будзе? і якая прымета Твайго, Госпадзі, прыходу і канца сьвету?" Апосталы лічылі, што абяцанае Царства Мэсіі пачнецца пасьля гібелі Ерусаліму і храму, што дзеля гэтага Ісус Хрыстос прыйдзе другі раз, што наагул усё гэта будзе хутка, пакуль усе яны яшчэ жывыя.

Адказваючы вучням Сваім, Гасподзь гаворыць адначасна і аб гібелі Ерусаліму і аб канцы сьвету — не дзеля таго, што адно будзе зараз пасьля другога, а дзеля таго, што зьнішчэньне Ерусаліму, у якім выяўцца грозны Суд Божы над яўрэйскім народам, будзе вобразам канца сьвету, калі адбудзецца страшны суд Божы над усім родам чалавечым. Вось чаму і ўсе прыметы, якія будуць перад разбурэньнем Ерусаліму, як войны, голад, землятрасеньне, ганеньне на верных, зьяўленьне няпраўдзівых пракаў і хрыстоў, паўсюднае пашырэньне Евангельля — ўсё гэта будзе і перад другім прыходам Хрыста і канцом сьвету.

«Сьцеражэцеся — кажа Хрыстос — каб хто не падмануў вас, бо многія прыйдуць пад імем Маім, кажучы: „Я — Хрыстос", і гэты час блізка, і шмат каго падмануць. Не хадзеце сьледам іх. Калі-ж пачуеце пра войны і паўстаньні, не палохайцеся, бо гэта

ўсё мусіць стацца; але гэта яшчэ не канец. Паўстане народ на народ і царства на царства, і будзе месцамі вялікае зямлятрасеньне, і голад, і мор, і страх, і знаменьні з неба вялікія. Перад усім гэтым наложаць на вас рукі, і будуць прасьледваць вас, выдаючы ў вастрогі і на мукі за імя Маё, і паставяць перад царамі і валадарамі за Мяне. І будуць ненавідзець вас усе за імя Маё, але і волас з галавы вашае не прападзе; цярплівасьцю вашаю збаўляеце душы вашыя. Хто перанясе ўсё да канца, той будзе збаўлены».

«І пашырана будзе Евангельле царства па ўсім сьвеце, дзеля сьведчаньня ўсім народам».

«Калі-ж убачыце Ерусалім абкружаны войскам, тады ведайце, што прыйшоў час спусташэньня яго. Тады ўсе тыя, што ў Юдэі, хай уцякаюць у горы; і хто знаходіцца ў месьце, выходзь хутчэй з яго; каго гэты час застаў на страсе хаты, хай ня зыходзіць узяць што-колечы з дому свайго, і хто на полі, хай не вяртаецца да хаты ўзяць адзеньне сваё, бо гэта — дні пакуты. Гэта будуць дні Суда Божага над няверным народам, каб споўнілася ўсё напісанае. Гора-ж цяжарным і кормячым грудзьмі ў тыя дні, бо будзе вялікая бяда на зямлі і гнеў на народ гэты. Палягуць ад вострага меча, і павядуць іх у палон да ўсіх народаў; і Ерусалім таптацімуць паганцы, пакуль не закончацца часы паганцаў».

Прыход Сына Чалавечага будзе неспадзяваны, як бліскавіца, якая раптам асьвятляе ўсё неба ад усходу да заходу. «Сонца зьмеркне і месяц ня дасьць сьвятла свайго, і зоркі спадуць з неба, і сілы нябесныя здрыгануцца. І дзеравянець будуць людзі ад страху і чаканьня таго, што прыйдзе на сусьвет, і пачнуць ад роспачы ўміраць. Тады будзе вялікая туга на зямлі, якой ня было дасюль ад пачатку сьвету і ня будзе. Але хто верыць у Бога і творыць волю Яго, хай не баіцца нічога. Для іх пачнецца шчасьце вечнага жыцьця на небе; яны ўбачаць на небе знак Сына Чалавечага (хрэст), Які прыйдзе на воблаках нябесных з сілаю і славаю вялікаю. І пашле Ангелаў

Сваіх з трубою і зьбяруць выбраных Яго ад чатырох вятроў, ад краю да краю неба».

«Аб гэтым дні ці гадзіне ніхто ня ведае, нават ангелы нябесныя, а толькі Айцец Мой Адзіны», — кажа Хрыстос. «Але як было ў дні Ноя, так будзе, калі прыйдзе Сын Чалавечы: як перад патопам елі, пілі, жаніліся і выходзілі замуж і ня думалі ні аб чым, пакуль ня прыйшоў патоп і ня вынішчыў усіх, так будзе, калі прыйдзе Сын Чалавечы. Пільнуйцеся-ж, каб сэрцы вашыя не абцяжаліся абжорствам і п'янствам, і жыцьцёвымі клопатамі, і каб дзень той не застаў вас неспадзеўкі. Будзьце бодрымі ўсякі час і малецеся, бо ня ведаеце, у якую гадзіну Госпадзь ваш прыйдзе». «Неба і земля прамінуць, але словы Мае не прамінуць».

---

Прадказаньне Хрыстом гібелі Ерусаліму збылося ў 70 годзе пасьля Р. Х., калі рымскі імпэратар Ціт разбурыў дашчэнту горад і храм Ерусалімскі, а жыхароў больш за мільён перабіў, рэшту-ж забраў у палон, скуль яны хутка расьсеяліся па ўсім сьвеце. У гэтым расьсеяньні жыды знаходзяцца аж да сяньняшняга дня.

## 64. Прыповесьць аб дзесяцёх дзяўчынах.

Мат. XXV, 1—13.

Заклікаючы вучняў Сваіх да заўсёднае бодрасьці над сабой, Ісус Хрыстос гэтую думку паясьніў прыповесьцю аб 10 дзяўчынах, якім трэба было сустрэць жаніха.

У жыдоў быў звычай, што дружкі нявесты выходзілі ўрачыста, са сьветачамі ў руках, на сустрэчу жаніху. А як іншы раз жаніх пазьніўся прыйсьці ў вызначаную гадзіну, дык дзяўчыны павінны былі мець масла на запас, бо тое масла, што было ў сьветачах, магло ўсё выгарэць да прыходу жаніха. Вось, раўнуючы другі прыход Сына Чалавечага да сустрэчы жа-

ніха дзесяцьма дзяўчынамі, Ісус Хрыстос і кажа.

«Тады падобна будзе Царства Нябеснае — пачаў Хрыстос — да дзесяцёх дзяўчын, якія меліся сустрэць жаніха». Пяць з іх былі мудрыя, а пяць неразумныя, нядбайныя. Першыя ўзялі масла на запас, другія не ўзялі. Як жаніх спазьніўся і ніхто ня ведаў, калі ён прыйдзе, дык усе і паснулі. Ажно апоўначы ўзьняўся крык: „Жаніх ідзе! выходзьце на сустрэчу яму“. Дзяўчыны схапіліся запальваць сьветачы свае, але ў нядбайных ня было ўжо масла, вось яны і кажуць мудрым: «Пазычце нам вашага масла, бо нашыя сьветачы гаснуць». А тыя адказалі: «Каб стала і вам і нам, лепш пайдзеце да прадаўцоў і купеце сабе». Калі-ж яны пайшлі купляць, прыйшоў жаніх, і пачаўся вясельны банкет. Дзьверы за гасьцямі зачыніліся. Ажно прыходзяць нядбайныя дзяўчыны і стукаюцца ў дзьверы, каб іх упусьцілі: «Госпадзі! Госпадзі! адчыні нам», - кажуць. Ён-жа адказаў: «Праўду кажу вам — ня знаю вас», і яны не прынялі ўдзелу ў вясельным банкеце.

І зноў Госпадзь, канчаючы гэту прыповесьць, сказаў: «Дык ня спеце, бо ня ведаеце ні дня, ні гадзіны, калі прыйдзе Сын Чалавечы».

Пад мудрымі дзяўчынамі трэба разумець хрысьціян, якія жывуць набожна, якія, маючы сьветач веры і запас добрых учынкаў, кожную мінуту гатовы сустрэць Хрыста, каб увайсьці ў Царства Нябеснае; пад нядбайнымі-жа трэба разумець такіх, якія ня маюць агню веры і запасу добрых учынкаў, таму ня маюць з чым выйсьці на сустрэчу Жаніху; у дзень суда яны пачуюць ад Яго, як евангельскія дзяўчыны: «Ідзеце ад Мяне, бо ня знаю Я вас».

### 65. Прыповесьць аб талантах. *)

Мат. XXV, 14—30.

Адзін гаспадар, выяжджаючы на доўгі час у далёкі край, паклікаў слугаў сваіх і даў аднаму з іх пяць талантаў, другому два, а трэцяму адзін — кож-

*) Талант—на польскія грошы прыблізна 10.000 злотых.

наму па яго сіле — з умоваю, каб падчас яго адсутнасьці яны выкарысталі гэтыя грошы, а пасьля вярнулі іх яму з пэўнаю часткаю зыску.

Калі гаспадар, вярнуўшыся, загадаў даць справаздачу, выявілася, што першыя два рабы павялічылі даручаныя ім грошы ўдвая, бо пусьцілі іх у дзела. За гэта гаспадар пахваліў іх, абяцаў ім яшчэ большы свой давер і ўвёў іх у свой дом, як другоў ці родных. Калі-ж прыйшоў даць справаздачу трэці раб, які атрымаў адзін талант, дык ён сказаў гаспадару свайму: „Я ведаю, што ты чалавек жорсткі — жнеш, дзе ня сеяў і зьбіраеш, дзе не рассыпаў, таму, пабаяўшыся, пайшоў я і схаваў талант твой у зямлю; вось табе тваё“. Выслухаўшы гэта, гаспадар загадаў слугам узяць яго талант і даць таму, які меў дзесяць талантаў. Мала таго, злы і лянівы раб быў назаўсёды пазбаўлены даверу і ласкі гаспадара свайго і ўкінуты ў цемру лютую, дзе плач і скрыгат зубоў. «Усякаму, хто мае, будзе дадзена больш і павялічыцца, а ў таго, хто ня мае, ўзята будзе і тое, што мае», — гэткімі словамі закончыў Ісус Хрыстос Сваю прыповесьць.

Сэнс гэтае прыповесьці гэткі. Гаспадар — гэта Ісус Хрыстос. Рабы — тыя, хто веруе ў Яго. Таланты — ўсё, што хрысьціянін мае ад Бога і дзякуючы чаму можа выяўляць сваю моральную істоту, напрыклад: здольнасьці, адукацыя, высокае палажэньне ў грамадзянстве, багацьце і інш. Ня ўсе маюць аднолькавыя таланты: аднаму даецца больш, другому менш— кожнаму па яго сіле. Але ўсе пакліканы аднолькава да павялічэньня і ўзбагачэньня давераных ім талантаў. Хрысьціяне, падобныя да першых двох верных рабоў, свае здольнасьці выкарыстоўваюць дзеля сеяньня сярод блізкіх сваіх дабра, праўды, прыгожасьці, асьветы, — сваё багацьце ўжываюць для помачы бедным і тым, што пакутуюць, — сваім высокім палажэньнем у грамадзянстве карыстаюцца, каб падняць агульны дабрабыт і шчасьце людзей і адхіліць усялякую крыўду і нязгоду. Такое служэньне людзям вымагае вялікае ахвярнасьці, вялікага напружаньня сілаў чалавека, сталае і ўпартае працы. Нагародаю

для іх будзе: мір і спакой для душы, пашана і любоў ад людзей, міласьць і ласка ад Бога. Яны «ўвайдуць у радасьць Гаспадара Свайго», як гаворыцца ў Евангельлі.

А хто, як злы і лянівы раб, баючыся працы, няздольны на вялікія і самаахвярныя ўчынкі, схавае свой «талант» у зямлю, г. зн. ня выкарыстае яго зусім, той варты пакараньня, якое заслужыў евангельскі раб. Сухі, чэрствы самалюб, ён сьцеражэць толькі свой спакой. Ад яго ўчасьця, яго працы людзям — як гаворыцца — «ані цёпла, ані холадна». Калі ён і робіць што-колечы, дык толькі выконваючы свой абавязак і толькі для ўласнага свайго дабра, а што паза гэтым (агульнае дабро і шчасьце), дык гэта яго мала цікавіць. Яму не стае шчырасьці, ахвярнасьці, шырокага сэрца, не стае адданасьці да працы, тым часам, як толькі такім адношаньнем будуецца Царства Божае на зямлі.

«Хто мае вушы слухаць, няхай слухае»: такім зваротам Ісуса Хрыста і кожны з нас заклікаецца разважыць, як мы ўжываем дадзены нам ад Бога «талант».

## 66. Вобраз страшнага Суда Божага.

Мат. XXV, 31—46; XXVI, 1—2.

Аб апошнім вялікім судзе Сваім Ісус Хрыстос вучыў так: „Калі прыйдзе Сын Чалавечы ў славе Сваёй і ўсе сьвятыя ангелы з Ім, тады сядзе на пасадзе славы Свае, і зьбяруцца перад Ім усе народы; і адзеліць адных ад другіх, як пастух аддзяляе оўцы ад казлоў; і паставіць оўцы (праведных) на правы ад Сябе бок, а казлоў (грэшнікаў) на левы». І скажа Цар тым, якія на правы бок ад Яго: „Прыдзеце, багаслаўлёныя Айца Майго, насьледуйце Царства, прыгатаванае вам ад стварэньня сьвету, бо Я хацеў есьці, і вы далі Мне (есьці); Я хацеў піць, і вы напаілі Мяне; Я быў у дарозе і вы прынялі Мяне; быў нагі і вы апранулі Мяне, быў хворы і вы наведаліся да Мяне; у вастрозе быў, і вы прыйшлі да Мяне». Тады

праведнікі скажуць Яму ў адказ: «Госпадзі! калі мы бачылі Цябе галодным і накармілі, ці прагнучым і напаілі? Калі мы бачылі Цябе ў дарозе і прынялі? або нагім і апранулі? Калі мы бачылі Цябе хворым або ў вастрозе, і прыйшлі да Цябе?» І адкажа ім Цар: «Узапраўды кажу вам: тое, што зрабілі вы аднаму з братоў Маіх меншых, вы зрабілі Мне“. Пасьля гэтага скажа тым, што на левы бок ад Яго: «Ідзеце ад Мяне, праклятыя, у вагонь вечны, прыгатаваны д'яблу і слугам яго, бо Я быў галодны і вы не далі Мне есьці; хацеў піць і не напаілі Мяне; быў у дарозе і не прынялі Мяне; быў нагі і не апранулі Мяне; хварэў і ў вастрозе — і не наведаліся да Мяне“. Тады яны скажуць Яму: „Госпадзі! калі мы бачылі Цябе галодным, або прагнучым, або падарожным, або голым, або хворым ці ў вастрозе — і не паслужылі Табе?“ Тады адкажа ім: «Узапраўды кажу вам: як не зрабілі гэтага аднаму з братоў Маіх меншых, дык не зрабілі Мне». І пайдуць гэтыя на муку вечную, а праведнікі ў жыцьцё вечнае».

Скончыў Сваё навучаньне Хрыстос сумным, але ўжо знаёмым прадказаньнем, што раней за ўсё будуць Ягоныя мукі і сьмерць. Гасподзь цяпер ясна паказаў нават самы спосаб яе і дзень: «Вы ведаеце, што праз два дні будзе Пасха, і Сын Чалавечы будзе выданы на расьпяцьце“.

## 67. Пастанова сынэдрыёну аб арышце Ісуса Хрыста. Здрада Юды.

Мат. XXVI, 3—16; Мрк. XIV, 1—2; Лук. XXII, 1—6.

У ноч на вялікую сераду першасьвяшчэньнікі, кніжнікі і старэйшыны юдэйскія, сабраўшыся ў палацы першасьвяшчэньніка Кайяфы, радзіліся, што ім рабіць з Ісусам, апошняе высьвядчэньне Якога перад народам перапоўніла меру іх цярплівасьці. Найпрасьцей было, разумеецца, зараз-жа схапіць і загубіць Яго, але баяліся народу, які з прычыны сьвята Пасхі напоўніў увесь Ерусалім*) і мог заступіцца за

*)На сьвята Пасхі ў Ерусаліме зьбіралася больш за два мільёны людзей.

свайго Вучыцеля. Доўгая нарада скончылася пастановаю ўзяць Ісуса хітрасьцю і забіць Яго, але пытаньне: як зрабіць гэта? засталося нявырашаным.

Калі яны разважалі аб гэтым, прыходзіць ў сынэдрыён ведамы ўжо нам з свае хціўасьці да грошай Юда Іскарыёт — адзін з 12 Апосталаў. Ён запрапанаваў выдаць Ісуса Хрыста — так, каб гэта ня выклікала ніякага абурэньня ў народзе. Начальнікі юдэйскія былі вельмі задаволены і далі Юдзе за гэтую ўслугу трыццаць сярэбранікаў (трохі больш за 100 злотых) — суму, якая звычайна выдавалася за раба, забітага выпадкова: гэткім спосабам яны лішні раз хацелі зьняважыць Ісуса Хрыста, — такая вялікая была ў іх ненавісьць да Яго.

Ад таго часу Юда стаў шукаць выпадку, каб выдаць ім Ісуса, але толькі не пры народзе.

## 68. Тайная вячэра. Устанаўленьне Ісусам Хрыстом таінства прычашчэньня.

Мат. XXVI, 17—30; Мрк. XIV, 14—26; Лук. XXII, 7—39: Іоан. XIII, 1—30.

Сераду Хрыстос правёў адзін, каб прыгатовіцца Духам да Свае Вялікае Ахвяры.

У чацьвер рана, напярэдадні дня, калі пачыналася сьвята і калі, паводле закону, належала есьці вялікоднае ягня (пасха), Апосталы спыталіся ў Госпада, дзе Ён скажа прыгатовіць пасху. Гасподзь адказаў: «Пры ўваходзе вашым у горад, сустрэнецца з вамі чалавек, нясучы збанок вады; пайдзеце з ім у дом, у які ўвайдзе ён, і скажэце гаспадару дому: Вучыцель кажа табе: дзе пакой, у якім-бы Мне есьці пасху з вучнямі Маімі? і ён пакажа вам сьвятліцу вялікую, засланую: там і прыгатоўце». Яны пайшлі і, знайшоўшы ўсё, як сказаў ім, прыгатавалі пасху.

Калі надыйшоў вечар таго дня, Хрыстос прыйшоў ў сьвятліцу і дванаццаць Апосталаў з Ім. Вячэра была гатова, стол накрыты, і Гасподзь з Апосталамі ўзьляглі і сталі есьці, выконваючы ўсю ўрачыстасьць,

згодна з законам і звычаем. У абрадах і сьвяточнай гутарцы прайшоў некаторы час.*)

Пасьля гэтага пачалася **першая Пасха Новага Завету.** З гэтага моманту ўсе дзеяньні і настаўленьні Госпада прасякнуты нейкім асаблівым духам пакорнасьці, самаахвярнасьці і любові. Першае, у чым выявілася гэта, было тое, што — як расказвае Евангелісты Іоанн — Ісус Хрыстос устаў ад стала, скінуў з Сябе верхнюю вопратку і, узяўшы рушнік і падперазаўшыся, а пасьля наліўшы вады ў умывальніцу, пачаў абмываць ногі вучням Сваім — у тым ліку і і Юдзе Іскарыёту — і выціраць рушніком, якім быў апяразаны. Калі Ісус Хрыстос падыйшоў да Ап. Пятра, дык гэты сказаў Яму: «Госпадзі! ці-ж Табе абмываць мае ногі?» Тады Хрыстос кажа яму: «Што Я раблю, ты цяпер ня ведаеш, але даведаешся потым». Пётр горача выклікнуў: «Ня ўмыеш ног маіх да веку». На гэта Ісус адказаў: „Калі ня ўмыю цябе, ня маеш часьці са Мною». Тады Сіман Пётр кажа Яму: «Госпадзі! умый ня толькі ногі мае, але і рукі і галаву». Ісус Хрыстос адказаў: „Абмытаму трэба толькі ногі абмыць, бо ўвесь чысты, і вы чыстыя, але ня ўсе“ (бо ведаў, што адзін з іх прадасьць Яго). Калі-ж абмыў усім ногі і апрануў ізноў Сваю вопратку, дык адпачыўшы спытаўся: „Ці ведаеце, што гэта Я зрабіў вам? Вы называеце Мяне Вучыцелем і Госпадам і справядліва кажаце, бо Я і ёсьць такі. Дык, калі Я, Гасподзь і Вучыцель, абмыў вам ногі, дык і вы павінны абмываць ногі адзін аднаму, бо Я даў вам прыклад, каб, як Я зрабіў вам, і вы рабілі. Калі гэтак будзеце рабіць — будзеце шчасьлівымі, будзеце мець удзел у Царстве Нябесным. Але не аб усіх вас гэтак кажу, бо адзін з вас прадасьць Мяне. І гора таму чалавеку, праз якога будзе праданы Сын Чалавечы: ляпей-бы таму чалавеку зусім не нарадзіцца на сьвет“. Слухаючы гэта, Апосталы вельмі ўзварушыліся і пачалі аглядацца адзін на аднаго, ня ведаючы, аб кім гаворыць: „Госпадзі! ці ня я гэта? ці ня я?“

*) Сьвяткаваньне пасхі ў жыдоў пачыналася ўвечары 14 нісана першы веснавы месяц).

пыталіся ў Вучыцеля. Гасподзь нічога не адказаў на гэтыя пытаньні. Між іншымі спытаўся і Юда Іскарыёт, і Гасподзь адказаў яму: „ты", але адказаў так ціха, што ніхто ня чуў. Быў-жа за сталом адзін з вучняў Яго на ўлоньні Ісуса, якога Ісус вельмі лю-



Устанаўленьне Ісусам Хрыстом таінства прычашчэньня.

біў (Іоанн). Яму вось Сіман Пётр кіўнуў, каб спытаўся, хто гэта? аб кім гаворыць? Іоанн, прыпаўшы да грудзей Ісуса, спытаўся: „Госпадзі! хто гэта?" Ісус адказаў: „Той, каму Я падам абмачыўшы кусок хле-

ба". І абмачыўшы падаў Юдзе, кажучы: „Што робіш, рабі хутчэй". Але ніхто з Апосталаў не зразумеў, дзеля чаго сказаў яму гэта. А дзеля таго, што ў Юды была скарбонка з грашыма, дык некаторыя зразумелі, быццам Ісус кажа яму: „Купі, што трэба нам на сьвята, ці каб даў убогім". Той-жа, узяўшы кусок, зараз-жа выйшаў. На дварэ была цёмная ноч.

Пасьля выхаду Юды, Ісус аддаўшы хвалу Богу, узяў хлеб, багаславіў яго, паламаў на кускі і даючы кожнаму з Апосталаў, сказаў: **„Вазьмеце і ешце: гэта ёсьць Цела Маё, што за вас даецца ў адкупленьне грахоў"**. Пасьля ўзяў чашу з віном, разьведзеным вадою, таксама багаславіў і, даючы кожнаму з Апосталаў, сказаў: **„Пеце ад яе ўсе, бо гэта ёсьць Кроў Мая Новага Завету, што праліваецца за вас і за многіх ў адкупленьне грахоў.** Гэта рабеце на ўспамін аба Мне". І пілі ўсе з гэтае чашы і елі ўсе паданы Госпадам хлеб.

Так было ўстаноўлена ў Царкве Хрыстовай таінства Сьв. Прычашчэньня. Апосталы, прыняўшы хлеба і віна, прычасьціліся істотнага Цела і Крыві Хрыстовае.

---

У сьвятліцы Сыонскай Хрыстом і Апосталамі ў апошні раз была адсьвяткавана Пасха Старога Завету і ў першы раз Пасха Новага Завету. Калі там ягня першароднае заколвалася ў памяць збаўленьня з палону Эгіпэцкага і выхаду ў зямлю абяцаную, дык тут Сам Хрыстос, як Ягня чыстае і беззаганнае, прыняўшы сьмерць, прынёс Сябе ў ахвяру Богу за грахі людзей, каб вызваліць іх ад рабства духоўнага і адчыніць уваход у Зямлю Абяцаную - Царства Нябеснае.

### 69. Разьвітальная прамова Ісуса Хрыста падчас тайнае Вячэры. Прадказаньне аб адрачэньні Ап. Пятра.

Іоан. XIII, 31—38; XIV—XVII, 1—26; Мат. XXVI, 30—35; Мрк. XIV, 26—31.

Тайная вячэра скончылася разьвітальнай прамовай Ісуса Хрыста, якая зацягнулася далёка за поўнач. „Дзеці!—казаў Ісус Хрыстос:—яшчэ нядоўга быць

Мне з вамі. Будзеце шукаць Мяне, але куды Я іду, вы ня можаце ісьці. Даю вам новую запаведзь: каб любілі адзін аднаго. Як Я палюбіў вас, так і вы любеце адзін аднаго. Па тым пазнаюць усе, што вы — Мае вучні, калі будзеце мець любоў адзін да аднаго". Тады кажа Яму Сіман Пётр: „Госпадзі! куды Ты ідзеш?" Ісус адказаў яму: „Куды Я іду, ты ня можаш цяпер ісьці, пазьней-жа пойдзеш за Мною". Пётр кажа Яму: „Госпадзі! Чаму я не магу ісьці за Табою цяпер? Я душу маю палажу за Цябе". Ісус адказвае яму: „Душу тваю за Мяне паложыш? Запраўды кажу табе: не прапяе два разы певень, як ты тройчы адрачэшся, што знаеш Мяне. І ўсе вы — далей кажа Хрыстос, зварочваючыся да Апосталаў — спакусіцеся аба Мне ў гэтую ноч, як гаворыцца ў Пісаньні: „паражу пастыра і расьсеюцца авечкі стада" (Зах. XIII, 7), але па ўваскрасеньні Маім спаткаю вас у Галілеі". Тады Пётр горача ўсклікнуў: «Калі-б і ўсе спакусіліся, я ніколі не спакушуся. Хоць-бы мне трэба было памёрці з Табою, ня выракуся Цябе". Так гаварылі і ўсе вучні.

Вядучы далей гутарку, Ісус Хрыстос казаў вучням: „Хай не сумляваецца сэрца вашае, што Я адыходжу ад вас. Веруйце ў Бога і ў Мяне веруйце. Я іду і зноў прыйду і вазьму вас да Сябе, каб і вы былі там, дзе Я". Тут кажа Яму Фама: „Госпадзі! ня ведаем, куды ідзеш, дык як можам ведаць дарогу?" Ісус сказаў яму: „Я і пуць, і ісьціна, і жыцьцё. Ніхто ня прыходзіць да Айца, калі не цераз Мяне; калі-б вы пазналі Мяне, пазналі-б і Айца Майго; і адсяньня ведаеце Яго і бачылі Яго". Кажа Яму Апостал Піліп: „Госпадзі! пакажы нам Айца і даволі з нас". Хрыстос на гэта адказаў: „Гэтулькі часу Я з вамі, і ты не пазнаў Мяне, Піліп! Хто бачыў Мяне, бачыў і Айца. Як-жа ты кажаш: пакажы нам Айца? Ці ты ня верыш, што Я ў Айцу і Айцец у Мне? Словы, што кажу вам Я, не ад Сябе кажу: Айцец, што ва Мне, Той робіць дзелы. Верце Мне, што Я ў Айцу і Ён у Мне; калі-ж не, верце Мне па самых учынках. Запраўды кажу вам: хто веруе ў Мяне, будзе рабіць учынкі, якія Я раблю, дый большыя за іх зробіць: бо

Я да Айца Майго іду. І чаго папросіце ў імя Маё, тое зраблю, каб уславіўся Айцец у Сыне. Калі любіце Мяне, споўніце Мае запаведзі. І Я ўпрашу Айца, і Ён дасьць вам другога Ўцяшыцеля, каб быў з вамі да веку, — Духа Праўды, Якога сьвет ня можа прыняць, бо ня бачыў Яго, а вы ведаеце Яго, бо Ён з вамі ёсьць і ў вас будзе. Не пакіну вас сіротамі: прыйду да вас. Яшчэ трохі, і сьвет ужо ня ўбачыць Мяне, а вы ўбачыце Мяне, бо Я жыву: і вы жыць будзеце. Хто спаўняе запаведзі Мае, той любіць Мяне, а таго, хто любіць Мяне, любіціме Айцец Мой, і Я палюблю Яго і зьяўлюся Яму Сам. Хто ня любіць Мяне, той не выпаўняе слоў Маіх. Гэтае сказаў Я вам, пакуль Я з вамі. Уцяшыцель-жа, Дух Сьвяты, Якога пашле Айцец у імя Маё, навучыць вас усяго і напомніць вам усё, што Я казаў вам. Мір пакідаю вам, мір Мой даю вам. Ужо нядоўга гаварыць Мне з вамі, бо ідзе князь гэтага сьвету, і ва Мне ня мае нічога. Але каб сьвет ведаў, што Я люблю Айца, Я і раблю, як загадаў Мне Айцец.“

„Устаньце, пойдзем адгэтуль“, — скончыў пакуль што гэтымі словамі Гасподзь і ўстаў з-за стала. Усталі і Апосталы, і ўсе пайшлі па дарозе ў сад Гэфсіманскі.

## 70. Апошнія настаўленьні Ісуса Хрыста Апосталам па дарозе ў Гэфсіманію. Першасьвяшчэньніцкая малітва Госпада.

Іоан. XV—XVII.

Дарогаю Гасподзь казаў далей Сваю разьвітальную прамову, Свае апошнія настаўленьні Апосталам. «Гэтым уславіцца Айцец Мой, калі вы прынясеце багаты плод і будзеце Маімі вучнямі. Запаведзь-жа Мая—любеце адзін аднаго, як Я палюбіў вас. Ніхто ня мае любові большае за тую, калі хто аддасьць душу сваю за другоў сваіх. Вы другі Мае, калі спаўняеце тое, што Я загадваю вам. Ня бойцеся, калі сьвет вас ненавідзіць; ведайце, што Мяне раней за вас зьненавідзеў. Калі Мяне прасьледвалі, будуць пра-

сьледваць і вас. Калі-б вы ішлі прапаведваць вучэньне сьвета (патуралі сьвету), дык сьвет палюбіў-бы вас. Але-ж вы йдзеце сьведчыць аб граху, і клікаць грэшнікаў да пакаяньня, і за гэта людзі вас узьненавідзяць. Вас будуць выганяць са школаў (сынагогаў) і забіваць, і кожын, хто заб'е вас, будзе думаць, што гэтым служыць Богу. Але сказаў Я вам гэта дзеля таго, каб, калі прыйдзе час той, вы ўспомнілі, што наперад Я гаварыў вам аб гэтым. Ня сумуйце, што Я адыходжу ад вас. Цяпер Я іду да Паслаўшага Мяне. Для вас лепей, каб Я пайшоў, бо калі Я не пайду, Уцяшыцель ня прыйдзе да вас; калі-ж пайду, пашлю Яго да вас. Ён, Дух Праўды, навучыць вас усякае праўды, бо не ад Сябе гаварыць будзе, але гаварыціме, што пачуе, і абвесьціць вам, што мае прыйсьці. Хутка ня будзеце бачыць Мяне, дый зноў хутка ўбачыце Мяне, што йду да Айца. Узапраўды кажу вам: вы заплачаце і загалосіце, а сьвет усьцешыцца; вы сумныя будзеце, але сум ваш на радасьць зьменіцца, і радасьці вашае ніхто не адбярэ ў вас. Дасяньня вы нічога не прасілі ў імя Маё; прасеце і атрымаеце, каб радасьць вашая была поўная. Дасюль Я гаварыў вам прыповесьцямі, але надходзіць гадзіна, калі ўжо проста абвяшчу вам аб Айцу». Тады вучні Яго сказалі: «Вось Ты цяпер проста гаворыш і прыповесьці ня кажаш ніводнае. Цяпер бачым, што ведаеш усё, і ня маем патрэбы, каб хто пытаўся у Цябе. Дзеля гэтага верым, што Ты ад Бога зыйшоў“. Ісус адказаў ім: «Цяпер верыце. Вось надходзіць гадзіна, дый ужо прыйшла, калі вы расьсеецеся кожын у свой бок і пакінеце Мяне Аднаго, але Я не Адзін, бо Айцец са Мною. Гэтае сказаў Я вам, каб мір мелі ўва Мне. На сьвеце гора мець будзеце, але спадзявайцеся: Я перамог сьвет“.

Скончыў Гасподзь Сваю развітальную прамову т. зв. **«вялікай першасьвяшчэньніцкай малітвай»**. У гэтай малітве Гасподзь просіць Свайго Айца Нябеснага **за Сябе**, каб праславіў Сына Свайго, Які завяршыў дзела, даручанае Яму, — **за Сваіх вучняў**, каб захаваў іх для прадоўжаньня Ягонага дзела на зямлі і — **за ўсіх веруючых**, каб Бог асьвяціў іх праўдаю Сваёю:

«Отча! — маліўся Хрыстос, падняўшы вочы Свае да неба — прыйшла гадзіна: праслаў Сына Твайго, каб і Сын Твой праславіў Цябе; бо Ты даў Яму ўладу над усякаю істотаю, каб Ён усяму, што Ты даў Яму, даў-бы жыцьцё вёчнае. Гэнае-ж жыцьцё вечнае ў тым, каб пазналі Цябе, адзінага праўдзівага Бога, і Ісуса Хрыста, Якога Ты паслаў. Я праславіў Цябе на зямлі: завяршыў дзела, якое Ты даў Мне зрабіць. Дык цяпер праслаў Мяне Ты, Отча, у Цябе Самога той славаю, якую Я меў у Цябе раней існаваньня сьвету. — Я абвясьціў імя Тваё людзям, якіх Ты Мне даў ад сьвету. Цяпер зразумелі яны, што ўсё, што Ты даў Мне, гэта ад Цябе... За іх прашу, не за ўвесь сьвет прашу, але за тых, якіх Ты даў Мне, бо яны Твае. І ўсё Маё—Тваё, і Тваё Маё: і ў іх Я праславіўся... Отча Сьвяты! захавай іх у імя Тваё, тых, якіх Ты Мне даў, каб яны былі адно, як і Мы. Я аддаў ім слова Тваё, і сьвет зьненавідзіў іх, бо яны ня з сьвету. Не прашу, как Ты ўзяў іх з сьвету, але каб захаваў іх ад зла. Яны ня з сьвету, як і Я ня з сьвету. Асьвяці іх праўдаю Тваёю: слова Твае — праўда. Як Ты паслаў Мяне ў сьвет, так і Я пасылаю іх у сьвет. І за іх Я пасьвячаю Сябе, каб і яны былі асьвечаны праўдаю». — «Не за іх-жа толькі малю, але й за тых, што ўверавалі ў Мяне па слове іх. Няхай будуць усе адно: як Ты, Айцец ува Мне, і Я ў Табе, так і яны няхай будуць адно, каб паверыў сьвет, што Ты паслаў Мяне. І славу, якую Ты даў Мне, Я дам ім, каб былі адно, як Мы адно. Я ў іх, і Ты ўва Мне; каб былі злучаны ў адно, і няхай пазнае сьвет, што Ты паслаў Мяне і палюбіў іх, як палюбіў Мяне. Отча, каго Ты Мне даў, хачу, хай і яны будуць са Мною там, дзе Я, каб бачыць славу Маю, якую Ты Мне даў, бо палюбіў Мяне раней заснаваньня сьвету. Отча праведны! сьвет Цябе не пазнаў, але Я пазнаў Цябе, і яны пазналі, што Ты паслаў Мяне. І Я абвясьціў ім імя Тваё і абвяшчаю, каб любоў, якою Ты палюбіў Мяне, ў іх была, і Я ў іх. Отча Сьвяты! захавай іх у імя Тваё – тых, якіх Ты даў Мне, каб яны былі адно, як і Мы. Асьвяці іх ісьцінаю Тваёю: слова Твае — ісьціна. Як Ты паслаў Мяне ў сьвет, так

і Я пасылаю іх у сьвет. І за іх Я пасьвячаю Сябе, каб і яны былі асьвечаны ісьцінаю. Не за іх-жа толькі малю, але і за тых, што ўверавалі ў Мяне па слове іх. Няхай будуць усе адно: як Ты, Айцец, ва Мне, і Я ў Табе, так і яны няхай будуць адно, каб паверыў сьвет, што Ты паслаў Мяне,—і славу, якую Ты даў Мне, Я дам ім, каб былі адно, як Мы адно».

Сказаўшы гэтае, Ісус выйшаў з вучнямі Сваімі за ручай Кедрон, дзе быў сад, у які ўвайшоў Сам і вучні Яго.

## 71. Маленьне аб чашы у садзе Гэфсіманскім.

Мат. XXVI, 36—46; Мрк. XIV, 32—42; Лук. XXII, 30—46; Іоан. XVIII, 1—2.

Месцам, куды Ісус Хрыстос скіраваўся пасьля тайнае вячэры і апошняе разьвітальнае гутаркі, быў сад Гэфсіманскі, дзе і раней Гасподзь любіў часта адпачываць ці вучыць Сваіх вучняў. Калі ўвайшлі ў сад, Ісус Хрыстос сказаў Апосталам: «Пасядзеце тут, пакуль Я пайду і памалюся». І ўзяўшы Пятра, Якава і Іоанна, пайшоў з імі ў глыбіню саду, кажучы: «Душа Мая нудзіцца да сьмерці; пабудзьце тут са Мною і ня сьпеце». Пасьля адыйшоў ад іх на далечыню, як кінуць каменем, і, ўпаўшы на калені, пачаў у вялікай нудзе маліцца, каб патрымаць Свой Дух, агорнуты жахам перад недалёкімі ўжо мукамі і сьмерцю: „Отча! калі Твая воля, пранясі чашу гэтую міма Мяне, але хай будзе не тое, чаго Я хачу, а чаго Ты». Зьявіўся-жа Яму Ангел з неба, падтрымліваючы Яго. І ў барацьбе нечалавечай, сьмяротнай гарачэй і гарачэй маліўся, і быў пот Яго, як каплі крыві, падаючы на зямлю. Калі Хрыстос скончыў малітву, Ён прыйшоў да вучняў Сваіх, але знайшоў іх сьпячымі. Збудзіўшы Пятра, які перад тым хваліўся сваёй адданасьцю, Ісус Хрыстос кажа яму: «Сіман! і ты сьпіш? ці ты ня мог не паспаць адну гадзіну, каб пабыць са Мною?“. І зьвярнуўшыся да ўсіх сказаў: «Устаньце і малецеся, каб не папасьці ў спакушэньне». І як-бы хочучы выбачыць ім іхную слабасьць, дадаў: „Дух бодры, плоць-жа не-



Маленьне аб чашы ў садзе Гэфсіманскім.

мачная». Яшчэ два разы пасьля таго Ісус Хрыстос адыходзіў ад трох Апосталаў і ў страшнай нудзе сьмяротнай паўтараў тую самую малітву да Свайго Айца Нябеснага: «Отча Мой! Калі ня можа чаша гэтая прайсьці міма, каб Мне ня піць яе, дык хай будзе воля Твая». Вяртаючыся кожны раз да вучняў Сваіх, Ён нязьменна знаходзіў іх сьпячымі: яны нават ня ведалі, што адказваць Яму на Яго пытаньні і дакоры. І толькі за трэцім разам Хрыстос вярнуў іх да пачуцьця запраўднасьці, калі паказаў ім на небясьпеку, якая вось ужо йдзе: «Вы ўсё яшчэ сьпіцё і адпачываеце, але настаў час, і Сын Чалавечы будзе прададзены ў рукі грэшнікаў. Устаньце, пойдзем, бо падходзіць той, хто прадае Мяне».

З гэтымі словамі Гасподзь і Апосталы Пётр, Якаў і Іоанн пайшлі да выхаду з саду, дзе знаходзілася рэшта Апосталаў. Праз гушчыню дрэваў віднеліся агні і натоўп людзей, якіх вёў Юда-здраднік, каб выдаць ім на сьмерць Свайго Вучыцеля.

## 72. Арышт Ісуса Хрыста.

Мат. XXVI, 47—56; Мрк. XIV, 43—52; Лук. XXII, 47—54; Іоан. XVIII, 3—12.

Юда ведаў, дзе быў Хрыстос з вучнямі. Узяўшы ад архірэяў і начальнікаў жыдоўскіх ваякаў і слугаў з сьветачамі і аружжам, Юда прыходзіць у Гэфсіманію. Калі Ісус Хрыстос, ведаючы ўсё, што з Ім будзе, убачыў азброены натоўп, Ён выйшаў наперад і спытаўся ў іх: «Каго шукаеце?» Яму адказалі: «Ісуса Назарэя». Ісус сказаў ім: «гэта Я». Пры гэтых словах усе прыйшоўшыя адступіліся назад і ўпалі на зямлю — да таго агарнуў страх перад вялікасьцю Хрыста і злачынствам, якое зьбіраліся зрабіць. Праз момант падходзіць да Ісуса Юда, каб пацалаваць Яго, бо так умовіўся ён з начальнікамі: «Каго,—казаў,—я пацалую, Той і ёсьць». Падыйшоўшы да Госпада, Юда запраўды пацалаваў Яго, вітаючы звычайным прывітаньнем: «Радуйся, Раввí!“ Гасподзь на гэта адказаў: „Пацалункам Сына Чалавечага прадаеш? Рабі,

дзеля чаго прыйшоў“. Тут падступілі да Яго прыйшоўшыя людзі, каб налажыць на Яго рукі. Быўшыя — жа з Ім, бачачы, да чаго даходзіць, спыталіся: «Госпадзі! Ці ня ўдэрыць нам мечам?“ А Апостол Пётр, які меў меч, узапраўды выняў яго і ўдэрыў слугу архірэевага і адсёк яму правае вуха; слуга - жа той зваўся Малх. Ісус Хрыстос сказаў: «Пакіньце, даволі», і дакрануўшыся да вуха яго, аздаравіў яго. Апосталу-ж Пятру сказаў: «Палажы меч у ножны, бо ўсе, хто ўзяў меч, ад меча загінуць. Няўжо - ж Я ня вып'ю чары, што даў Мне Ацец? Або ты думаеш, што Я не магу зараз упрасіць Айца Майго, і Ён дасьць у Маю абарону больш, як дванаццаць легіёнаў Ангелаў? Як-жа збудзецца Пісаньне, што так павінна быць?“ Архірэям-жа і начальнікам царквы ды старэйшынам, якія выйшлі супроць Яго, сказаў: „Быццам на разбойніка выйшлі вы з мечамі і каламі ўзяць Мяне, а тым часам Я кожын дзень сядзеў з вамі ў храме, навучаючы вас, і вы не падымалі на Мяне рукі, але цяпер ваш час і ўлада цемры. Хай збудзецца Пісаньне“. Пасьля гэтага ваякі, тысячнік і слугі жыдоўскія ўзялі Ісуса, зьвязалі Яго і павялі. Тут Апосталы ўсе пакінулі Свайго Вучыцеля і паўцякалі, хто куды. Толькі двох з іх — Пётр і Іоанн здалёк сачылі за ўзяўшымі Ісуса, ды яшчэ нейкі няведамы хлапец, апрануты коўдраю, ішоў за імі, але калі яго схапілі, ён уцёк, пакінуўшы коўдру. Думаюць, што гэта быў Евангеліст Марк.

## 73. Ісус Хрыстос на судзе Сынэдрыёну.

Мат. XXVI, 57—68; Мрк. XIV, 53—65; Лук. XXII, 63—71; Іоан. XVIII, 12—24.

Калі прыйшлі ў Ерусалім, дык Ісуса Хрыста павялі спачатку да былога першасьвяшчэньніка Анны, хаця ён, як адстаўны архірэй, і ня меў права судзіць. Анна спытаўся ў Ісуса аб вучнях і аб навуцы Яго. Ісус Хрыстос адказаў: „Я заўсёды адкрыта навучаў народ у храме і ў школе, і тайна, украдкам не гаварыў ніколі. Чаму пытаешся ў Мяне? Спытайся ў тых,

хто слухаў, што Я казаў ім. Мае слухачы ведаюць' што Я казаў". Такім адказам Хрыстос даў зразумець, што не выпадае гэтак тайна, уночы, бяз сьведкаў, пад крыкі ўзброенага натоўпу судзіць Яго, вучыўшага заўсёды адкрыта. За такі адказ адзін з слугаў, што стаяў бліжэй да Ісуса, удэрыў Яго па твары і сказаў: ,,Так Ты адказваеш архірэю?".. Ісус адказаў яму: «Калі Я сказаў блага, дакажы, што блага, а калі добра, дык за што б'еш Мяне?" На тым скончыўся дапрос у Анны. Па яго загаду, Ісуса—зьвязанага— павялі да зяця Анны першасьвяшчэньніка Кайяфы, які быў на той год архірэем. Гэта быў той самы архірэй, які парадзіў жыдом, што ,,лепш нам, каб адзін чалавек памёр за людзей, чымся каб ўвесь народ загінуў" (Іоан. XI, 49 – 50).

Ня гледзячы на раніцу, у палацы Кайяфы (у яго прыватным памешканьні) сабраўся ўвесь сынэдрыён— пакуль не для суда, а каб толькі зрабіць дапрос, каб сабраць матар'ял для абвінавачаньня Госпада. Паводле закону, суд уночы - дый яшчэ напярэдадні сьвята — ня мог адбывацца. Сынэдрыёну вельмі хадзіла аб тое, каб як найхутчэй скончыць з гэтаю прыкраю справаю. Пастанова ў іх ужо была загадзя прыгатаваная, але справа вымагала зрабіць нейкі паказны суд, бо інакш не выпадала вышэйшай судовай установе жыдоў. Для суда трэба было мець сьведкаў. Паслалі нібы шукаць іх (яны загадзя былі падгатаваны). Прыйшло шмат крывасьведкаў, якія, ведама-ж, нічога ня чулі з таго, што ўзапраўды і адкрыта гаварыў Хрыстос. Ісус не перашкаджаў ім паказваць, чаго вымагалі ад іх судзьдзі. І няведама, што яны гаварылі, але пэўне-ж не сказалі нічога, за што можна было-бы засудзіць Яго. Напасьледак зьявілася двох сьведкаў, якія сказалі, быццам яны чулі, як Ён гаварыў: „Я разбуру гэты храм рукатворны, а праз тры дні збудую другі, нерукатворны". Але і гэтага было мала, каб засудзіць Ісуса. Тым часам трэба было сьпяшацца з прысудам, бо надыходзіла сьвята, і народ, даведаўшыся, мог перашкодзіць. Тады да Ісуса, Які ўвесь час маўчаў, падходзіць Кайяфа і пытаецца: «Чаму Ты нічога не адказваеш? Ці Ты ня чуеш, што яны на

Цябе кажуць?» Господзь нічога не адказаў. Тады Кайяфа вельмі раззлаваўся і ўзбураны рашуча зьвярнуўся да Ісуса: «Заклінаю Цябе Богам Жывым, прысягні нам: ці Ты Хрыстос, Сын Божы». Ісус Хрыстос адказаў: «Я нават больш скажу: адсюль вы пабачыце Сына Чалавечага, седзячага па правай руцэ Сілы Божае і ідучага на воблаках нябесных» (так вызначалі славу Божую Давід і Прарокі). Тады Кайяфа ў прыкідным гневе разадраў вопратку сваю і выклікнуў: «Ён зьневажае Бога! Якое яшчэ патрэбна нам сьведчаньне? бо-ж мы самі чулі хулу Яго, з вуснаў Яго. Як вам здаецца – што рабіць з Ім?» Усе адказалі: «Ён варты сьмерці».

На гэтым дапрос у Кайяфы пакуль і скончыўся. Судзьдзі пастанавілі сабрацца яшчэ раз, каб зрабіць аканчальны прысуд. Што датычыць да Ісуса, дык Яго, зьвязанага і пад канвоем, вывялі на панадворак. Тут вартаваўшыя Яго пачалі зьдзекавацца над Ім. Яму плявалі ў твар, білі па вушох і шчоках; іншыя-ж, затуліўшы рукамі сваімі твар Яго і б'ючы, пыталіся насьмяхаючыся: «Прароч, хто Цябе ўдарыў?» І шмат чаго іншага агіднага казалі на Яго. Господзь ціха, пакорна, моўчкі пераносіў усё гэта, хоць, як Сам казаў, мог-бы ўпрасіць Айца, і Айцец паслаў бы легіёны Ангелаў, каб абараніць Яго. Але тады не адбылося-б адкупленьне роду чалавечага.

Калі настала раніца і Ісуса прывялі ўжо на праўдзівы суд сынэдрыёну, у яго ўласнае памешканьне, Яму паставілі ранейшае пытаньне: «Ці Ты Хрыстос?» Ім перш за ўсё хадзіла аб тое, каб Ісус Хрыстос сьцвярдзіў Сваё Мэсіянства (Божае Пасольства), бо толькі на гэтым можна было абапёрці абвінавачаньне. Ісус Хрыстос адказаў, як і першы раз: „Калі скажу, вы не паверыце; калі спытаюся ў вас, ня будзеце адказваць Мне і не адпусьціце Мяне. Адсюль Сын Чалавечы сядзе па правай руцэ Сілы Божае.“ — „Дык Ты Сын Божы?» схапіліся ўсе.— «Вы кажаце, што Я», адказаў Хрыстос. — «Якое-ж больш патрэбна нам сьведчаньне? Бо-ж мы самі чулі з вуснаў Яго», — сказалі, і засудзілі Яго на сьмерць.

## 74. Выраканьне і каяньне Ап. Пятра.

Мат. XXVI, 69—75; Мрк. XIV, 66—72; Лук. XXII, 54—62; Іоан. XVIII, 15—18; 25—27.

Ня ўсе Апосталы пакінулі свайго Вучыцеля, калі Той быў арыштованы слугамі архірэевымі. Сьледам за імі на панадворак Кайяфы, як яго знаёмы, ўвайшоў найбольш блізкі і любы вучань Хрыстоў Ап. Іоанн, якога прывяло сюды глыбокае спачуваньне свайму Вучыцелю і Госпаду. Ня бачачы Пятра, які астаўся за брамаю, Іоанн сказаў прыдзьверніцы, каб упусьціла яго. На пытаньне: «Ці ты ня з вучняў гэтага Чалавека?» Пётр адказаў адмоўна, і яна ўпусьціла яго. Пётр падыйшоў да вогнішча, якое распалілі рабы і слугі архірэевы, і пачаў грэцца. Стоячы тут, ён прыслухваўся, што гавораць аб Ісусе. Цікавасьць Пятра зьвярнула на сябе ўвагу прысутных, і вось спачатку адна служанка, а пасьля сваяк Малха, якому Пётр адсёк вуха, кажа Пятру, што яны бачылі яго з Ісусам Галілеянінам. Пётр замяшаўся і адказаў: „Не разумею, што кажаш“. Аднак гэта прымусіла яго адыйсьці ад вогнішча і скіравацца да брамы, каб выйсьці з панадворку. У гэты момант запяяў певень. Пётр увесь здрыгануўся. Тут падходзіць другая служанка і таксама кажа: „І гэты быў з Ісусам Назарэем». Пётр пабажыўся, што ня знае «гэтага Чалавека“. Ен нат' не назваў Ісуса на імя, каб ня выдаць сябе. Хутка Пётр ізноў вярнуўся на панадворак. І зноў хтось з седзячых пры вогнішчы кажа: „Пэўне-ж і ты з іх ліку, бо мова твая падобная да Галілейскае?“ Страх агарнуў Пятра і ён пачаў бажыцца і прысягацца, што ня ведае Чалавека, аб Якім гавораць“. Аж тым часам суд над Госпадам скончыўся, і Яго вывялі на панадворак. Хрыстос чуў, як Петр выракаўся Яго. Гасподзь з дакорам паглядзеў на Пятра,—раптам і певень запяяў, гэта ўжо другі раз. Тут Пётр успомніў сказанае яму: «Раней, чымсь певень два разы запяе, ты тры разы адрачэшся Мяне».

Пётр горка, горка заплакаў і выйшаў з панадворку. Ёсьць паданьне, якое йдзе ад вучняў Ап. Пятра, што ён да канца жыцьця помніў сваё адрачэньне і кожны раз, як пачуе ўночы пеўня, пачынаў маліцца на каленях і, абліваючыся сьлязьмі, прасіць у Госпада выбачэньня.

## 75. Каяньне і гібель Юды.

Мат. XXVII, 2—10.

Нядоўга цешыўся з атрыманых грошай Юда здраднік, хаця сваё агіднае дзела выканаў дакладна. Но, не пасьпелі яшчэ зачыніць за арыштаваным Хрыстом брамы палацу Кайяфы, як Юда адчуў сваё вялікае праступства. Сэрца яго разрывалася ад болю, калі ён успамінаў свой здрадніцкі пацалунак і ціхі дакор Хрыста: «Ці пацалункам прадаеш Сына Чалавечага?» Абраз Вучыцеля—усімі кінутага, зьвязанага, катаванага, зьневажанага і ў той-жа час пакорнага і ціхага—яшчэ больш паліў ягоную душу. Калі-ж Юда пачуў, што прададзены ім Хрыстос засуджаны на сьмерць, мера яго душэўнае мукі перапоўнілася. Юда йдзе ў храм да першасьвяшчэньнікаў і старэйшынаў і поўны жаху, кажа: «Саграшыў я, прадаўшы Кроў нявінную». Але ці халодныя, жорсткія, закасьцянелыя ў граху сэрцы іх маглі выказаць якое спачуцьцё? Ня дзіва, што яны адказалі: «А нам што да таго? глядзі сам». Вялікі жах і роспач напоўнілі душу Юды. Раптам страшная думка, як маланка, прарэзала яго мысьль і апанавала яго. Юда ў вялікім узбурэньні кідае пад ногі купіўшых яго крывавыя сярэбранікі і сьпяшыць выйсьці з храму, каб хутчэй знайсьці канец. Бліжэйшае дрэва, на якім павісла цела Юды, прынясло яму вызваленьне ад душыўшых яго мукаў.

З гэтага дня да сяньняшняга імя Юды-здрадніка застаецца тым імем, якім кляймяцца ўсякая здрада і прадажнасьць.

Першасьвяшчэньнікі, падняўшы сярэбранікі, сказалі: «Ня можна класьці іх у скарбніцу царкоўную, бо гэта—цана Крыві». Пасьля гэтага зрабілі нараду

і купілі за гэтыя грошы зямлі ў ганчара для пахаваньня падарожных. З таго часу і да сяньняшняга дня гэтая зямля завецца «сялом крыві».

## 76. Першы суд над Ісусам Хрыстом у Понція Пілата і суд Ірада.

Мат. XXVII, 11—14; Мрк. XV, 1—5; Лук. XXIII, 1—11; Іоан. XVIII, 28—40.

Прысуд сынэдрыёну вымагаў яшчэ зацьверджаньня з боку начальніка Юдэі рымскага пракуратара, якім на той час быў Понці Пілат. Ісуса Хрыста і павялі да яго ў прэторыю (судзілішча). Была раніца. Вечарам гэтага дня пачыналася сьвята. Каб можна было есьці пасху і каб не занячысьціцца, жыды (таго вымагаў закон) ў прэторыю не ўвайшлі, дзеля чаго Пілат сам выйшаў да іх. Бачачы зьвязанага Чалавека, Пілат спытаўся: «У чым вінавconfigure вы гэтага Чалавека?» Яны адказалі: „Калі-б Ён ня быў злодзей, мы не прывялі-б Яго да Цябе“. Пілат адказаў: „Вазьмеце Яго і самі судзеце паводле вашага закону“. Тады жыды сказалі: „Мы ня маем права нікога забіваць“, і пачалі прыдумваць на Ісуса розныя віны, напр., быццам Ён бунтуе Сваім вучэньнем народ, —быццам, называючы Сябе «Хрыстом-Царом“, забараняе плаціць падаткі рымскаму кесару і г. д. Пілат зацікавіўся асабліва апошнім абвінавачаньнем і захацеў пагаварыць з Хрыстом-Царом бяз сьведкаў. Ён увайшоў у прэторыю і паклікаў туды Ісуса. „Ты Цар Юдэйскі?“ спытаўся Пілат. — Хрыстос адказаў: „Царства Маё не ад гэтага сьвету, бо інакш слугі Мае баранілі-б Мяне, каб жыды ня выдалі Мяне. Але Царства Маё ня згэтуль“. Тады Пілат сказаў: «Гэтак Ты цар?» — Ісус адказаў: «Ты сам кажаш, што Я – Цар. Я на тое нарадзіўся і на тое прыйшоў на сьвет, каб сьведчыць аб ісьціне. Кожын, хто ад ісьціны, слухае голасу Майго». З гэтых слоў Пілат зразумеў, што перад ім стаіць не які - колечы бунтаўшчык ці вораг рымскае ўлады, а хутчэй нейкі праведнік, які ўсё

жыцьцё ахвяраваў шуканьню ісьціны, і таму, спытаўшыся з насьмешкаю: «Што ёсьць ісьціна?» павярнуўся і, выйшаўшы з прэторыі, сказаў жыдом: «Я ніякае віны не знаходжу ў Ім». Аднак старэйшыны і начальнікі юдэйскія ня сьціхалі і казалі, што „Ён бунтуе народ, навучаючы па ўсёй Юдэі, пачынаючы ад Галілеі да гэтага месца“. Хрыстос не гаварыў нічога, каб апраўдацца. Гэта выклікала не малое зьдзіўленьне Пілата. Пэўне-ж, усе абвінавачаньні былі вельмі недарэчныя, бо Пілат ізноў усенародна абʼявіў: „Я не знаходжу ніякае віны ў гэтым Чалавеку. Пасьля гэтага Пілат, хочучы ўхіліцца ад прыкрае справы, загадаў адвясьці Іісуса да Ірада, начальніка Галілеі, які ў тыя дні быў у Ерусаліме. Пайшоў да Ірада і ўвесь сынэдрыён.

Угледзіўшы Іісуса, Ірад вельмі задаволіўся, бо даўно хацеў бачыць Яго. Ірад шмат чуў аб Хрысьце, як чудатворцу і спадзяваўся, што Ён зробіць перад Ім нейкае знаменьне або чуда. Ірад пачаў распытваць Яго „многімі словамі“. Але Хрыстос, ведаючы гэтага чалавека (гэта быў той самы Ірад, які загадаў адсячы галаву Іоанна Прадцечы), „нічога не адказаў яму“. Архірэі-ж і кніжнікі стаялі і заўзята абвінавачвалі Іісуса. Хрыстос, як і раней, нічога не адказаў ім. Незадаволены Хрыстом, Ірад з сваімі слугамі пачаў зьдзекавацца над Ім. На заканчэньне Ірад, у насьмешку, загадаў апрануць Хрыста ў сьветлую вопратку, — на ўзор тае, якую апраналі цары ў дні асаблівых урачыстасьцяў, і ў такім відзе адаслаў назад да Пілата. І сталіся ў той дзень Пілат і Ірад прыяцелямі сабе, бо раней былі ў непрыязьні між сабою“, — заўважвае Ев. Лука.

## 77. Другі суд Пілата над Хрыстом.

Мат. XXVII, 15—26; Мрк. XV, 6—15; Лук. XXIII, 12—24; Іоан. XIX, 1—16.

Калі Іісуса Хрыста, абкружанага ўзброеным натоўпам, сярод вялікага гоману, пагрозаў і зьдзеку прывялі ізноў да Пілата, ён выйшаў на панадворак,

сеў на судзейскае месца (ліфастратон) і сказаў падыйшоўшым да яго першасьвяшчэньнікам і іншым сябром сынэдрыёну: „Вось вы прывялі да мяне Чалавека гэтага і кажаце, што псуе Ён народ, але-ж я, пры вас дасьледжваючы, не знаходжу Яго вінаватым ні ў чым з таго, у чым вы абвінавачваеце Яго. Таксама і Ірад, да якога я пасылаў Яго, не знайшоў у Ім нічога, заслугоўваючага сьмерці. Дык вось я думаю, пакараўшы Яго, звольніць Яго зусім". Пілат лічыў Ісуса невінаватым ні ў чым і хацеў уратаваць Яго ад сьмерці. Ён ведаў, што прадалі Ісуса не за злачынства Яго, а толькі па зависьці. Але толькі сьмерць магла задаволіць засьлепленых злосьцю ворагаў Яго.

У жыдоў быў звычай, што з прычыны сьвята начальнік Юдэі зваліняў, па выбару народу, каго-колечы з засуджаных на сьмерць. Пілат ведаў, што народ хоча прасіць за Варавву—злодзея і бунтаўшчыка, які падбіваў на паўстаньне супроць рымскае ўлады. Але ня траціў надзеі, што мо' перад абліччам пагрозы для Ісуса Хрыста, Якога яшчэ некалькі дзён таму назад урачыста вітаў: „Осанна!", народ захоча звольніць гэтага апошняга. Вось чаму Пілат і спытаўся: „Каго хочаце адпусьціць вам — Варавву ці Ісуса, званага Хрыстом?" Але першасьвяшчэньнікі і старэйшыны ўжо пасьпелі пераманунь народ на свой бок, і таму на пытаньне Пілата народ закрычаў: „Не Яго, а Варавву". — „Што-ж мне рабіць з Ісусам, званым Хрыстом"? — спытаўся Пілат. Усе аднадушна выклікнулі: „Хай будзе расьпяты!" Пілат ізноў прамовіў, хочучы адпусьціць Ісуса: „Што-ж благога ўчыніў Ён? Нічога заслугоўваючага сьмерці я ў Ім не знаходжу". Але яны яшчэ мацней закрычалі: „Распні, распні Яго!"

У гэты час жонка Пілатава прыслала сказаць яму: „Не рабі нічога злога гэтаму Праведніку, бо я мінулай ночы шмат за Яго ва сьне мучылася". Пілат робіць тады апошнюю спробу выратаваць Хрыста. Ён загадвае бічаваць Госпада, хочучы гэткім спосабам выклікаць да Яго спагаду, хоць і не знаходзіў у Ім ніякае віны. Пасьля бічаваньня ваякі вывялі Хрыста унутр двара, налажылі Яму на галаву вянок з цяр-



Другі суд Пілата над Хрыстом.

ніны (як накладаюць залатыя вянкі царом), апранулі Яго ў чырвоны плашч (як апранаюць цароў), пасьля далі ў правую руку тросьць (як даюць скіпэтр царом), і, падаючы перад Ім на калені, плявалі ў твар і зьдзекаваліся, кажучы: „Радуйся, Цар Юдэйскі!» А потым вырывалі з Ягоных рук тросьць і білі ёю па галаве, каб калючкі цярніны глыбей урэзваліся ў цела. Ісус Хрыстос з вялікаю пакораю і моўчкі цярпеў гэтыя нечалавечыя мукі, молячыся за Сваіх катаў. Калі гэтак пабітага, усяго ў крыві, ледзь жывога вывялі Хрыста ў цярновым вянку і чырвоным плашчы ізноў да народу, Пілат быў пераканаsuccessfully, што выгляд Ісуса ня можа не расчуліць скамянелых сэрцаў Яго ворагаў. «Вось Чалавек!» зьнехаця выклікнуў Пілат, агорнуты жахам. «Я выводжу Яго да вас, каб вы ведалі, што не знаходжу ў Ім ніякае віны», — сказаў ён народу. Але натоўп, падбураны архірэямі і слугамі іх, быў як стада дзікіх зьвяроў, якіх від крыві толькі больш азьвярыў. «Распні, распні Яго!» закрычалі ў адказ. Тады Пілат кажа ім: «Вазьмеце Яго і распнеце на храсьце, бо сам я не знаходжу ў Ім ніякае віны». Жыды адказалі яму: «Мы маем закон і паводле закону нашага мусіць памёрці, бо зрабіў Сябе Сынам Божым». Пілат спалохаўся, чуючы гэтыя словы. Не пазбаўлены веры ў розныя забабоны, ён падумаў, мо' і ўзапраўды Хрыстос ёсьць сын якога бога, які памсьціцца потым за засуджанага на сьмерць. Недарма-ж і жонка сьніла гэткі страшны сон. І захацеў Пілат яшчэ раз распытаць Хрыста. Пілат увайшоў у прэторыю і сказаў Ісусу: «Адкуль Ты?» — значыць, ці Ты ўзапраўды ад Бога ці ад людзей, як і ўсе? Але Ісус нічога не адказаў яму. Пілат ізноў кажа Госпаду: „Ты мне не адказваеш? Ці ня ведаеш, што я магу расьпяць Цябе на храсьце і магу звольніць Цябе?“ Ісус адказаў: „Ты ня меў-бы ніякае ўлады нада Мной, калі-б Табе ня было дадзена з вышыні“ (калі-б Бог не дапусьціў Сына Чалавечага да мукаў і сьмерці); „дзеля гэтага больш граха на тых, хто Мяне прадаў табе“. Пасьля такога адказу Пілат яшчэ больш хацеў звольніць Яго. Жыды-ж не заспакоіліся і крычалі: „Калі ты звольніш Яго, ты ня друг кесару; кожын,

хто робіць сябе царом, вораг кесара". Пачуўшы гэтыя крыкі, Пілат, паказваючы на Госпада, Якога ізноў вывялі да народу, сказаў: „Вось Цар ваш". Але яны закрычалі: «Вазьмі, вазьмі, распні Яго!" Пілат кажа: „Як я распну Цара вашага?" Архірэі-ж адказалі: „Няма ў нас цара, апрача кесара". Што было рабіць Пілату? Каб ворагі адумаліся—на гэта ня было ніякае надзеі. Пілат не хацеў засудзіць Хрыста, бо лічыў Яго нявінным, але не адважваўся і апраўдаць, бо жыды маглі пашкодзіць яму самому, данёсшы у Рым, што Ён патурае ворагам кесаравае ўлады. І прыдумаў Пілат такі выхад: самому ня выносіць прысуду, але і не перашкаджаць першасьвяшчэньнікам выканаць прысуд, які раней пастанавіў сынэдрыён. Пілат загадаў прынясьці вады, умыў перад народам свае рукі (у знак таго, што ён не бярэ на сябе гэтага злачынства) і сказаў: „Невінаваты я ў крыві гэтага Праведніка; глядзеце: ня я, а вы будзеце вінаватыя". І адказваючы, ўвесь народ сказаў: „Кроў Яго на нас і на дзецях нашых". Так прагрымела страшнае пракляцьце, якое жыды самі наклікалі на сябе і на сваё патомства.

Пасьля гэтага Пілат выдаў загад звольніць з вастрогу Варавву, Ісуса-ж, „біўшы", аддаў на волю Яго ворагаў.

## 78. Шэсьце на Галгофу.

Мат. XXVII, 27—32; Мрк. XV, 16—21; Лук. XXIII, 26—32; Іоан. XIX, 16—17.

Расьпінаньне на храсьце было самым страшным і ганебным пакараньнем сьмерцю. Расьпіналі звычайна самых праступных рабоў і зладзеяў. Цяжэйшае ці горшае сьмерці, як расьпінаньне, няма, бо расьпяты чалавек церпіць мукі пякельныя і смагу нястрывалую, да таго-ж сьмерць настае ня хутка. І вось на такую-то смерць быў засуджаны нявінны Цярплівец за грахі ўсяго чалавецтва.

Пасьля прысуду ваякі-каты ўзялі Хрыста, скінулі з Яго чырвоную акрываўленую вопратку, апранулі

ў Яго ўласнае адзеньне і, з цярновым вянком на галаве, павялі на месца казьні. Месца гэтае звалася „Галгофа", або „Лобнае" месца (гэтым словам азначалі пукаты ўзгорак, на ўзор чэрапа або лоба). Разам з Госпадам вялі і двох засуджаных на расьпінаньне разбойнікаў. Сьмертнікі павінны былі самі нясьці свае храсты. Ішлі яны пад канвоем ваякаў, на чале якіх ехаў рымскі сотнік. Ззаду йшоў вялізарны натоўп людзей. Былі ў натоўпе, разумеецца, начальнікі жыдоўскія і сябры сынэдрыёну, якія маглі цяпер цешыцца, што дабіліся гібелі няпрызнанага імі Мэсіі. З родных і блізкіх Хрыста спадарожнічалі Яму на страшную Галгофу блізу зусім няпрытомныя—ад вялікага гора і жаху — Прасьвятая Дзева Марыя, Ап. Іоанн і жанчыны: Марыя, жонка Клеопы, і Саламія, маці Ап. Якава і Іоанна і інш. Шэсьце пасоўвалася паціху. Змучаны бяссонаю ноччу, катаваньнем і душэўнымі мукамі Гасподзь нядоўга мог нясьці Свой хрэст. Пад цяжарам яго Ён ня раз падаў. Пры выхадзе з гораду Хрыстос і зусім змогся. Тады ваякі далі нясьці Яго хрэст нейкаму Сымону Кірэнейцу, які на тую пару вяртаўся з поля, насустрэчу ім. Ён узваліў на сябе хрэст і панёс за Ісусам. Гэты адпачынак трохі вярнуў сілы Госпаду, і Ён зьвярнуўся да жанчын, якія плакалі і галасілі па ім: „Дочкі Ерусалімскія! Ня плачце па Мне, але плачце па сабе і па дзецях вашых, бо падыходзяць дні такіх страшных мучэньняў і пакуты, што лепш, чым перацярпець тыя мучэньні, хай-бы пападалі і пакрылі ўсіх горы і ўзгоркі, якія абкружаюць горад. Бо калі - кажа—зялёнаму дрэву (Сам Хрыстос) гэтае робяць, дык з сухім (народ жыдоўскі) што станецца?"

Гэтае прадсказаньне збылося праз 37 гадоў, калі Ерусалім быў дазваньня зруйнованы і зьнесены з твару зямлі, а жыхары блізу ўсе або згінулі ад голаду або былі перабіты. Кроў Хрыста, узапраўды, лягла на іх самых і на іх патомства.

## 79. Расьпяцьце Ісуса Хрыста.

Мат. XXVII, 33—44; Мрк. XV, 22—32; Лук. XXIII, 33—43; Іоан. XIX, 18—27.

Прыйшлі на Галгофу. Ваякі зьнялі з засуджаных іх адзеньне і паднясьлі ім снатворнае піцьцё (віно, зьмешанае з смірнаю), каб ня так балюча адчувалі пякельныя мукі. Хрыстос адмовіўся ад піцьця, хочучы поўнасьцю выпіць чашу мучэньняў, якія дабравольна прыняў на Сябе для збаўленьня людзей. Тым часам ладзілі храсты і капалі ямы.

І расьпялі Яго, і з Ім двох разбойнікаў наабапал Яго, — Ісуса ў сярэдзіне. Калі расьпіналі і прыбівалі гваздамі да храста працягнутыя ўздоўж перакладзіны рукі, таксама і ногі, ніхто не пачуў ніводнага стогну ці жальбы з вуснаў Збавіцеля. У гэтыя мінуты найбольшых мучэньняў Хрыстос знайшоў у сабе столькі сілы, каб маліцца за Сваіх мучыцеляў: «Отча! дaруй ім, бо ня ведаюць, што робяць».

Скончыўшы расьпінаньне і ўкапаўшы ў зямлю храсты з павешанымі на іх, ваякі пачалі дзяліць між сабою вопратку Ісуса. Падзялілі на часьці—кожнаму ваяку пакрысе. Але быў хітон бяз швоў, увесь вытканы ад верху, дык яго не разадралі, а кінулі жараб'е, каму дастанецца цэлы. Так збылося прароцтва Давіда: «Падзялілі адзежу Маю між сабою і аб вопратку Маю жэраб'е кідалі» (Пс. XXI, 19). Разьдзяліўшы адзеньне Госпада, ваякі селі і пачалі нясьці варту каля храстоў.

Да храста, над галавою Госпада, загадам Пілата, была прыбіта дошчачка, на якой на трох мовах—лацінскай, грэцкай і жыдоўскай (арамейскай)—было напісана: «Ісус Назаранін, Цар Юдэйскі». Архірэі і начальнікі жыдоўскія ў такім надпісаньні ўгледзілі для сябе і народу абразу, бо выходзіла, што яны, на вачох усяго сьвету, павесілі на храсьце, дый яшчэ між ліхадзеямі, свайго запраўднага цара. Пілат, відавочна, хацеў памсьціцца жыдом за тое, што яго прымусілі зрабіць супроць яго волі. Калі жыды зразумелі, як злосна падсьмяяўся над імі Пілат, паслалі да яго прасіць зьмяніць надпіс, каб было так, як Сам Хры-



Распяцьце Ісуса Хрыста.

стос казаў: «Я Цар Юдэйскі». Але Пілат горда адказаў: „Што я напісаў, тое напісаў“, і надпіс на храсьце застаўся той самы.

Шмат народу стаяла ля храстоў і глядзела на павешаных. Адныя прыходзілі, іншыя адыходзілі. Адныя, спачуваючы Хрысту, маўчалі, іншыя сьмяяліся, ганілі і, ківаючы галавамі сваімі, казалі: „Ты, што руйнаваў і ў тры дні ўзнаўляў: калі Ты—Сын Божы, дык зыйдзі с храста і спасі Сябе Самога“. Ня лепш за натоўп захоўваліся і архірэі з кніжнікамі, старэйшынамі і фарысэямі: і яны зьдзекаваліся і сьмяяліся з Хрыста, кажучы: „Іншых спасаў, няхай жа Сябе Самога спасе, калі Ён Хрыстос, выбранец Божы. Тады мы першыя ўверуем у Яго. Меў надзею на Бога, дык хай Бог і выратуе Яго, калі дагадзіў Яму. То-ж казаў: Я—Божы Сын“. Таксама і ваякі зьдзекаваліся над Ім, кажучы: „Калі Ты ўзапраўды Цар Жыдоўскі, спасі Сябе Самога“. Нават адзін з разбойнікаў, расьпятых з Госпадам, зьдзекаваўся над Ім і казаў: „Калі Ты Хрыстос, спасі Сябе і нас“. Другі-ж больш разважны і спагадлівы, сунімаў яго і казаў: „Ціж-ж ты не баішся Бога, калі і сам засуджаны на тое-ж? Але мы засуджаны справядліва, за нашыя ліхія ўчынкі, а Ён нічога злога не зрабіў“. І сказаў Ісусу: „Успомні аба мне, Госпадзі, калі прыйдзеш у Царства Тваё“. На гэтае маленьне і раскаяньне разбойніка Ісус, Які ўвесь час маўчаў, адказаў: „Запраўды кажу табе: сяньня-ж будзеш са Мною ў раі“.

Непадалёку ад храста Госпадавага, у страшным горы, заплаканыя, ледзь жывыя стаялі: Маці Яго, Ап. Іоанн, Марыя Магдаліна, Марыя Клеопава, Саламія і многія другія, якія спадарожнічалі і служылі Госпаду, калі Ён быў у Галілеі, і тыя, якія з Ім прыйшлі ў Ерусалім (Мрк. XV, 41). Млявы ўзрок Збавіцеля затрымаўся на Яго Прачыстай Маці, сэрца Якой зьядала туга, як бы „меч пранізаў душу“ (так некалі прарочыў Сымон Богапрыімец). Паказаўшы лёгкім нахіленьнем галавы на любага вучня, Ісус Хрыстос сказаў Маці Сваёй: „Жанчына, вось сын Твой!“ Пасьля кажа вучню: „Вось Маці твая!“ Гэтымі словамі Хрыстос даручаў Сваю Маці дагляду Ап. Іоанна, які з таго часу прыняў Яе ў свой дом і апекаваўся Ёю, як сын сваею Маткаю.

## 80. Сьмерць Ісуса Хрыста.

Мат. XXVII, 45—56; Мрк. XV, 33—40; Лук. XXIII, 44—49; Іоан. XIX, 28—37.

Калі расьпялі Госпада, была—згодна з апавяданьнем Ев. Марка—гадзіна трэцяя, панашаму—дзевятая раніцы. У шэсьць гадзін, панашаму дванаццаць, раптам усю зямлю пакрыла цьма, якая цягнулася тры гадзіны. Зьмеркла сонца (гэта не магло быць зацьменьне сонца, бо тады была поўня), настала ціша вялікая: быццам уся прырода прыхілілася да вялікае тайны, якая дзеялася на Галгофе. Сярод гэтае цішы, калі мукі Хрыстовы дасягнулі ўжо найбольшае меры Хрыстос выклікнуў: «Элоі, элоі, ламма савахвані», што значыць: «Божа Мой! Божа Мой! на што Ты Мяне пакінуў». Некаторыя з тых, што тут стаялі, перакруціўшы, што Ён сказаў, пачалі з насьмешкай гаварыць адзін аднаму: «Ці ня Ільлю кліча?» А калі Хрыстос, мучачыся ад смагі, сказаў: «Хачу піць», дык адзін з ваякаў пабег, змачыў воцтам губку і, насадзіўшы яе на трысьціну, паднёс да вуснаў Яго, кажучы разам з іншымі: «Паглядзімо, ці прыйдзе Ільля спасьці Яго».

Але вось надыходзіў і канец мукам Сына Божага (Ісус Хрыстос вісеў на храсьце ўсяго шэсьць гадзін). Прадчуваючы блізкую ўжо сьмерць, Ісус Хрыстос моцным голасам выклікнуў: „Отча! у рукі Твае аддаю дух Мой". Пасьля гэтага, сабраўшы апошнія сілы, вымавіў апошняе слова Сваё: „Совершышася" (збылося), і, схіліўшы на грудзі галаву, аддаў дух.

У мамант сьмерці Госпада зьявіліся многія дзіўныя знаменьні: затраслася ўся зямля, у храме Ерусалімскім разадралася - ад верхняга края да ніжняга— сьвяшчэнная заслона, распаліся каменьні, акдрыліся магілы і многія памершыя сьвятыя ўваскрэсьлі і па ўваскрасеньні Хрыста, прыйшлі ў Ерусалім і зьявіліся многім.

Усіх, хто быў на Галгофе, апанаваў вялікі страх. Усе пачалі пасьпешна разыходзіцца. Многія ў раскаяньні і з адчаю білі сябе ў грудзі і плакалі. Перапалохаліся і ваякі, якія сьцераглі Ісуса. Сотнік жа, бачачы землятрасеньне і ўсё, што было, у вялікім узва-



Сьмерць Ісуса Хрыста.

рушэньнl праславlў Бога l выклікнуў: «Узапраўды, гэты Праведнік быў Сын Божы!“

Вечарам гэтага дня, у шэсьць гадзін, пачыналася сьвята жыдоўскае. На сьвята ня можна было пакінуць павешаных на храстах (яны маглі мучыцца яшчэ l дзень l два). Дзеля гэтага першасьвяшчэньнікі прасілі Пілата пазволіць перабіць галені расьпятым, каб яны хутчэй памёрлі, каб можна было зьняць целы іх з храстоў. Пілат пазволіў. Прыйшлі ваякі, і ў першага разбойніка перабілі галені, і ў другога, расьпятага з Ім. Калі-ж падыйшлі да Ісуса і ўбачылі, што Ён ужо памёр, дык не перабівалі ў Яго галеняў. Толькі адзін з ваякаў прабіў Яму бок пікаю і—зараз-жа пацякла з раны кроў і вада (ёсьць здагадка, што Хрыстос памёр ад разрыву сэрца, які выкліканы быў нязвычайна цяжкімі душэўнымі ўзрушэньнямі).

Так скончыў Сваё жыцьцё на зямлі Ісус Хрыстос, Сын Божы, Які прыйшоў спасьці сьвет ад граха, праклцьця і сьмерці, і паказаць пуць да вечнага жыцьця, да вечнага шчасьця. Дзеля адкупленьня чалавецтва Ён перанёс найцяжэйшыя мукі—душэўныя і цялесныя. Хто засудзіў Яго на гэтыя мукі? Народ, які на працягу тысячагодзьдзяў быў узгадоўваны Богам, як абраны народ Божы, які быў прызначаны нясьці „сьвятло дзеля адкравеньня паганцам“. Тым цяжэйшае было праступства гэтага народу, але тым вышэйшая была ахвяра, прынесеная Хрыстом на Галгофе. Ад гэтае Божае ахвяры жывімся і мы, ахінаныя Яго чэсным храстом.

## 81. Пахаваньне Ісуса Хрыста.

Мат. XXVII, 57—66; Мрк. XVI, 42—47; Лук. XXIII, 50—56; Іоан. XIX, 38—42.

Прачыстае цела Госпада нядоўга заставалася на храсьце. Трэба было сьпяшацца пахаваць, бо праз тры гадзіны пачыналася сьвята. А „тая субота была дзень вялікі“. З дазволу Пілата, зьняў цела з храста і пахаваў у гэтым кароткім працягу часу адзін з тайных вучняў Госпада, нейкі Язэп з Арымафэі, сябра

сынэдрыёну, чалавек добры і справядлівы, які чакаў „Царства Божага“ (прысуд сьмерці для Хрыста быў пастаноўлены без яго ўдзелу). Язэпу памагаў другі тайны вучань Госпада — рабін Нікодым — той самы, які



Пахаваньне Ісуса Хрыста.

раней прыходзіў уначы на гутарку да Хрыста. І зьнялі яны з храста Цела Ісуса, ахінулі палатном і пахавалі каля Галгофы, у саду Язэпавым, у новым, высечаным у скале гробе, як-бы ў невялікай пячоры, дзе

яшчэ ніхто ніколі ня быў пахаваны. Гэта пячора была прыгатоўлена Язэпам для сябе, на дзень свайго пахаваньня. Уваход у гроб быў завалены вялізарным каменем.

Пры пахаваньні былі прысутнымі Марыя Магдаліна і Марыя Якаўлева. Яны бачылі, дзе было палажана Цела Ісусава. З тае прычыны, што дзеля пасьпешнасьці Цела Госпада пры пахаваньні ня было памазана араматамі, г. зн. пахнючымі масьцямі, як таго вымагаў звычай, абедзьве жанчыны ўмовіліся пайсьці дамоў, каб да сьвята прыгатовіць пахі і масьці, і ў першы дзень пасьля суботы, раніцай, памазаць імі Цела Госпада (у самую суботу закон забараняў што-колечы рабіць).

---

На другі дзень пасьля пахаваньня, г. зн. у суботу, першасьвяшчэньнікі і фарысэі, ня гледзячы на сьвята, зрабілі нараду, як скрыць ім усе сьляды выкананага страшнага дзела, каб ня было абурэньня ў народзе. Падчас нарады некаторыя з прысутных успомнілі, што «ашуканец гэты» (так яны называлі Хрыста), калі яшчэ быў жывы, прадказваў, што ўваскрэсьне на трэці дзень, і таму пастанавілі забясьпечыцца, каб «вучні Яго, прыйшоўшы ўночы, ня ўкралі Яго, а пасьля не сказалі народу: «уваскрос з мёртвых». «І будзе—кажуць—апошняе ашуканства горш за першае». Яны пайшлі да Пілата, расказалі, што іх непакоіць і прасілі даць стражу да гробу. Пілат адхіліў ад сябе гэтыя новыя клопаты і пазволіў ім самым распарадзіцца: «У вас—кажа—ёсьць стража, ідзеце, пільнуйце, як ведаеце». Ня гледзячы на сьвятасьць вялікай суботы, нарушэньне якой так часта закідалі Хрысту, яны пайшлі, паставілі стражу і прылажылі пячатку сынэдрыёну да каменя, які зачыняў уваход у пячору.

Так зрабіўшы, яны нехаця далі доказ праўдзівасьці чуда ўваскрасеньня Хрыста, бо калі-б вучні ўкралі цела, дык пячатка была-бы сарвана, тым ча-

сам з Евангельля ня відаць, каб гэта было так (ваякі першыя сказалі-б), дый і хрысьціянскае паданьне не сьцвярджае, каб пячатка была сарвана.

Будучы целам у гробе, Хрыстос у той-жа самы час Духам Сваім зыйшоў у пекла, места цемры і мукаў памёршых, — зыйшоў, каб там прапаведаць усяму старазаветнаму чалавецтву, пачынаючы ад самых цяжкіх грэшнікаў і канчаючы праведнікамі, якія з верою чакалі прыходу Хрыста,—прапаведаць тайну адкупленьня і пачатак новага жыцьця ў вечным Царстве Нябесным.

Для ўсіх адчынены вароты раю, як падчас найцяжэйшых мукаў, глыбокаю верою, адчыніў іх сабе павешаны на храсьце разбойнік, выклікнуўшы: «Успомні мяне, Госпадзі, калі прыйдзеш у Царства Тваё!».

# Гісторыя прабываньня Ісуса Хрыста на зямлі ад Уваскрасеньня да Ўзьнясеньня Яго на неба.

## 82. Уваскрасеньне Ісуса Хрыста.

Мат. XXVIII, 1—15; Мрк. XVI, 1—11; Лук. XXIV, 1—12; Іоан. XX, 1—18.

У першы дзень пасьля суботы, ці трэці па сьмерці, глыбокаю раніцаю Гасподзь Ісус Хрыстос сілаю Свайго Божаства, абкружаны нябесным зьзяньнем, чудоўна уваскрос з мёртвых.

Пры гэтым сталася вялікае землятрасеньне. З неба зыйшоў Ангел Госпадні, які адваліў камень, што закрываў уваход у пячору. Выгляд Ангела быў сьветлы як маланка, і адзеньне белае, як сьнег. Ваякі, якія нясьлі варту, ад страху пападалі на зямлю і зрабіліся як няжывыя. Ачуняўшы, пабеглі ў горад паведаміць аб усім першасьвяшчэньнікаў. Тыя зараз-жа склікалі нараду, запрапанавалі ваякам грошы і навучылі іх казаць, быццам уночы, калі яны спалі, прыйшлі вучні Ісусавы і ўкралі цела Яго. „А калі даведаецца аб гэтым Пілат, — сказалі - мы пераканаем яго і вам ня будзе ніякае кары". Ваякі ўзялі грошы і зрабілі, як былі намоўлены. „І праняслося між юдэямі слова іхнае (няпраўдзівае) ажно да сяньняшняга дня", заўважвае Евангелісты.

Тым часам ішлі на магілу Госпада —гэта было яшчэ вельмі рана — Марыя Магдаліна і некаторыя іншыя жанчыны, нясучы прыгатаваныя масьці (мvро), каб памазаць Цела. Жанчыны ня ведалі, што ля магілы пастаўлена стража і таму дарогаю вельмі непакоіліся, кажучы: „Хто адваліць нам камень ад дзьвярэй гробу (камень быў вялікі)"? Марыя Магдаліна першая пры-

йшла на магілу. Калі яна ўбачыла, што камень адвалены ад гробу, дык адразу, нават не ўваходзячы ў пячору, павярнула назад у Ерусалім, каб паведаміць Апосталаў Пятра і Іоанна. „Узялі Госпада з гробу



Уваскрасеньне Ісуса Хрыста.

і ня ведаем, дзе палажылі Яго“, спосьпеху сказала яна ім. Тыя схапіліся, каб зараз-жа пабегчы на магілу. Але вось падыйшлі да магілы іншыя мvраносіцы. Гэта былі: Іоанна, Марыя, маці Якава і іншыя.

Глядзяць — камень адвалены, і на ім сядзіць Ангел. Яны вельмі перапалохаліся. Але Ангел прамовіў да іх: „Ня бойцеся! Я ведаю—вы шукаеце Ісуса расьпятага. Ён уваскрос. Пайдзеце, паглядзеце месца, дзе ляжаў Гасподзь“. Калі яны ўвайшлі ў пячору, дык убачылі другога Ангела, які сказаў ім: „Што шукаеце жывога між мёртвымі? Ён уваскрос. Яго няма тут. Вось месца, дзе быў паложаны. Пайдзеце хутчэй і скажэце вучням Яго, што Ён уваскрос і йдзе перад вамі ў Галілею. Агорнутыя страхам і радасьцю, жанчыны-мvраносіцы пабеглі ў места да Апосталаў. Чуюць яны іх апавяданьне і проста ня вераць сабе. Вучыцель уваскрос? Ангелы ля гробу Госпадавага?» І паказаліся ім—кажа Евангелісты Лука - словы жанчын пустымі, і не паверылі ім».

Тымчасам на магілу беглі Пётр і Іоанн. Апошні аперадзіў Пятра і прыбег першым. Нахіліўшыся ў пячору, але не ўваходзячы ў яе, Іоанн убачыў толькі ляжаўшыя палатніны. Тут падходзіць Пётр. Гэты ўвайшоў у пячору, але таксама ўбачыў толькі палатніны і хустку, што была на галаве Яго, і ня разам з палатнінай, але асобна скручаную на другім месцы. Тады ўвайшоў і другі вучань, што раней прыйшоў да магілы (Іоанн), і ўбачыў і ўвераваў. Абодва вучні пасьля гэтага вярнуліся дамоў. У пячоры засталася толькі прыбегшая сьледам за Пятром і Іоаннам Марыя Магдаліна. Яна стаяла тут і ціха плакала. „Жанчына! чаго ты плачаш?“ — пачуўся раптам нечы голас. Уздрыгнуўшы, яна нахілілася да гробу і бачыць двох Ангелаў у белым адзеньні, седзячых адзін у галовах, другі ўнагах, дзе ляжала Цела Ісуса. Яна кажа ім: «Забралі Госпада майго, і ня ведаю, дзе палажылі Яго». Сказаўшы гэтае, Марыя аглянулася назад і ўбачыла, што стаіць Ісус, але не пазнала, што гэта Ісус. І кажа ёй Ісус: „Жанчына! чаго ты плачаш? каго шукаеш?“ Яна, думаючы, што гэта садоўнік, кажа Яму: «Калі ты вынес Яго, скажы мне, дзе ты палажыў Яго?» Ісус кажа ёй: «Марыя!» Яна па голасу адразу пазнала Яго. Зьдзіўленая і радасна ўзварушаная, Марыя міма свае волі ўсклікнула: „Мой Гасподзь і Вучыцель!“ Пры гэтых словах яна кінулася да ног Яго і сьлязьмі

радасьці хацела абмыць ногі Яго, але Гасподзь сказаў ёй: «Не дакранайся да Мяне, бо Я яшчэ ня ўзыйшоў да Айца Майго, але ідзі да братоў Маіх і скажы ім: «узыходжу да Айца Майго і Айца вашага і Бога Майго і Бога вашага».

Калі Марыя Магдаліна вярталася ад гробу ў Ерусалім, яна спаткалася з другой Марыяй. Да іх далучыліся і іншыя жанчыны, якія прыходзілі да гробу. Раптам перад імі стаў Ісус і сказаў: «Радуйцеся!» Узварушаныя і перапалоханыя, яны ўхапіліся за ногі Яго, каб іх цалаваць, і пакланіліся Яму. Тады кажа ім Ісус: «Ня бойцеся! пайдзеце, абвясьцеце вучням Маім, каб ішлі ў Галілею — там яны Мяне ўбачаць».

Марыя Магдаліна і іншыя жанчыны расказалі Апосталам, што Гасподзь уваскрос з мёртвых, але тыя не паверылі словам іх.

Як гаворыць паданьне, Гасподзь раней за ўсіх зьявіўся Сваёй Маці.

### Трапар сьвята.

Хрⷭ҇то́съ воскре́се и҆зъ ме́ртвыхъ, сме́ртїю сме́рть попра́въ, и҆ сꙋ́щымъ во гробѣ́хъ живо́тъ дарова́въ.

**Хрыстос уваскрос з мёртвых, зьніштожыўшы сьмерцю смерць, і падаючы жыцьцё тым, што знаходзяцца ў грабох.**

### 83. Уваскросшы Хрыстос зьяўляецца двом вучням, таксама Апосталам у дзень уваскрасеньня.

Марк. XVI, 12—13; Лук. XXIV, 13—48; Іоан, XX, 19—23.

У дзень уваскрасеньня два вучні Хрыстовы, Лука і Кляопа, ішлі ў вёску Эмаус, недалёка ад Ерусаліму (11—12 клм.). Дарогаю яны, сумуючы, гутарылі між сабою аб усіх нязвычайных здарэньнях гэтага дня. Раптам падходзіць да іх Ісус, хоць яны не пазналі Яго, бо вочы іх былі стрыманы. Ісус і кажа: «Аб чым гэта вы развражаеце між сабою? і чым засмучаны?» Кляопа адказвае: «Ці-ж Ты адзін ня ведаеш, што

сталася ў Ерусаліме ў гэтыя дні?“ Гасподзь тады пытаецца: «А што?» У адказ абодва яны пачалі гаварыць, што вось быў Ісус Назаранін—Прарок, «моцны дзелам і словам перад Богам і ўсім народам», але архірэі і начальнікі жыдоўскія выдалі Яго на сьмерць і расьпялі Яго». А мы—кажуць—спадзяваліся, што Ён ёсьць Той, Які збавіць Ізраіля. Вось ужо трэці дзень, як Ён памёр і пахаваны. Дарэмныя былі нашыя надзеі. Хоць праўда,—некаторыя з нашых жанчын зьдзівілі нас, кажучы, што Ён жывы, бо як хадзілі раніцай на магілу, дык не знайшлі Яго там, да таго-ж бачылі Ангелаў, якія сказалі, што Ён уваскрос. Тады Ісус, закінуўшы ім „бязмыснасьць і павольнасьць сэрца“, пачаў тлумачыць ім усё, што казана было прарокамі аб Хрысьце ў Старым Завеце, пачынаючы ад Майсея: „Ці-ж ня гэтак і трэба было цярпець Хрысту і ўвайсьці ў славу Сваю?“ Вучні з вялікаю ўважлівасьцю слухалі Спадарожніка і не агледзіліся, як падыйшлі да вёскі. Хрыстос паказаў від, што хоча йсьці далей. Але яны затрымлівалі Яго, кажучы, што вось і вечар ужо падыходзіць. Ён увайшоў у дом і застаўся з імі. І калі сядзеў за сталом з імі, то, ўзяўшы хлеб, багаславіў, паламаў і падаў ім І тады адкрыліся іх вочы і яны пазналі Яго. Але Ён стаў нявідным для іх. І пачалі дзівіцца, як гэта не пазналі Яго, калі гутарылі з Ім дарогаю. «Ці-ж не гарэла ў нас сэрца нашае, калі Ён гаварыў да нас у дарозе і калі выясьняў Пісаньне?» —казалі яны адзін аднаму.

Узрадаваныя, што бачылі Госпада ўваскрошшага, Лука і Кляопа сьпяшаюцца ў Ерусалім падзяліцца сваёю радасьцю з Апосталамі. Яны знайшлі разам усіх адзінаццаць і некаторых вучняў, якія былі з імі: яны гаварылі, што запраўды Гасподзь уваскрос і зьявіўся Сіману. У сваю чаргу Лука і Кляопа расказалі, што здарылася з імі ў дарозе, і як пазналі Яго пры ламаньні хлеба.

Калі яны так гутарылі (а дзьверы дому таго былі зачынены, бо сабраныя баяліся жыдоў), раптам стаў сярод іх Сам Хрыстос і прывітаў словамі: «Мір вам». Яны, здумеўшыся і спалохаўшыся, падумалі, што бачаць не Яго Самога, а Дух Яго. Але Ісус сказаў ім:

«Чаго здумеліся? І чаму такія думкі ўваходзяць у сэрцы вашыя? Паглядзеце на рукі Мае і на ногі Мае: гэта Я Сам. Ашчупайце Мяне і разгледзьце, бо дух ня мае цела і касьцей, а Я—як бачыце—маю». Сказаўшы гэта, Хрыстос паказаў ім рукі і ногі Свае. Але яны ад радасьці яшче ня верылі і дзівіліся. Тады, каб даць ім новы доказ, што перад імі стаіць ня Дух, Госпадзь папрасіў есьці. Яны падалі Яму частку рыбы і сотавага мёду. Хрыстос, узяўшы, еў перад імі. Пасьля гэтага пачаў гаварыць аб тым, як выпаўнілася ўсё, напісанае аб Ім у Законе Майсеевым і ў прароках. «І расчыніў ім розум дзеля зразуменьня Пісаньня». На заканчэньне Хрыстос сказаў ім: „Так напісана і так належала цярпець Хрысту і ўваскроснуць з мёртвых на трэці дзень, і так мае быць прапаведана ўва ўсіх народах пакаяньне і адпушчэньне грахоў у імя Яго. Вы-ж сьведкі гэтага. Таму і пасылаю абяцанае Айцом Маім на вас: прымеце Духа Сьвятога (пры гэтых словах Госпадзь дыхнуў на іх): каму адпусьціце грахі, таму адпусьцяцца, а на кім пакінеце, на тым застануцца». Сказаўшы паўторна: «Мір вам!» Госпадзь стаў нявідным.

## 84. Паўторнае зьяўленьне Ісуса Хрыста Апосталам пры Ап. Фоме.

Іоан. XX, 24—29.

Аднаго толькі Ап. Фамы — так званага Блізьнюка—ня было з імі, калі зьявіўся ім Ісус. Другія вучні пераказалі Фаме: „Мы бачылі Госпада“. Але ён ня верыў і толькі паўтараў: „Не паверу, пакуль не дакнуся пальцам маім да ранаў Яго ад гваздоў, і не ўлажу рукі мае ў бок Яго, прабіты пікаю“.

Прайшоў тыдзень. У першы дзень наступнага тыдня[1]) Апосталы сабраліся ізноў усе разам; быў і Фама з імі. Як і ў той раз, дзьверы пакою былі за-

[1]) Гэты дзень або „васкрасеньне“ ці „нядзеля“—па-беларуску—стаў ужо сьвяшчэнным днём для Апосталаў, а ад іх пасьля і для ўсяго хрысьціянскага сьвету.

чынены. Раптам зьявіўся і стаў пасярэдзіне іх Гасподзь і сказаў усім: „Мір вам!“ Пасьля Гасподзь зьвярнуўся да Ап. Фамы і сказаў яму: „Дай сюды палец твой і паглядзі рукі Мае; дай руку тваю і ўлажы ў бок Мой, і ня будзь няверным, але верным“. Фама паслухаўся, і ашчупаў пальцамі раны Госпада. „Гасподзь мой і Бог мой!“ з глыбокім перакананьнем і вераю выклікнуў Ап. Фама, і пакланіўся Яму. «Ты паверыў — сказаў яму Хрыстос — бо бачыў Мяне, але шчасьлівыя тыя, якія ня бачыўшы паверацъ“.

І многа—дадае Евангелісты—зрабіў Ісус чудаў перад вучнямі Сваімі, аб якіх не напісана ў сьв. Евангельлі. „А гэтае ўсё напісана, каб вы паверылі, што Ісус ёсьць Хрыстос, Сын Божы, і веруючы мелі жыцьцё ў імя Яго“.

## 85. Зьяўленьне Ісуса Хрыста Апосталам на моры Тывэрыядзкім. Ўзнаўленьне апостальскае годнасьці Ап. Пятра.

Іоан. XXI, 1—25.

Калі скончылася сьвята Пасхі, Апосталы пайшлі ў Галілею, куды Хрыстос накіраваў іх праз Ангела і жанчын-мvраносіц. Там яны, чакаючы ўрачыстага зьяўленьня Хрыста, ізноў заняліся кожын сваёю працаю.

Аднаго разу Сіман Пётр, Фама, Нафанаіл з Каны Галілейскае, сыны Завядзеевы і яшчэ двох іншых з вучняў Яго лавілі рыбу на моры Тывэрыядзкім. Працавалі цалюсенькую ноч, а не злавілі нічога. На сьвітаньні—бачаць—стаіць на беразе нейкі Чалавек. Яны не пазналі Яго. А гэта быў Хрыстос. Вось Хрыстос і кажа: „Дзеці! Ці ёсьць у вас якая-небудзь ежа?“. Яны адказалі: „Няма“. Тады Ён сказаў: „Закіньце сеці на правы бок чоўна і зловіце“. Яны закінулі, але ўжо не маглі выцягнуць сеці: так многа было ў іх рыбы. Здарэньне гэта мімаволі напомніла ім падобны выпадак з недалёкага мінулага, калі таксама, па слове Госпада, мелі чудоўна вялікі лоў. „Гэта Гасподзь!— кажа Пятру Іоанн—найлюбшы вучань Госпада. Пётр, ня чуючы сябе ад радасьці, хапае першую вопратку,



Зьяўленьне Ісуса Хрыста Апосталам на моры Тывэрыядзкім.

якая была на борце, падперазаўся (бо быў голы) і кінуўся ў мора, каб хутчэй дабрацца да берагу і пакланіцца Госпаду. Іншыя вучні (яны былі недалёка ад берагу, локцяў каля 200) прыехалі ў чоўне, цягнучы за сабою сеці. Выйшаўшы на бераг, усе радасна прывіталі Госпада. А на беразе ўжо быў разьведзены агонь, на якім пяклася рыба; быў тут і хлеб. Ісус Хрыстос загадаў прынясьці і тае рыбы, якую цяпер злавілі. Пётр пайшоў і выцягнуў на землю сець, поўную вялікіх рыбаў; іх было сто пяцьдесят тры, і пры гэтым мностве сець не прарвалася.

Усе селі абедаць. Гасподзь узяў хлеб і даў Апосталам; таксама і рыбу. Усе елі моўчкі; ніхто не адважыўся спытацца ў Яго: «Хто Ты?» бо ўсе ведалі, што гэта Гасподзь.

Падчас абеду Гасподзь пытаецца ў Пятра: ,,Сіман Іонін! ці любіш ты Мяне больш, як яны?' Пётр кажа Яму: ,,Так, Госпадзі! Ты ведаеш, што я люблю Цябе". Ісус кажа яму: ,,Пасі авечкі Мае". Пётр ведаў, чаму Гасподзь так пытаецца ў яго. То-ж тры разы выракаўся Пётр Свайго Вучыцеля, калі ворагі ўзялі Яго, каб загубіць. Пётр справядліва лічыў сябе пазбаўленым у Госпада даверу, без якога ня мог заставацца Апосталам. Вось чаму Хрыстос зьвяртаецца цяпер да аднаго толькі Ап. Пятра, а не да ўсіх Апосталаў. Бачачы веру і адданасьць Пятра, Гасподзь хоча вярнуць яму яго Апостальства. Даручэньнем ,,Пасі авечкі Мае" Гасподзь выбачаў Пятру ягонае зраканьне і вяртаў годнасьць Апостала.

Тры разы—і ўсё аднолькава пытаецца Гасподзь у Пятра, ці любіць ён Яго, і на станоўчае сьцьверджаньне апошняга, што любіць, Гасподзь тры разы паўтараў яму: „Пасі авечкі Мае". Гасподзь не хацеў мучыць Ап. Пятра, а толькі хацеў, каб ён трыкротным сьведчаньнем загладзіў сваю віну перед Ім. Пётр напасьледак быў засмуціўшыся, ня ведаючы як і адказваць, ,,Госпадзі! кажа: Ты ўсё ведаеш. Ты ведаеш, што я люблю Цябе".—,,Пасі авечкі Мае!" адказаў яму Гасподзь. Пасьля таго Гасподзь сказаў Пятру: ,,Калі ты быў малады, дык падпяразваўся сам і хадзіў, куды хацеў; а як будзеш стары, дык выцягнеш рукі твае,

і другі цябе падпяража і павядзе, куды ня схочаш". Гэтымі словамі Гасподзь паказваў, якою сьмерцю Пётр праславіць Бога[1]). Сказаўшы гэтае, Ісус пайшоў уздоўж берагу і паклікаў Пятра: „Ідзі за Мною". Пётр пайшоў, і пад уражаньнем толькі што выслуханага прадказаньня спытаўся, паказваючы на Іоанна, які йшоў за імі: „Госпадзі! а ён што?» — „Ісус кажа яму: „Калі-б Я хацеў, каб ёнператрываў пакуль прыду, што табе да гэтага? Ты йдзі за Мною!" Хрыстос якбы так гаварыў: калі-б Я захацеў, каб Іоанн ніколі не памёр, а застаўся жывы да другога Майго прыходу, дык што табе, Пётр, да гэтага? Словы Госпада вучні зразумелі літаральна, чаму вось і пайшла гутарка між вучнямі, што Іоанн не памрэ, хоць Гасподзь зусім гэтага не сказаў (Іоанн памёр сваёю сьмерцю ў глыбокай старасьці, у пачатку II веку пасьля Р. Х.).

### 86. Зьяўленьне Ісуса Хрыста' Апосталам і больш як 500 вучням на гары Галілейскай.

Мат. XXVIII, 16—20; Мрк. XVI, 15—18.

Найбольшаму ліку Сваіх вучняў Гасподзь зьявіўся на аднэй гары ў Галілеі — там, дзе пераважна вучыў да Сваей сьмерці. Апрача Апосталаў, было тут больш як 500 Ягоных вучняў і пасьледавальнікаў. Усе яны з радасьцю чакалі Госпада, Які Сам вызначыў тут сабрацца. Калі зьнячэўку Хрыстос стаў пасярод іх, яны пакланіліся Яму. Аднак раптоўнае зьяўленьне Хрыста выклікала ў некаторых сумненьне. Яны не разумелі той перамены, якая сталася з цялеснай істотай Хрыста з часу Яго слаўнага ўваскрасеньня, — не разумелі, бо ня мелі яшчэ Духа Сьвятога, Які навучыў-бы іх усяго.

Калі Хрыстос падыйшоў бліжэй, сабраныя пачулі з вуснаў Яго такія вялікія, уладныя словы: «Да-

[1]) Як гаворыць паданьне, Ап. Пётр памёр падобна да Хрыста — быў расьпяты на храсьце, толькі галавою ўніз.

дзена Мне ўсялякая ўлада на небе і на зямлі. Таму ідзеце, навучайце ўсе народы, хрэсьцячы іх у імя Айца, і Сына, і Сьвятога Духа, навучаючы іх выпаўняць усё, што Я загадаў вам. Хто ўверуе і ахрысьціцца, спасёны будзе; хто-ж ня ўверуе, засуджаны будзе. Для ўвераваўшых будуць гэтыя знаменьні (чуды): імем Маім дэманаў выганяцімуць, новымі мовамі гаварыць будуць, зьмеяў браць будуць, і калі-б што сьмяротнае выпілі — не зашкодзіць ім, паложаць рукі на хворых, і тыя здаровымі будуць».

Вялікі страх агарнуў Апосталаў, калі яны пачулі гэты наказ: Гасподзь гаварыў аб Сваёй уладзе ня толькі на зямлі, але і на небе; Гасподзь надзяляў іх такою вялікаю сілаю; напасьледак, Гасподзь пасылаў іх — бедных, простых, неадукаваных людзей, мо' ніколі не пераступаўшых межаў свайго краю, — пасылаў навучаць словам Евангельля «ўсе народы». Ня дзіва, што іх апанаваў страх і замяшаньне. Аднак Гасподзь тут-жа заспакоіў іх абяцаньнем: „Я буду з вамі ўва ўсе дні да сканьчэньня веку. Амінь».

Апрача гэтага зьяўленьня, Гасподзь зьявіўся яшчэ Апосталу Якаву, як аб гэтым успамінае Апостал Павал (І Кар. XV, 7), хаця калі і дзе зьявіўся— няведама.

Адыходзячы Гасподзь загадаў Апосталам сабрацца ў Ерусаліме і там чакаць, пакуль не агарнуцца сілаю звыш.

### 87. **Узьнясеньне Госпада на неба** (Ушэсьце).

Мрк. XVI, 19; Лук. XXIV, 49—53; Дзеян. I, 1—26.

У 40 дзень па ўваскрасеньні Госпада Апосталы былі ўсе сабраныя ў аднэй Ерусалімскай сьвятліцы. Раптам паміж імі стаў Гасподзь, вітаючы, як заўсёды, словамі: «Мір вам». Пачалася (апошняя) разьвітальная гутарка. Гасподзь паўтарыў перад імі ўсё Сваё вучэньне і паказаў. як споўніліся на Ім усе праракаваньні Старога Завету — ўсё, .што напісана аб Ім „у законе Майсея, у прарокаў, і у псалмох".

У прамове Хрыста да вучняў было яшчэ шмат незразумелага для іх, таму Гасподзь «адкрыў ім розум дзеля зразуменьня Пісаньня». І сказаў: ,,Так напісана, і так належала Хрысту пацярпець і ўваскроснуць з мёртвых у трэці дзень, і так будзе прапаве-



Узьнясеньне Госпада на неба.

дана ў імя Яго пакаяньне і дараваньне грахоў сярод усіх народаў, пачынаючы ад Ерусаліму. Вы-жа сьведкі таму. І вось Я пашлю вам абяцанае Айцом Маім''. Апосталы з усёю праніклівасьцю слухалі Вучыцеля, больш і больш усьведамляючы сабе тайну Божаскага пасольства Яго ў сьвет і тайну будаўніц-

тва заснаванага Ім Царства Божага на зямлі. Аднак, блізкасьць расстаньня не магла ня нудзіць іх сэрца, хаця і цешылася яно тым абяцаньнем, якое даў Ім Гасподзь.

Калі гутарка скончылася, Гасподзь вывеў вучняў з места і пайшоў з імі ў кірунку Віфаніі, на гару Аліўную. „Ці ня ў гэтым толькі часе, Госпадзі, адбудуеш Ты Царства Ізраілю?“ — спыталіся дарогаю ў Госпада Яго вучні, да апошняе мінуты не пакінуўшыя пагляду на Хрыста, як на заснавальніка перш за ўсё зямнога, магутнага і слаўнага Царства Ізраіля. Ажно дасюль яны заставаліся сынамі больш „царства Ізраіля“, як сынамі „Царства Божага“ і насьледнікамі „Царства Нябеснага!“ Хрыстос адказаў ім: „Ня вам ведаць час ці пару, што вызначыў Айцец у ўладзе Сваей. Але прымеце сілу, як зыйдзе на вас Дух Сьвяты, і будзеце сьведчыць аба Мне ў Ерусаліме і ўва ўсёй Юдэі і Самарыі, ды ажно па край зямлі“.

Спадарожныя падняліся на самы верх Аліўнае гары. Які чароўны від! Пад нагамі разлёгся пышны, багаты Ерусалім: там на схіле гары ўся цьвітучая, прыгожая Віфанія, там блакітныя горы, між імі быстраводны Іардан, а там далёкае, далёкае сіняе мора... Колькі разоў быў тут на гары Гасподзь з Сваімі вучнямі! Колькі ўспамінаў і думак нёс у душу гэты краявід! Аднак агорнутых сумам вучняў Госпада нішто цяпер ня можа захапіць ці ўзварушыць.

Прыйшоў і час расстаньня. Паўтарыўшы абяцаньне паслаць Духа Сьвятога, Які навучыць іх усяго і дасьць ім сілу прадоўжыць Яго дзела на зямлі, Іісус Хрыстос, схрэсьціўшы рукі, багаславіў іх і, калі багаслаўляў, пачаў ад іх аддаляцца і ўзнасіцца на неба. Апосталы ў глыбокім маўчаньні пакланіліся Госпаду. Але вось зьявіўся сьветлы вобалак, які і ўкрыў Яго. У той-жа час сталі перад імі двое мужоў у белых вопратках, якія сказалі: „Мужы Галілейскія! Што вы стаіцё, узіраючыся на неба? Гэты Іісус, узяты ад вас на неба, прыйдзе гэтак сама, як бачылі вы Яго, ўзыходзячы на неба“.

І пакланіліся Апосталы Узьнятаму, і з вялікаю радасьцю вярнуліся ў Ерусалім. Тут усе яны знаходзіліся неадлучна, зьбіраючыся для малітвы, разам з Божаю Маткаю, братамі Госпада і іншымі веруючымі, і чакаючы абяцанага ім Уцяшыцеля - Духа Сьвятога.

---

У гэтым часе на сабраньні Апосталаў і вучняў Госпадніх (каля 120) быў абраны ў лік Апосталаў, замест Юды Іскарыёта, Матфій, адзін з блізкіх Госпаду і Апосталам вучняў, які быў сьведкаю ўваскрасеньня і ўзьнясеньня Госпада на неба.

### Трапар Узьнясеньня.

Вознесл҃ся еси во славѣ, Хрїсте Боже нашъ, радость сотворивый оученикѡмъ, ѡбѣтованїемъ Ст҃агѡ Дх҃а, извѣщеннымъ имъ бывшымъ бл҃гословенїемъ: ꙗкѡ Ты еси Сн҃ъ Бж҃їй, Избавитель мїра.

**Ты ўзьняўся ў Славе, Хрысьце Божа наш, узрадаваўшы вучняў абяцаньнем Сьвятога Духа, — пасьля таго, як Тваё багаславеньне ўзмацавала іх веру, што Ты — Сын Божы, Збавіцель сьвету.**

### 88. Зыходжаньне Сьвятога Духа на Апосталаў.

Дзеян. аддз. II.

Праз дзесяць дзён пасьля Узьнясеньня Госпада было жыдоўскае сьвята Пяцьдзесятніцы (у памяць Сінайскага законадаўства). Для Апосталаў гэты дзень быў падвойным сьвятам, бо Пяцьдзесятніца прыйшлася на першы дзень тыдня, у які ўваскрос Хрыстос. З прычыны сьвята ў Ерусалім прыйшло шмат людзей з самых далёкіх краінаў.

Апосталы зраньня былі сабраныя ўсе у сьвятліцы, дзе маліліся. Было каля трэцяе гадзіны, панашаму 9-ая раніцы. Зьнячэўку воддаль пачуўся нейкі шум, як-бы з неба, быццам ад наляцеўшага буйнага

ветру. Шум усё павялічвауся і хутка напоўніў ўвесь дом, у якім былі Апосталы. Потым увесь пакой асьвятліла нібы полымя, і над кожным з Апосталаў паказаліся языкі, быццам агнявыя. І напоўніліся ўсе Апосталы Духа Сьвятога, і пачалі кожын гаварыць на розных новых мовах (якіх раней ня ведалі) — так,



Зыходжаньне Сьвятога Духа на Апосталаў.

як Дух Сьвяты даваў ім прамаўляці. Яны пачулі сябе з новымі духоўнымі сіламі, як-бы зноў народжанымі да жыцьця. Усё раней незразумелае ў вучэньні Госпада цяпер станавілася для іх ясным і зразумелым. Нейкая нястрыманая сіла цягнула іх спаведваць Хрыста і абвясьціць Яго Слова.

Тым часам каля дому, дзе знаходзіліся Апосталы, сабраўся нязьлічоны натоўп людзей, якіх прыманіў сюды чуты шум. У натоўпе было з розных краінаў шмат чужаземцаў, прыйшоўшых у Ерусалім адны — дзеля малітвы, другія — дзеля гандлю падчас сьвята (былі з Парфіі, Мідыі, Фрыгіі, Лівіі, Эгіпту, Аравіі, Крыту і іншых). Калі Апосталы выйшлі да народу і пачалі гаварыць да ўсіх на розных мовах, дык гэта выклікала вялікае зьдзіўленьне, бо Галілейскія рыбаловы былі ведамы ўсім, як людзі простыя, неадукаваныя, якія маглі гаварыць толькі сваёю роднаю моваю. Тыя з натоўпу, якія ня ведалі Апосталаў, пачалі сьмяяцца над імі, кажучы, што яны ўпіліся маладым віном. Тады да ўсіх зьвярнуўся Апостал Пётр і сказаў: «Мужы юдэйскія! і ўсе жыхары Ерусаліму! Няхай будзе вам гэта ведама і выслухайце словы мае: яны (Апосталы) ня п'яныя, як думаеце, бо яшчэ толькі трэцяя гадзіна дня. А ёсьць тое, што сказана прарокам Іоілем: „І будзе ў апошнія дні, кажа Бог, выльлю Духа Майго на кожную істоту, і будуць прарочыць. Мужы Ізраільскія! выслухайце словы гэтыя. Ісуса Назарэя—мужа, праслаўленага між вамі ад Бога сілаю і чудамі, якія тварыў праз Яго Бог сярод вас, як і самі вы ведаеце, — Яго вы ўзялі і, рукамі беззаконных прыбіўшы гваздамі, забілі... Вось Яго Бог уваскрасіў, вызваліўшы з мукаў сьмерці, і ўсе мы сьведкі гэтага. Вось узьнесёны сілаю Бога дый узяўшы ад Айца абяцаньне Духа Сьвятога, Ён падаў тое, што цяпер бачыце і чуеце. Няхай жа цьвёрда ведае ўвесь дом Ізраіля, што Бог зрабіў Госпадам і Хрыстом Яго, гэтага Ісуса, Якога вы расьпялі“. Гарачая прамова Апостала Пятра ўзварушыла ўвесь народ, і многія пыталіся ў Яго і іншых Апосталаў: «Што нам рабіць, мужы-браты?» Тады Пётр сказаў ім: „Пакайцеся, ды няхай кожын з вас ахрысьціцца ў імя Ісуса Хрыста дзеля адпушчэньня грахоў, і атрымаеце дар Духа Сьвятога“. І прынялі словы Яго, і хрысьціліся. У той дзень далучылася да Апосталаў каля трох тысяч людзей. І разьняслі яны вестку аб усім, што бачылі і чулі, ва ўсе канцы сьвету.

Усе веруючыя ў Ерусаліме жылі разам і ўсё ў іх было супольнае. Яны прадавалі дабро сваё і дастаткі, і дзялілі між усімі, як каму было трэба. Кожын дзень усе аднадушна маліліся ў храме, па дамох-жа зьбіраліся для ламаньня хлеба (прычашчэньня), у радасьці і прастаце сэрца славячы Бога і маючы ласку ў народзе. Гасподзь-жа штодня дадаваў Царкве тых, што збаўляліся.

Так паўстала першая Апостальская Хрысьціянская Царква ў Ерусаліме. Яна зьявілася тым асяродкам, скуль вера Хрыстова пашыралася ўва ўсе канцы сьвету.

Нова-Заветная Царква захавала сьвята Пяцьдзесятніцы, але ўспамінае ў гэты дзень не ўстанаўленьне Сінайскага законадаўства, а зыходжаньне Сьвятога Духа на Апосталаў. Пяцьдзесятніца называецца яшчэ **Тройцыным Днём**, бо ў гэты дзень мы праслаўляем Сьвятую Тройцу (у беларусаў — Сёмуха).

## Трапар сьвята.

Благословéнъ є҆сѝ, Хрⷭ҇тѐ Бж҃е нáшъ, и҆̀же премꙋ̑дры ловцы̀ ꙗ҆влéй, низпослáвъ и҆̀мъ Дх҃а Ст҃áго, и҆ тѣ̑ми оу҆ловлéй вселéннꙋю: Человѣколю́бче, слáва Тебѣ̀.

**Багаслаўлёны Ты, Хрысьце Божа наш, што простых рыбакоў выявіў прамудрымі, паслаўшы ім Сьвятога Духа, і праз іх прывёў да веры ўвесь сьвет: Чалавекалюбча, слава Цябе!**

# ЗЬМЕСТ.


§§ Стр.

1. Ражаство Найсьвяцейшае Дзевы Марыі. . 3
2. Уводзіны ў храм і ўзгадаваньне Найсьвяцейшае Дзевы Марыі. . —
3. Зьяўленьне Ангела сьвяшчэньніку Захарыі і прадказаньне аб нараджэньні Іоанна Прадцечы. . . . . . . 6
4. Дабравешчаньне Божай Маці. Адведзіны праведнае Елізаветы. 7
5. Ражаство Іоанна Прадцечы. . . . . . . 9
6. Ражаство Іісуса Хрыста. Пакланеньне Яму пастухоў. . . . . . 10
7. Сустрэча Госпада Іісуса Хрыста ў храме Ерусалімскім. . . . 13
8. Пакланеньне Іісусу Хрысту ўсходніх мудрацоў. Іосіф і Марыя з Іісусам бягуць у Эгіпэт. Паварот іх з Эгіпту. . 16
9. Дванаццацігадовы Іісус у храме . . . . 19
10. Іоанн Прадцеча і ягоная пропаведзь. . . 20
11. Вадохрышча. . . . . 21
12. Спакушэньне І. Хрыста д'яблам у пустыні. . 23
13. Сьведчаньне Іоан. Хрысьціцеля аб Іісусе Хрысьце. Першыя вучні Яго . . . . . 24

§§ Стр.

14. Першае чуда ў Кане Галілейскай . . . . 25

**Першы год служэньня Іісуса Хрыста.**

15. Падарожа Іісуса Хрыста ў Ерусалім на сьвята Пасхи. Выгнаньне гандляроў з храму. . . . . . . . 26
16. Гутарка Іісуса Хрыста з Нікадэмам. . . . 27
17. Узяцьце Іоанна Хрысьціцеля ў вастрог. Падарожа І. Хрыста ў Галілею. Гутарка Яго з самаранкаю. . 28
18. Чудоўны лоў рыбы. . 31
19. Чудоўнае аздараўленьне спараліжаванага . 32

**Другі год служэньня Іісуса Хрыста.**

20. Другая Пасха. Іісус Хрыстос у Ерусаліме. Чудоўнае аздараўленьне спараліжаванага каля авечай купальні. 33
21. Вучэньне Іісуса Хрыста аб субоце . . . 34
22. Абраньне дванаццацёх Апосталаў . . . 36
23. Нагорная пропаведзь . 37
24. Прыповесьць аб сяўцу. 45
25. Уцішэньне буры . . . 46

| §§ | | Стр. |
|---|---|---|
| 26. | Чудоўнае вылячэньне Гадарынскага шалёнага . . . . . . . | 47 |
| 27. | Уваскрашэньне дачкі Яіра. . . . . . . . | 49 |
| 28. | Чудоўнае вылячэньне двох сьляпых. . . . | 50 |
| 29. | Заклік да спрацованых і гаротных. . . | 51 |
| 30. | Іісус Хрыстос пасылае Апосталаў на пропаведзь . . . . . . . | 52 |
| 31. | Сьмерць Іоанна Хрысьціцеля . . . . . . | 53 |
| 32. | Чудоўнае насычэньне Іісусам Хрыстом пяцёх тысячаў людзей. | — |
| 33. | Хаджэньне Іісуса Хрыста па вадзе. . . . | 54 |

**Трэці год служэньня Іісуса Хрыста.**

| §§ | | Стр. |
|---|---|---|
| 34. | Гутарка аб тым, што апаганьвае чалавека. | 56 |
| 35. | Апостал Пётр спаведуе сваю веру ў Іісуса Хрыста, як Сына Божага. Прароцтва Госпада аб Сваіх хрэсных муках . . . . . | — |
| 36. | Услаўленьне І. Хрыста на гары Фавор. . . | 59 |
| 37. | Вучэньне Іісуса Хрыста аб пакорнасьці і дараваньні крыўдаў. | 61 |
| 38. | Аб судзе царкоўным і малітве грамадзкай. . | 62 |
| 39. | Грэшніца перад судом Іісуса Хрыста. . . . | — |
| 40. | Чудоўнае аздараўленьне сьляпога ад нараджэньня. . . . . . | 64 |
| 41. | Прыповесьць аб міласэрным Самараніне. . | 65 |
| 42. | Хрыстос адведвае сям'ю Лазара . . . . | 66 |
| 43. | Прыповесьць аб хцівым гаспадару . . . | 68 |
| 44. | Прыповесць аб знайдзенай авечцы і блудным сыне. . . . . | — |
| 45. | Прыповесьць аб багатым і ўбогім. . . . | 71 |
| 46. | Апошняя падарожа Іісуса Хрыста у Ерусалім. Аздараўленьне 10 пракажаных . . . . | 72 |
| 47. | Прыповесьць аб мытніку і фарысэю . . . | — |
| 48. | Багаславеньне дзяцей. | 74 |
| 49. | Гутарка Іісуса Хрыста з багатым юнаком і вучнямі аб багацьці . | 76 |
| 50. | Аздараўленьне сьляпога. . . . . . . . | 77 |
| 51. | Васкрашэньне Лазара. | — |
| 52. | Змова начальнікаў юдэйскіх. . . . . . | 79 |
| 53. | Прараkаваньне Ііс. Хрыста аб Сваіх хрэсных муках і сьмерці. Адказ Іісуса Хрыста на просьбу Саламіі і яе сыноў Якава і Іоанна. . | 80 |
| 54. | Як мытнік Закхей увераваў у Іісуса Хрыста. | 82 |
| 55. | Вечар у Віфаніі . . . | 83 |

**Апошнія дні Госпада Іісуса Хрыста на зямлі.**

| §§ | | Стр. |
|---|---|---|
| 56. | Урачысты ўваход Госпада у Ерусалім . . | 84 |
| 57. | Пракляцьце Іісусом Хрыстом смакоўніцы. Выгнаньне з храму гандляроў . . . . . | 86 |
| 58. | Прыповесьць аб злых вінаградарах. . . . | 88 |
| 59. | Фарысэі пытаюцца ў Іісуса Хрыста, ці трэба плаціць падаткі цару. . . . . . . . | 89 |

| §§ | | Стр. |
|---|---|---|
| 60. | Якая запаведзь найгалоўнейшая ў законе. | 90 |
| 61. | Ісус Хрыстос у апошні раз выкрывае кніжнікаў і фарысэяў усю няпраўду іх жыцьця і вучэньня | 91 |
| 62. | Ахвяра беднае ўдавы. | 93 |
| 63. | Гутарка Ісуса Хрыста з Апосталамі аб гібелі Ерусаліму і канцы сьвету | — |
| 64. | Прыповесьць аб дзесяцёх дзяўчынах | 96 |
| 65. | Прыповесьць аб талантах | 97 |
| 66. | Вобраз страшнага суда Божага | 99 |
| 67. | Пастанова сынэдрыёну аб арышце Ісуса Хрыста. Здрада Юды. | 100 |
| 68. | Тайная Вячэра. Устанаўленьне Ісусам Хрыстом таінства прычашчэньня | 101 |
| 69. | Разьвітальная прамова Ісуса Хрыста падчас Тайнае Вячэры. Прадказаньне аб адрачэньні Апостала Пятра. | 104 |
| 70. | Апошнія настаўленьні Ісуса Хрыста Апосталам па дарозе ў Гэфсіманію. Першасьвяшчэньніцкая малітва Госпада. | 106 |
| 71. | Маленьне аб чашы ў садзе Гэфсіманскім. | 109 |
| 72. | Арышт Ісуса Хрыста | 111 |
| 73. | Ісус Хрыстос на судзе Сынэдрыёну | 112 |
| 74. | Выраканьне і каяньне Апостала Пятра. | 115 |
| 75. | Каяньне і гібель Юды. | 116 |
| 76. | Першы суд над Ісусам Хрыстом у Понція Пілата і суд Ірада. | 117 |
| 77. | Другі суд Пілата над Хрыстом | 118 |
| 78. | Шэсьце на Галгофу | 122 |
| 79. | Расьпяцьце Ісуса Хрыста | 124 |
| 80. | Сьмерць Ісуса Хрыста. | 127 |
| 81. | Пахаваньне Ісуса Хрыста. | 129 |


## Гісторыя прабываньня Ісуса Хрыста на зямлі ад Уваскрасеньня да Ўзнясеньня Яго на неба.


| | | |
|---|---|---|
| 82. | Уваскрасеньне Госпада нашага Ісуса Хрыста. | 133 |
| 83. | Уваскросшы Хрыстос зьяўляецца двом вучням, таксама Апосталам у дзень ўваскрасеньня. | 136 |
| 84. | Паўторнае зьяўленьне Ісуса Хрыста Апосталам пры Апостале Фаме. | 138 |
| 85. | Зьяўленьне Ісуса Хрыста Апосталам на моры Тывэрыядзкім. Узнаўленьне апостальскае годнасьці Апостала Пятра | 139 |
| 86. | Зьяўленьне Ісуса Хрыста Апосталам і больш як 500 вучням на гары Галілейскай. | 142 |
| 87. | Узьнясеньне Госпада на неба. | 143 |
| 88. | Зыходжаньне Сьвятога Духа на Апосталаў. | 146 |


BIBLIOTEKA NARODOWA
6528/36

Biblioteka Narodowa
Warszawa
30001021814578

BN
BIBLIOTEKA NARODOWA
616664